# Вітаўт Руднік

# чэмпіёны па футболе свету



Серыя «Гісторыя футболу ў асобах»

1930–2006

**Вітаўт Руднік**

# Чэмпіёны свету па футболе 1930–2006

Беласток
2006

Вітаўт Руднік
Чэмпіёны свету па футболе. 1930–2006

Укладальнік і рэдактар Вітаўт Руднік

**Руднік В.**
Чэмпіёны свету па футболе. 1930–2006, — Беласток., 2006. 109 ст.

Даведнік "Чэмпіёны свету па футболе. 1930–2006" утрымлівае статыстычную і пазнавальную інфармацыю пра гульцоў і трэнераў, якія станавіліся чэмпіёнамі свету па футболе.

Кніга адрасавана тым, хто цікавіцца гісторыяй футбола, а таксама ўсім аматарам гэтага віду спорта.

© Вітаўт Руднік, 2006

## Ад аўтара

**Шаноўнае спадарства!**

Упершыню ў Беларусі і ўпершыню па-беларуску ўбачыла свет выданне, цалкам прысвечанае чэмпіёнам свету па футболе. Упершыню ў адным выданні сабрана інфармацыя пра ўсіх гульцоў, якія хоць адну хвіліну згулялі ў пераможных для іх каманд фінальных частках чэмпіянатаў свету, а таксама пра трэнераў каманд-пераможцаў.

У свеце да гэтага часу выйшла мноства кніг, прысвечаных гісторыі футбола і гісторыі чэмпіянатаў свету ў прыватнасці. На жаль, большасць з іх недаступныя для беларускага чытача з-за сваіх высокіх коштаў, іншай мовы, а часцей за ўсё – з-за даўно вычарпаных накладаў: добрыя выданні не залежваюцца на паліцах кнігарняў. Пры падрыхтоўцы гэтай кнігі давялося перагарнуць некалькі дзесяткаў такога кшталту кніг, пераглядзець сотні старонак у Інтэрнэце. Зроблена гэта было дзеля таго, каб зрабіць кнігу максімальна насычанай спраўджанымі фактамі з біяграфіі (дакладныя імёны і прозвішчы, даты нараджэння і смерці) і футбольнай кар'еры (колькасць гульняў і галоў на чэмпіянатах свету, у складзе сваіх нацыянальных зборных і клубаў і г.д.) герояў чэмпіянатаў свету.

Нягледзячы на тое, што кніга ў першую чаргу тычыцца ўнёску таго альбо іншага чалавека ў перамогу сваёй каманды на чэмпіянатах свету, у выданні шмат інфармацыі, прысвечанай іншым фактам жыцця і кар'еры нашых герояў.

На працягу ўсёй працы я намагаўся пазбегнуць «белых плямаў» і неспраўджаных да канца дадзеных – дасягнуць гэтага цалкам, аднак, не атрымалася. У некаторых месцах кнігі ўважлівы чытач заўважыць няпоўныя звесткі, а, магчыма, і недакладнасці, якія з вашай дапамогай паспрабую выправіць у наступных выданнях.

Якія гэта будуць выданні? Ужо зараз пачалася праца над аналагічнай кнігай, прысвечанай уладальнікам Кубка Еўропы і чэмпіёнам Еўропы 1960 – 2004 гг.

У планах таксама кнігі, прысвечаная пераможцам Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў і Лігі чэмпіёнаў, выбітным трэнерам, брамнікам і стральцам сусветнага футбола.

...Ад моманту, калі ў маіх руках з'явіўся першы статыстычны сшытак, дзе дзіцячай рукой фіксаваліся перамогі і няўдачы мінскага «Дынама» пачатку 80-х гг., да выхаду гэтай кнігі прайшло больш як 25 гадоў. Я хачу выказаць шчырую падзяку маім калегам па «футбольнай статыстыцы» Уладзіміру Клімцу і Ўладзіміру Хільмановічу, якія ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. умацавалі мяне ў веры, што ўсё гэта мае сэнс і рана альбо позна прынясе свой плён. Шчырую падзяку выказваю таксама Юр'ю Тарасевічу, які зрабіў вялізную працу па пошуку і апрацоўцы ілюстрацый для гэтага выдання. І, канечне, вялікі дзякуй маёй сям'і, якая часта вымушана была цярпець маё шматгадзіннае корпанне ў газетах, кнігах, а таксама кляцанне па клавіятуры кампутара. Без вашай дапамогі і патрымкі гэтая кніга так і засталася б у маіх марах...

**Вітаўт Руднік**

## Каротка пра аўтара



**Вітаўт Руднік** нарадзіўся ў 1969 г. у г.п. Астравец Гродзенскай вобл. Гісторык па адукацыі. Друкаваўся ў газетах «Прессбол», «Футбол Беларуси», «Пагоня», працаваў спартыўным каментатарам на гарадзенскім тэлебачанні. Быў сябрам «Беларускай Асацыяцыі спартыўнай прэсы». Сябра ГА «Беларуская Асацыяцыя журналістаў».

## Змест


Ад аўтара....3
Каротка пра аўтара....4
Кароткі экскурс у гісторыю чэмпіянатаў....5
Гульцы і трэнеры – чэмпіёны свету 1930–2006....26
Гульцы і трэнеры, алфавітны спіс....93
Гульцы і трэнеры, у арыгінальным напісанні....95
Прызы – Кубкі Жуля Рымэ....97
Цікавыя факты і рэкорды, звязаныя з чэмпіёнамі свету....99
Асноўныя тэрміны і скарачэнні....104
Геаграфічныя назвы....106


**На вокладцы: Супрацьстаянне двух чэмпіёнаў свету – Гарынчы (Бразілія) і Бобі Чарльтана (Англія) у чвэрцьфінальным матчы чэмпіянату свету 1962 г. Праз лічаныя дні Гарынча станецца двойчы чэмпіёнам свету, а Чарльтану давядзецца чакаць свайго трыюмфу яшчэ чатыры гады.**



**На здымку: Жуль Рымэ толькі што прыбыў у Уругвай, каб прысутнічаць на першым чэмпіянаце свету па футболе 1930 г.**

# Кароткі экскурс у гісторыю чэмпіянатаў



Чэмпіянаты свету па футболе можна смела назваць аднымі з найбольш відовішчных з'яваў у найноўшай гісторыі чалавецтва. Задума арганізацыі турніру наймацнейшых футбольных каманд свету з'явілася на пачатку XX ст. На засნавальным кангрэсе Міжнароднай Федэрацыі Футбольных Асацыяцый (FIFA) 21 мая 1904 г. было прынята рашэнне запісаць у статут, што ФІФА валодае «эксклюзіўным правам арганізацыі міжнародных турніраў».

Ужо на наступны год з ініцыятывы галандскага банкіра Карла Антона Вілема Хіршмана і першага прэзідэнта ФІФА француза Рабэра Герэна была зроблена спроба правесці чэмпіянат з удзелам 15 еўрапейскіх краін. Задума, аднак, скончылася правалам – да 31 жніўня 1905 г. (апошні дзень падачы заявак) ахвотных узяць удзел у турніры не знайшлося!

Наступная спроба таксама атрымалася няўдалай – статус чэмпіянату свету мусіў мець футбольны турнір Алімпійскіх гульняў 1916 г. у Берліне. Гэтым разам перашкодзіла Першая сусветная вайна.

Новы штуршок справе арганізацыі першага чэмпіянату далі Алімпійскія гульні 1920 і асабліва 1924 і 1928 гг. (у двух апошніх турнірах упершыню бралі ўдзел каманды з Паўднёвай Амерыкі).

Яшчэ ў 1926 г. па ініцыятыве прэзыдэнта ФІФА Жуля Рымэ была створаная камісія, якой было даручана вывучыць магчымасць арганізацыі Кубка свету. Кансультацыі з зацікаўленымі бакамі доўжыліся два гады. Нарэшце, на кангрэсе ФІФА ў Амстэрдаме 29 мая 1928 г. было прынята рашэнне правесці ў 1930 г. першы розыгрыш Кубка свету па футболе. Вось што пачаткова казала амстэрдамская рэзалюцыя:

*«ФІФА арганізуе розыгрыш Кубка свету кожныя чатыры гады. Турнір адкрыты для зборных каманд усіх федэрацый, якія ўваходзяць у ФІФА, і пачынаецца адборавымі гульнямі, калі колькасць падаўшых заявак перавысіць 30. Пераможца ў якасці ўзнагароды атрымлівае трафей, які з'яўляецца ўласнасцю ФІФА і перадаецца на вечнае захоўванне той краіне, якая здолее выйграць Кубак тры разы (не абавязкова запар)».*

Афіцыйная назва чэмпіянатаў свету змянялася двойчы. Першыя тры турніры называліся «Чэмпіянат свету – Кубак свету». На кангрэсе ФІФА ў 1946 г. ў Люксембурзе турнір было вырашана называць «Чэмпіянат свету – Кубак Жуля Рымэ» – такім чынам было ўвекапомнена імя тагачаснага прэзыдэнта ФІФА, аднаго з галоўных творцаў турніра. На кангрэсе ФІФА ў Афінах у 1971 г. турнір атрымаў сваю сучасную назву «Чэмпіянат свету – Кубак свету ФІФА».

Да чэмпіянату свету 1982 г. да ўдзелу ў фінальнай стадыі турніру дапускаліся 16 ўдзельнікаў. У турнірах 1982, 1986, 1990 і 1994 гг. бралі ўдзел па 24 каманды. З 1998 г. удзел у фінальных частках бяруць 32 каманды.

**На здымку: Жуль Рымэ – адзін з «бацькоў» чэмпіянатаў свету.**



# 1930 Уругвай

### I. 13–30 ліпеня, Уругвай

Рашэнне пра краіну-гаспадыню першага чэмпіянату свету прымалася 18-19 мая 1929 г. на кангрэсе ФІФА ў Барселоне. Заяўкі на правядзенне турніру падалі Італія, Галандыя, Венгрыя, Іспанія, Швецыя і Уругвай. У такой сітуацыі прадстаўнікі Еўропы знялі свае кандыдатуры, аддаўшы належнае краіне, каманда якой двойчы запар – у 1924 і 1928 гг. бліскуча перамагла на Алімпійскіх гульнях. Такім чынам Уругвай атрымаў магчымасць адзначыць 100-годдзе Уругвайскай Рэспублікі правядзеннем першага чэмпіянату свету па футболе.

Удзел у турніры бралі 13 каманд. Усе гульні адбываліся ў сталіцы краіны – Мантэвідэа. У фінальным матчы гаспадары поля з лікам 4-2 перамаглі Аргентыну. Залатыя медалі Уругваю прынеслі 15 гульцоў на чале з 32-х гадовым трэнерам. Цікава, што ўсе гульцы – першыя чэмпіёны свету, прадстаўлялі каманды з аднаго гораду! На жаль, нікому з герояў першага чэмпіянату так і не давялося згуляць у наступных турнірах.

**Зборная каманда Уругвая***

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Хасэ Леандра АНДРАДЭ** | 22.11.1901 | **П** | «Насьяналь» Мантэвідэа | **4 (360)** | |
| **Хуан Пелегрына АНСЭЛЬМА** | 03.08.1904 | **Н** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **2 (380)** | **3** |
| **Энрыке БАЛЬЕСТРЭРА** | 18.01.1905 | **Б** | «Рампла Хуніёрс», Мантэвідэа | **4 (360)** | **–3** |
| **Альвара ГЕСЦІДА** | 17.05.1907 | **П** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **4 (360)** | |
| **Пабла ДАРАДА** | 22.06.1908 | **Н** | «Белья Віста», Мантэвідэа | **3 (270)** | **2** |
| **Віктарыяна Сантас ІРЫЯРТЭ** | 02.11.1902 | **Н** | «Рэсінг Клуб», Мантэвідэа | **4 (360)** | **2** |
| **Эктар КАСТРА** | 29.11.1904 | **Н** | «Насьяналь» Мантэвідэа | **2 (180)** | **2** |
| **Эрнэста МАСКЕРОНІ** | 21.11.1907 | **А** | «Алімпія», Мантэвідэа | **3 (270)** | |
| **Хасэ НАСАСІ** | 24.05.1901 | **А** | «Белья Віста», Мантэвідэа | **4 (360)** | |
| **Педра ПЕТРОНЭ** | 11.05.1905 | **Н** | «Насьяналь» Мантэвідэа | **1 (90)** | |
| **Хасэ Педра СЕА** | 01.09.1900 | **П** | «Насьяналь» Мантэвідэа | **4 (360)** | **5** |
| **Эктар Педра СКАРОНЭ** | 26.11.1898 | **П** | «Насьяналь» Мантэвідэа | **3 (270)** | **1** |
| **Дамінга ТЭХЕРА** | 22.07.1899 | **А** | «Уондэрэрс», Мантэвідэа | **1 (90)** | |
| **Сантас УРДЗІНАРАН** | 30.03.1900 | **А** | «Насьяналь» Мантэвідэа | **1 (90)** | |
| **Ларэнца ФЕРНАНДЭС** | 20.05.1900 | **П** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **4 (360)** | |

Трэнер: **Альберта СУПІЧЫ** (20.11.1898)

---

* Пасля прозвішчаў гульцоў паслядоўна пададзены дата нараджэння, пазіцыя на полі (Б-брамнік, А-абаронца, П-паўабаронца, Н-нападнік), клуб, які гулец прадстаўляў на момант удзелу ў чэмпіянаце, колькасць праведзеных на турніры гульняў і хвілін (у дужках), а таксама забітых галоў (для брамнікаў – прапушчаных галоў).

Запасныя: Хуан Карлас КАЛЬВА (1906 Н «Місьёнэс» Мірамар), Мігель КАПУЧЫНІ (1904 Б «Пеньяроль»), Мігель Анхел МЕЛОНЬЯ (1905 П «Белья Віста»), Кандуэла ПІРЫС (1905 Н «Насьяналь»), Эмілиё РЭКОБА (1904 А «Насьяналь»), Карлас Рыёлфа СЕКА (1905 П «Пеньяроль»), Саіла САЛДАМБІДЭ (1905 Н «Уондэрэрс», Мантэвідэа).




## 1934 Італія

### ІІ. 27 мая – 10 чэрвеня, Італія

Заяўкі на правядзенне другога чэмпіянату свету падалі толькі Італія і Швецыя. Скандынавы, аднак, як і чатыры гады таму, знялі сваю кандыдатуру на карысць сапернікаў. Такім чынам арганізацыя турніра была аддадзеная ў рукі фашысцкага рэжыму Мусаліні. Натуральна, што задача перад камандай Італіі была пастаўленая толькі адна – быць першай! Дзеля гэтага ў каманду былі ўключаныя «арыундзі» – паўднёваамерыканскія гульцы з італьянскімі карэннямі. Большасць з іх не мела права гуляць за Італію на турніры, але чыноўнікі ФІФА заплюшчылі на гэта вочы.

Задача каманды Віторыё Поцца спрашчалася яшчэ і тым, на турнір адмовіліся прыехаць першыя чэмпіёны свету – уругвайцы. Такім чынам паўднёваамерыканцы «адпомсцілі» італьянцам за тое, што тыя ігнаравалі чэмпіянат свету ў іх краіне. Цікава, што гаспадары ў той час не былі яшчэ вызваленыя ад удзелу ў адборавым турніры. З-за гэтага італьянцам давялося пачынаць свой шлях да перамогі ў турніры з гульні супраць грэкаў.

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы італьянцы з лікам 2-1 перамаглі Чэхаславакію.

**Зборная каманда Італіі**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Луіджы АЛЕМАНДЗІ** | 18.11.1903 | **А** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **5 (510)** | |
| **Луіджы БЕРТАЛІНІ** | 13.09.1904 | **П** | «Рома», Рым | **4 (390)** | |
| **Феліčэ Пласіда БАРЭЛЬ** | 05.04.1914 | **Н** | «Ювентус», Турын | **1 (90)** | |
| **Энрыка ГУАІТА** | 15.07.1910 | **Н** | «Рома», Рым | **4 (420)** | **1** |
| **Анфіладжына ГУАРЫСІ** | 26.12.1905 | **Н** | «Рома», Рым | **1 (90)** | |
| **Аціліё ДЭМАРЫЯ** | 19.03.1909 | **Н** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **1 (90)** | |
| **Арманда КАСТЭЛАЦЦЫ** | 07.02.1904 | **П** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **1 (120)** | |
| **Джампьера КОМБІ** | 20.11.1902 | **Б** | «Ювентус», Турын | **5 (510)** | **–3** |
| **Эральда МАНЦЭЛЬЁ** | 05.06.1906 | **А** | «Балонья», Балонья | **4 (420)** | |
| **Джузэпэ МЕАЦЦА** | 23.08.1910 | **Н** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **5 (510)** | **2** |
| **Луіс Фернанда МОНЦІ** | 15.05.1901 | **П** | «Ювентус», Турын | **5 (510)** | |
| **Раймунда ОРСІ Бібіяна** | 02.12.1901 | **Н** | «Ювентус», Турын | **5 (510)** | **3** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Марыё ПІЦЫЁЛА** | 08.12.1909 | **П** | «Фіярэнціна», Фларэнцыя | **2 (210)** | |
| **Вірджыніё РАСЭТА** | 25.02.1902 | **А** | «Ювентус», Турын | **1 (90)** | |
| **Анджэла СКЬЯВІЁ** | 15.10.1905 | **Н** | «Балонья», Балонья | **4 (420)** | **4** |
| **Джавані ФЕРАРЫ** | 06.12.1907 | **П** | «Ювентус», Турын | **4 (420)** | **2** |
| **Аціліё ФЕРАРЫС** | 26.03.1904 | **П** | «Рома», Рым | **3 (300)** | |

Трэнер: **Віторыё ПОЦЦА** (12.03.1886)

Запасныя: Пьетра АРКАРЫ (03.12.1908 Н, «Мілан»), Марыё ВАРГЛІЕН (26.12.1905 А, «Ювентус», Турын), Джузэпэ КАВАНА (18.11.1905 Б, «Напалі»), Умберта КАЛІГАРЫС (26.07.1900, А «Ювентус», Турын), Гвіда МАСЭЦІ (22.11.1907–27.11.1993 Б, «Рома»).



# 1938 Італія

**III. 4–19 чэрвеня, Францыя**

Права на правядзенне трэцяга па ліку чэмпіянату свету атрымала Францыя, якой берлінскі кангрэс ФІФА 1936 г. аддаў перавагу перад Аргентынай і Германіяй. Рашэнне моцна пакрыўдзіла заўзятараў футбола ў Аргентыне: футбольныя дзеячы гэтай краіны справядліва, але марна, апелявалі да дакументаў ФІФА, у якіх было запісана, што чэмпіянаты свету па чарзе праводзяцца ў Еўропе і Паўднёвай Амерыцы. У выніку вельмі моцная на той час аргентынская каманда адмовілася ад удзелу ў турніры. Кампанію ёй склалі і уругвайцы. Яшчэ адной стратай стала адсутнасць аўстрыйцаў: перад самым чэмпіянатам у выніку «аншлюсу» Аўстрыя знікла з палітычнай мапы свету.

Упершыню ад удзелу ў адборавым турніры былі звольненыя пераможцы папярэдняга чэмпіянату.

Турнір назваў імёны першых двухразовых чэмпіёнаў свету – імі сталі італьянцы Ферары, Меацца, Манцэльё. Да іх ліку ўмоўна можна залічыць Серантоні і брамніка Карла Чэрэсолі, якія бралі ўдзел у адборавым матчы да пераможнага для Італіі папярэдняга чэмпіяната. У адрозненні ад Серантоні, які гэтым разам згуляў у фінальнай частцы турніра, Чэрэсолі зноў быў толькі дублёрам – гэтым разам Альда Аліўеры. Тое ж тычыцца і другога брамніка – Гвіда Масэці. Як і ў 1934 г., творцам перамогі італьянцаў быў Віторыё Поцца.

Удзел у чэмпіянаце бралі 15 каманд. У фінальным матчы італьянцы з лікам 4-2 перамаглі венграў.

**Зборная каманда Італіі**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Альда АЛІЎЕРЫ** | 02.10.1910 | **Б** | «Лукезэ Лібертас», Лука | **4 (390)** | **-5** |
| **Мігель Анхел АНДРЭОЛА** | 06.09.1912 | **П** | «Балонья», Балонья | **4 (390)** | |
| **Амедэа БЬЯВАЦІ** | 04.04.1915 | **Н** | «Балонья», Балонья | **3 (270)** | |
| **Луіджы КАЛАУСІ** | 04.03.1914 | **Н** | «Трыесціна», Трыест | **3 (270)** | **4** |
| **Уга ЛАКАТЭЛІ** | 05.02.1916 | **П** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **4 (390)** | |
| **Эральда МАНЦЭЛЬЁ** | 05.06.1906 | **А** | «Рома», Рым | **1 (120)** | |
| **Джузэпэ МЕАЦЦА** | 23.08.1910 | **Н** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **4 (390)** | **1** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Пьетра ПАСІНАЦІ** | 21.07.1910 | **Н** | «Трыесціна», Трыест | **1 (120)** | |
| **Сільвіё ПІЁЛА** | 29.09.1913 | **Н** | «Лацыё», Рым | **4 (390)** | **5** |
| **Пьетра РАВА** | 20.01.1916 | **А** | «Ювентус», Турын | **4 (390)** | |
| **Пьетра СЕРАНТОНІ** | 11.12.1906 | **П** | «Рома», Мілан | **4 (390)** | |
| **Джавані ФЕРАРЫ** | 06.12.1907 | **П** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **4 (390)** | |
| **Пьетра ФЕРАРЫС** | 15.02.1912 | **Н** | «Інтэр-Амбразіяна», Мілан | **1 (120)** | **1** |
| **Альфрэда ФОНІ** | 20.01.1911 | **А** | «Ювентус», Турын | **3 (270)** | |

Трэнер: **Віторыё ПОЦЦА** (12.03.1886)

Запасныя: Серджыё БЕРТОНІ (23.09.1915 Н, «Джэнаа»), Альда ДАНАЦІ (29.09.1910 П, «Рома»), Марыё Джэнта (01.03.1912 П, «Джэнаа»), Гвіда МАСЭЦІ (22.11.1907 Б, «Рома»), Рэната ОЛМІ (12.07.1914 П, «Інтэр-Амбразіяна»), Марыё ПЕРАЦЦОЛА (07.06.1911 П, «Джэнаа»), Бруна КЬЯССА (19.04.1916 Н, «Трыесціна»), Карла ЧЭРЭСОЛІ (14.06.1910 Б, «Балонья»).




## 1950 Уругвай

### IV. 24 чэрвеня – 16 ліпеня, Бразілія

Другая сусветная вайна на 12 гадоў адклала правядзенне чацвёртага чэмпіянату свету. Права на арганізацыю турніра атрымала Бразілія. Адмыслова да чэмпіяната ў Рыё-дэ-Жанэйра (тагачаснай сталіцы краіны) быў пабудаваны 200-тысячны стадыён «Маракана».

Фаварытамі турніра лічыліся гаспадары. Перад фінальным матчам многія бразільскія газеты выйшлі з фотаздымкам зборнай каманды Бразіліі і подпісам да здымка «Гэта – чэмпіёны свету!» (капітан уругвайцаў Варэла перад гульнёй паклеіў некаторыя з гэтых газет у прыбіральні гатэлю, дзе спынілася яго каманда). Урад краіны абвясціў пра некалькі дадатковых выходных дзён, якія чакаюць краіну пасля перамогі, але лёс вызначыў усё паіншаму... Перамогу, як і ў 1930 г., адсвяткавалі ўругвайцы. І зноў усе гульцы гэтай каманды прадстаўлялі клубы з аднаго Мантэвідэа – ніколі ў гісторыі такое больш не паўторыцца!

Удзел у чэмпіянаце бралі 13 каманд. У фінальным матчы Уругвай адолеў Бразілію з лікам 2-1.

**Зборная каманда Уругвая**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Віктар Пабла Карлас Радрыгес АНДРАДЭ** | 14.02.1927 | **П** | «Сэнтрал Эспаньёл», Мантэвідэа | **4 (360)** | |
| **Эрнэста Хасэ ВІДАЛЬ** | 15.11.1921 | **Н** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **3 (270)** | **1** |
| **Абдулiё Хасінта Муіньёс ВАРЭЛА** | 20.09.1917 | **А** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **4 (360)** | **1** |
| **Шуберт ГАМБЕТА** | 14.04.1920 | **П** | «Насьяналь», Мантэвідэа | **2 (180)** | |
| **Маціяс ГАНСАЛЕС** | 06.08.1925 | **А** | «Серра», Мантэвідэа | **4 (360)** | |
| **Хуан Карлас ГАНСАЛЕС** | 22.08.1924 | **А** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **2 (180)** | |
| **Ракэ Гастон МАСПАЛІ** | 12.10.1917 | **Б** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **3 (270)** | **–3** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Оскар Амар МІГЕС** | 05.12.1927 | **Н** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **4 (360)** | **4** |
| **Рубен МОРАН** | 06.08.1930 | **Н** | «Серра», Мантэвідэа | **1 (90)** | |
| **Анібал Луіс ПАС** | 18.02.1918 | **Б** | «Насьяналь», Мантэвідэа | **1 (90)** | **–2** |
| **Хулiё Гервасіё ПЕРЭС** | 19.06.1926 | **Н** | «Насьяналь», Мантэвідэа | **4 (360)** | **1** |
| **Хуан Альберта СКЬЯФІНА** | 28.07.1925 | **П** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **4 (360)** | **3** |
| **Эусэбіё Рамон ТЭХЕРА** | 20.09.1922 | **А** | «Насьяналь», Мантэвідэа | **4 (360)** | |
| **Альчыдэ Эдгарда ГІГЬЯ** | 22.12.1926 | **Н** | «Пеньяроль», Мантэвідэа | **4 (360)** | **4** |

Трэнер: **Хуан Лопес** (15.03.1908)

Запасныя: Вашынгтон АРТУНЬЁ («Пеньяроль»), Хулiё БРЫТАС («Пеньяроль»), Хуан БУРГЕНЬЁ («Данубіё»), Эктар ВІЛЬЧЭС («Серра»), Уільям Пабла МАРЦІНЭС (13.01.1928 А «Рампла Хуніёрс»), Радольфа ПІНІ («Насьяналь»), Карлас РАМЭРА («Данубіё»), Луіс РЫХА («Сэнтрал»).



# 1954 ФРГ

### V. 16 чэрвеня – 4 ліпеня, Швайцарыя

Чэмпіянат свету 1954 г. Швайцарыя атрымала яшчэ ў 1946 г., калі на кангрэсе ФІФА ў Люксембурзе вызначаліся гаспадары чацвёртага па ліку спаборніцтва наймацнейшых каманд свету. Гэта быў турнір, дзе многае было ўпершыню: упершыню чэмпіянат сабраў сапраўды наймацнейшыя каманды свету, упершыню гульні чэмпіяната трансляваліся па тэлебачанні, упершыню гульцы кожнай каманды былі «пранумараваныя» – атрымалі сталыя нумары на ўвесь час турніру (у спісах пераможцаў гэтага і наступных турніраў нумар пазначаны перад прозвішчам гульца), упершыню пераможцамі чэмпіянату свету сталі браты – Фрыц і Отмар Вальтэры з зборнай каманды ФРГ.

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы каманда ФРГ нанесла паразу Венгрыі з лікам 3-2.

**Зборная каманда ФРГ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | **Ханс БАУЭР** | 28.07.1927 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **2 (180)** | |
| 16 | **Фрыдрых (Фрыц) ВАЛЬТЭР** | 31.10.1920 | **Н** | «Кайзэрслаутэрн» | **6 (540)** | **3** |
| 15 | **Отмар ВАЛЬТЭР** | 06.03.1924 | **Н** | «Кайзэрслаутэрн» | **5 (450)** | **4** |
| 22 | **Хайнрых КВЯТКОЎСКІ** | 16.07.1926 | **Б** | «Барусія», Дортмунд | **1 (90)** | **-8** |
| 14 | **Бернхард КЛОДТ** | 26.10.1926 | **Н** | «Шальке-04», Гельзенкірхен | **2 (180)** | **1** |
| 3 | **Вернэр КОЛЬМЭЙЕР** | 19.04.1924 | **А** | «Кайзэрслаутэрн» | **5 (450)** | |
| 2 | **Фрыдрых ЛАБАНД** | 01.11.1925 | **А** | «Гамбург» | **3 (270)** | |
| 10 | **Вернэр ЛІБРЫХ** | 18.01.1927 | **А** | «Кайзэрслаутэрн» | **4 (360)** | |
| 8 | **Карл МАЙ** | 27.07.1928 | **П** | «Фюрт» | **5 (450)** | |
| 6 | **Пауль МЕБУС** | 09.06.1920 | **П** | «Кёльн» | **1 (90)** | |
| 13 | **Максіміліян МОРЛАК** | 11.05.1926 | **Н** | «Нюрнберг» | **5 (450)** | **6** |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 19 | **Альфрэд ПФАФ** | 16.07.1926 | **П** | «Айнтрахт», Франкфурт | **1 (90)** | **1** |
| 7 | **Ёзэф ПОЗІПАЛЬ** | 20.06.1927 | **А** | «Гамбург» | **5 (450)** | |
| 12 | **Хельмут РАН** | 16.08.1929 | **Н** | «Рот-Вайс», Эсэн | **4 (360)** | **4** |
| 17 | **Рыхард Франц ХЕРМАН** | 28.01.1923 | **Н** | «Франкфурт» | **1 (90)** | **1** |
| 20 | **Ханс ШЭФЕР** | 19.10.1927 | **Н** | «Кёльн» | **5 (450)** | **4** |
| 1 | **Антон ТУРЭК** | 18.01.1919 | **Б** | «Фартуна», Дзюсельдорф | **5 (450)** | **-6** |
| 6 | **Хорст ЭКЕЛЬ** | 08.02.1932 | **П** | «Кайзэрслаутэрн» | **6 (540)** | |

Трэнер: **Ёзэф ХЕРБЕРГЕР** (28.03.1897)

Запасныя: 18 Ульрых БІЗІНГЕР (06.08.1933 Н, «Аугсбург»), 21 Хайнц КУБШ (20.07.1930-24.10.1993 Б, «Пірмасэнс»), 11 Карл-Хайнц МЕТЦНЕР (09.01.1923-25.10.1994 Н, «Хессэн», Касэль), 5 Херберт ЭРХАРДТ (06.07.1930 А «Фюрт»).




## 1958 Бразілія

### VI. 8-29 чэрвеня, Швецыя

Нарэшце права на правядзенне чэмпіянату свету атрымала Швецыя. І на гэтым турніры гаспадары чэмпіяната разлічвалі на медалі найвышэйшай пробы. Перамога скандынаваў на Алімпійскіх гульнях 1948 г., трэцяе месца на чэмпіянаце свету 1950 г., наяўнасць у складзе каманды такіх зорак як Лідхольм, Хамрын, Сімансан, Грэн – усё гэта яскрава сведчыла пра магутны патэнцыял шведскай дружыны. І быць бы ёй напэўна, чэмпіёнам свету, калі б не пачатак эры Пеле і яго калегаў па вялікай зборнай камандзе Бразіліі ўзору 1958-1962 гг...

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы каманда Бразіліі перамагла гаспадароў з лікам 5-2.

**Зборная каманда Бразіліі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 15 | **АРЛАНДА Пеканья дэ Карвальё** | 20.09.1935 | **А** | «Васка да Гама», Р-д-Ж | **6 (540)** | |
| 2 | **Хідэральда Луіс БЕЛІНІ** | 07.06.1930 | **А** | «Васка да Гама» Р-д-Ж | **6 (540)** | |
| 20 | **ВАВА** | 12.11.1934 | **Н** | «Васка да Гама» Р-д-Ж | **4 (360)** | **5** |
| 11 | **ГАРЫНЧА** | 28.10.1933 | **Н** | «Батафога» Р-д-Ж | **4 (360)** | |
| 4 | **ДЖАЛМА дос САНТАС** | 27.02.1929 | **А** | «Партугеза», Сан Паула | **1 (90)** | |
| 21 | **ДЗІДА** | 16.03.1934 | **Н** | «Фламенга» Р-д-Ж | **1 (90)** | |
| 6 | **ДЗІДЗІ – Валдзір Перэйра** | 08.10.1928 | **П** | «Батафога» Р-д-Ж | **6 (540)** | **1** |
| 5 | **ДЗІНА Сані** | 23.05.1932 | **П** | «Сан Паула» | **2 (180)** | |
| 14 | **Нілтан ДЭ СОРДЗІ** | 14.02.1931 | **А** | «Сан Паула» | **5 (450)** | |
| 17 | **ЖАЭЛ Антоніё Марцінс** | 23.11.1931 | **Н** | «Фламенга», Р-д-Ж | **2 (180)** | |
| 3 | **ЖЫЛМАР дос Сантас Нэвес** | 22.08.1930 | **Б** | «Карынціянс», Сан Паула | **6 (540)** | **–4** |
| 7 | **Марыё Жоржэ Лоба** | 09.08.1931 | **Н** | «Фламенга», Р-д-Ж | **6 (540)** | **1** |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **ЗАГАЛА** | | | | | |
| 19 | **ЗІТА** | 08.08.1932 | **П** | «Сантас», Сан Паула | **4 (360)** | |
| 18 | **МАЦЦОЛА – Жазэ Жааа Альтафіні** | 24.07.1938 | **Н** | «Палмейрас», Сан Паула | **3 (270)** | **2** |
| 12 | **НІЛТАН Рэйс дос САНТАС** | 16.05.1925 | **А** | «Батафога», Р-д-Ж | **6 (540)** | **1** |
| 10 | **ПЕЛЕ** | 23.10.1940 | **Н** | «Сантас», Сан Паула | **4 (360)** | **6** |

Трэнеры: **Вісэнтэ Італа ФЕОЛА** (01.11.1909), **Асвальда Аагуста БРАНДАА** (19.09.1916).*

Запасныя: 8 АРЭКА – Вальдэмар Радрыгес Марцінс, 9 ЗАЗІМА Алвес Каласанс (19.06.1932 П, «Бангу», Р-д-Ж), 1 Карлас Жазэ дэ КАСЦІЛЬЁ (27.11.1927 Б, «Флумінэнсэ»), 13 МААСІР Клаўдзіна Пінта, 16 МАУРА Рамас дэ Алівейра (30.08.1930-18.09.2002 А, «Сан Паула»), 22 ПЕПЕ – Жазэ Масія (25.02.1935 Н, «Сантас»).




## 1962 Бразілія

**VII. 30 мая – 17 чэрвеня, Чылі**

На правядзенне чарговага фэсту наймацнейшых каманд свету прэтэндавалі Германія, Іспанія, Аргентына і Чылі. Пасля таго, як ФІФА адназначна заявіла, што чэмпіянат пройдзе не ў Еўропе, выбар давялося рабіць паміж паўднёваамерыканскімі краінамі. Здавалася, што перамогуць аргентынцы, але яны атрымалі на кангрэсе ФІФА ў Лісабоне толькі 10 галасоў супраць 32 на карысць значна бяднейшай на футбольныя традыцыі Чылі, якая здолела пераканаць чыноўнікаў ФІФА ў сваёй здольнасці правесці турнір на высокім узроўні.

Другі раз запар перамогу на турніры святкавалі бразільцы. Цікава, што калі б не траўма Пеле, якога замяніў па ходу чэмпіянату Амарылда, перамогу Бразіліі прынеслі б усяго 11 гульцоў! Але і тое, што ў камандзе чэмпіёнаў на поле выходзілі толькі 12 футбалістаў, бадай што, не будзе ніколі пераўзыйдзена.

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы каманда Бразіліі перамагла Чэхаславакію з лікам 3-1.

**Зборная каманда Бразіліі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 20 | **АМАРЫЛДА Таварэс да Сільвейра** | 29.07.1939 | **Н** | «Батафога», Р-д-Ж | **4 (360)** | **3** |
| 19 | **ВАВА** | 12.11.1934 | **Н** | «Палмейрас», Сан Паула | **6 (540)** | **4** |
| 7 | **ГАРЫНЧА** | 28.10.1933 | **Н** | «Батафога», Р-д-Ж | **6 (532)** | **4** |
| 2 | **ДЖАЛМА дос САНТАС** | 27.02.1929 | **А** | «Палмейрас», Сан Паула | **6 (540)** | |
| 8 | **ДЗІДЗІ** | 08.10.1928 | **П** | «Батафога», Р-д-Ж | **6 (540)** | |
| 1 | **ЖЫЛЬМАР дос Сантас** | 22.08.1930 | **Б** | «Сантас», Сан Паула | **6 (540)** | **–5** |

* БРАНДАА кіраваў камандай у час адборавага турніру да ЧС 1958. Перад самым фінальным турнірам быў заменены на ФЕОЛУ, якому і дасталася ўся слава.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Нэвес** | | | | | |
| 21 | **Марыё Жоржэ Лоба ЗАГАЛА** | 09.08.1931 | **Н** | «Батафога», Р-д-Ж | **6 (540)** | **1** |
| 5 | **ЗАЗІМА Алвес Каласанс** | 19.06.1932 | **П** | «Бангу», Р-д-Ж | **6 (540)** | |
| 4 | **ЗІТА** | 08.08.1932 | **П** | «Сантас», Сан Паула | **6 (540)** | **1** |
| 3 | **МАУРА Рамас дэ Алівейра** | 30.08.1930 | **А** | «Сантас», Сан Паула | **6 (540)** | |
| 6 | **НІЛТАН Рэйс дос САНТАС** | 16.05.1925 | **А** | «Батафога», Р-д-Ж | **6 (540)** | |
| 10 | **ПЕЛЕ** | 23.10.1940 | **Н** | «Сантас», Сан Паула | **2 (180)** | **1** |

Трэнер: **Айморэ МАРЭЙРА** (24.04.1912)

Запасныя: 15 АЛЬТАІР Гомес дэ Фігейрэда (22.01.1938 А, «Флумінэнсэ»), 13 Хідэральда Луіс БЕЛІНІ (07.06.1930 А, «Васка да Гама»), 12 ЖАІР МАРЫНЬЁ дэ Алівейра (17.07.1936 А, «Флумінэнсэ»), 18 ЖАІР да Коста (09.07.1940 Н, «Партугеза»), 14 ЖУРАНДЗІР дэ Флейтас (12.11.1940-06.03.1996 А, «Сан Паула»), 16 ЗЭКІНЬЯ – Жазэ Ферэйра Франка (18.11.1936 П, «Палмейрас»), 22 Карлас Жазэ дэ КАСЦІЛЬЁ (27.11.1927 Б, «Флумінэнсэ»), 9 КАУЦІНЬЁ – Антоніё Вільсан Анорыё (11.06.1943 Н, «Сантас»), 17 МЕНГАЛЬВІЁ Педра Фігейра (17.10.1939 П, «Сантас»), 11 ПЕПЕ – Жазэ Масія (25.02.1935 Н,«Сантас»).




## 1966 Англія

### VIII. 11–30 ліпеня, Англія

Чарговы чэмпіянат праводзіўся ў краіне, якая падарыла свету футбол і якая доўгі час ігнаравала чэмпіянаты свету, амбітна лічачы, што ў свеце футбалістаў, роўных брытанцам – няма.

Дэбют каманды Англіі на чэмпіянатах свету адбыўся толькі ў 1950 г. і не прынёс камандзе славы. Такімі ж няўдалымі былі і старты ў чэмпіянатах 1954, 1958 і 1962 гг. Таму стаўка была зроблена на турнір 1966 г., правядзенне якога амаль супадала са святкаваннем 100-годдзя Англійскай Футбольнай Асацыяцыі. З нагоды такога юбілею ФІФА не магла не пайсці насустрач просьбе Англіі даверыць правядзенне чарговага чэмпіянату свету ей.

Трэці раз у гісторыі перамогу ў турніры святкавалі гаспадары поля. Для брытанскіх заўзятараў футбола гэта стала яшчэ адной нагодай пацешыць свае амбіцыі. На жаль, падцвердзіць сваё высокае месца ў рэйцінгу наймацнейшых каманд свету Англіі давядзецца яшчэ толькі раз – у 1990 г. каманда саступіць у паўфінале па пенальці будучым чэмпіёнам свету – немцам. Роберт і Джон Чарльтаны сталі другой пасля Вальтэраў парай братоў – пераможцаў чэмпіянату свету.

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы каманда Англіі ў дадатковы час (асноўны час 2-2) перамагла ФРГ з лікам 4-2.

**Зборная каманда Англіі**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | **Алан Джэймс БОЛ** | 12.05.1945 | **П** «Блэкпул» | **4 (390)** | |
| 1 | **Гордан БЭНКС** | 30.12.1937 | **Б** «Лэйчэстэр Сіці» | **6 (570)** | **–3** |
| 8 | **Джэймс Пітэр ГРЫЎЗ** | 20.02.1940 | **Н** «Тотэнхэм Хотспур» | **3 (270)** | |
| 11 | **Джон Майкл КОННЭЛІ** | 18.07.1938 | **Н** «Манчэстэр Юнайтэд» | **1 (90)** | |
| 2 | **Джордж Рэджынальд КОЭН** | 22.10.1939 | **А** «Фулхэм», Лондан | **6 (570)** | |
| 20 | **Ян Роберт КЭЛЭГЭН** | 10.04.1942 | **П** «Ліверпуль» | **1 (90)** | |
| 6 | **Роберт МУР** | 12.04.1941 | **А** «Вэст Хэм Юнайтэд» | **6 (570)** | |
| 16 | **Марцін Стэнфард ПІТЭРС** | 08.11.1943 | **П** «Вэст Хэм Юнайтэд» | **5 (480)** | **1** |
| 19 | **Тэрэнс ПЭЙН** | 23.03.1939 | **Н** «Саутгемптан» | **1 (90)** | |
| 4 | **Норберт Пітэр СТАЙЛЗ** | 18.05.1942 | **А** «Манчэстэр Юнайтэд» | **6 (570)** | |
| 3 | **Рэйман УІЛСАН** | 17.12.1934 | **А** «Эвертан», Ліверпуль | **6 (570)** | |
| 21 | **Роджэр ХАНТ** | 20.07.1938 | **Н** «Ліверпуль» | **6 (570)** | **3** |
| 10 | **Джэфры Чарльз ХЭРСТ** | 08.12.1941 | **Н** «Вэст Хэм Юнайтэд» | **3 (300)** | **4** |
| 5 | **Джон ЧАРЛЬТАН** | 08.05.1935 | **А** «Лідс Юнайтэд» | **6 (570)** | |
| 9 | **Роберт ЧАРЛЬТАН** | 11.10.1937 | **П** «Манчэстэр Юнайтэд» | **6 (570)** | **3** |

Трэнер: **Альфрэд Эрнст РАМСЭЙ** (22.01.1920)

Запасныя: 14 Джэймс Крыстофер АРМФІЛД (21.09.1935 А, «Блэкпул»), 13 Філіп Пітэр БАНЭЦІ (30.09.1944 Б, «Чэлсі»), 15 Джэральд БІРН (29.08.1938 А, «Ліверпуль»), 22 Джордж Эдвард ІСТХЭМ (23.09.1938 Н, «Арсенал»), 12 Рональд Дэрык Джордж СПРАЙНДЖЭТ (22.07.1935 Б, «Шэфілд Уэнсдэй»), 17 Рональд ФЛАУЭРС (28.07.1934 А, «Вулверхэмптан»), 18 Норман ХАНТЭР (29.10.1943 А, «Лідс Юнайтэд»).




# 1970 Бразілія

### IX. 31 мая – 21 чэрвеня, Мексіка

Права на правядзенне дзевятага чэмпіянату атрымала Мексіка, якой удалося апярэдзіць усё тую ж гаротную Аргентыну. Двумя гадамі раней мексіканцы справіліся з арганізацыяй на сваёй радзіме Алімпійскіх гульняў і гэта стала моцным аргументам на іх карысць.

З Мексікі «Залаты кубак» – галоўны трафей турніру, «навечна» пераехаў у Бразілію, якая ў трэці раз стала пераможцай турніра. Двукоссі ў дачыненні да слова «навечна» ужытыя не выпадкова – у 1983 г. «Залаты кубак» будзе выкрадзены з штаб-кватэры Бразільскай канфедэрацыі футбола і пераплаўлены ў злітак.

Турнір назваў таксама і імя першага трохразовага чэмпіёна свету – славуты Пеле ўздымаў над сваёй галавой Кубак свету ў 1958, 1962 і 1970 гг.! Тройчы спрычыніўся да перамогаў і Загала – у 1958 і 1962 гг. як футбаліст, а зараз – як галоўны трэнер каманды (перад самым чэмпіянатам ён замяніў на пасадзе галоўнага тр. Жааа Салданью).

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы каманда Бразіліі перамагла Італію з лікам 4-1.

**Зборная каманда Бразіліі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | **Эркулес дэ БРЫТА Руас** | 09.08.1939 | **А** | «Фламенга», Р-д-Ж | **6 (540)** | |
| 7 | **ЖАІРЗІНЬЁ** | 25.12.1944 | **Н** | «Батафога», Р-д-Ж | **6 (529)** | **7** |
| 8 | **ЖЭРСОН дэ Алівейра НУНЬЕС** | 11.01.1941 | **П** | «Сан Паула» | **4 (319)** | **1** |
| 4 | **КАРЛАС АЛЬБЕРТА Торэс** | 17.07.1944 | **А** | «Сантас», Сан Паула | **6 (540)** | **1** |
| 5 | **КЛАДААЛЬДА Таварэс дэ Сантана** | 25.09.1949 | **А** | «Сантас», Сан Паула | **6 (523)** | **1** |
| 18 | **Паула Сезар ЛІМА** | 16.06.1949 | **П** | «Батафога», Р-д-Ж | **4 (221)** | |
| 6 | **МАРКА АНТОНІЁ Фелісіяна** | 06.02.1951 | **А** | «Флумінэнсэ», Р-д-Ж | **2 (125)** | |
| 10 | **ПЕЛЕ** | 23.10.1940 | **Н** | «Сантас», Сан Паула | **6 (540)** | **4** |
| 3 | **Вілсан да Сільва ПІАЦЦА** | 25.02.1943 | **А** | «Крузэйра», Белу-Арызонці | **6 (537)** | |
| 13 | **РАБЕРТА Лопес Міранда** | 31.04.1943 | **Н** | «Батафога», Р-д-Ж | **2 (34)** | |
| 11 | **Раберта РЫВЕЛІНА** | 01.01.1946 | **Н** | «Карынціянс», Сан Паула | **5 (450)** | **3** |
| 9 | **ТАСТАА** | 25.01.1947 | **Н** | «Крузэйра», Белу-Арызонці | **6 (517)** | **2** |
| 15 | **Жазэ дэ Анчэта ФАНТАНА** | 31.12.1940 | **А** | «Крузэйра», Белу-Арызонці | **2 (93)** | |
| 1 | **ФЕЛІКС Міелі Венеральда** | 24.12.1937 | **Б** | «Флумінэнсэ», Р-д-Ж | **6 (540)** | **-7** |
| 16 | **ЭВЕРАЛЬДА Маркес да Сільва** | 11.09.1944 | **А** | «Грэміё», Порту-Алегры | **5 (415)** | |
| 19 | **ЭДУ** | 06.08.1949 | **А** | «Сантас», Сан Паула | **1 (17)** | |

Трэнеры: **Марыё Жоржэ Лоба ЗАГАЛА** (09.08.1931), **Жааа САЛДАНЬЯ** (11.03.1914).*

Запасныя: 12 АДО – Эдуарда Раберта Сцінген (31.03.1945 Б, «Карынціянс»), 14 Жазэ Гільермэ БАЛЬДОЧЫ (14.03.1946 А, «Палмейрас»), 20 ДАРЫЁ Жазэ дос Сантас (04.03.1946 Н, «Атлетыка-Мінэйра»), 17 ЖАЭЛЬ Камарга (18.09.1946 А, «Сантас»), 21 ЗЭ МАРЫЯ – Жазэ Марыя Радрыгес Алвес (18.05.1949 П, «Партугеза»), 22 Эмерсан ЛЕАА (11.07.1949 Б, «Палмейрас»; бронзавы прызёр ЧС 1978, удзельнік ЧС 1974, запасны на ЧС 1986).

* САЛДАНЬЯ кіраваў зб. Бразіліі ў час адборавага турніра.




# 1974 ФРГ

**X. 13 чэрвеня – 7 ліпеня, ФРГ**

Турнір наймацнейшых каманд свету на нямецкай зямлі мусіў адбыцца яшчэ ў 1942 г. Тады, аднак, усе планы паламала віхура Другой сусветнай вайны. Атрыманне права на правядзенне дзесятага чэмпіяната давала немцам шанс паўтарыць поспех дваццацігадовай даўніны. Адразу зазначым, што задача з поспехам была выканана. Ды і ці магла выступіць горш каманда, якая два гады таму перамагла ў чэмпіянаце Еўропы, каманда, у складзе якой гулялі такія зоркі, як Франц Бэкенбаўэр, Пауль Брайтнер, Гюнтэр Нэтцэр, Герд Мюлер, Ёзаф Маер? Канкурэнцыю немцам маглі скласці блікуча адгуляўшыя турнір галандцы, але і яны вымушаны былі саступіць у фінале наймацнейшай дружыне 1974 г.

Франц Бэкенбаўэр праз 16 гадоў другі раз уздыме над галавой Кубак свету – ужо ў якасці галоўнага трэнера нямецкай каманды. Гэтае дасягненне не ўдасца паўтарыць Хансу-Хуберту Фогтсу, які будзе кіраваць зборнай камандай Германіі на чэмпіянатах 1994 і 1998 гг.

Удзел у чэмпіянаце бралі 16 каманд. У фінальным матчы каманда ФРГ перамагла Галандыю з лікам 2-1.

**Зборная каманда ФРГ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 16 | **Райнэр БОНХАФ** | 29.03.1952 | **П** | «Барусія», Мёнхенгладбах | **4 (360)** | **1** |
| 3 | **Пауль БРАЙТНЕР** | 05.09.1951 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (630)** | **3** |
| 5 | **Франц БЭКЕНБАУЭР** | 11.09.1945 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (630)** | |
| 7 | **Херберт ВІММЕР** | 09.11.1944 | **П** | «Барусія», Мёнхенгладбах | **2 (96)** | |
| 9 | **Юрген ГРАБОЎСКІ** | 07.07.1944 | **Н** | «Айнтрахт», Франфурт | **6 (475)** | **1** |
| 8 | **Бернхард КУЛЬМАН** | 01.11.1949 | **А** | «Кёльн» | **3 (247)** | **1** |
| 1 | **Ёзаф Дзітэр МАЕР** | 28.02.1944 | **Б** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (630)** | **–4** |
| 13 | **Герхард МЮЛЕР** | 11.11.1945 | **Н** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (630)** | **4** |
| 10 | **Гюнтэр Тэадор НЭТЦЭР** | 14.09.1944 | **П** | «Рэал», Мадрыд, Ісп. | **1 (21)** | |
| 12 | **Вольфганг ОВЕРАТ** | 29.09.1943 | **П** | «Кёльн» | **7 (594)** | **2** |
| 15 | **Хайнц ФЛОЭ** | 28.01.1948 | **П** | «Кёльн» | **3 (110)** | |
| 2 | **Ханс-Хуберт ФОГТС** | 30.12.1946 | **А** | «Барусія», Мёнхенгладбах | **7 (630)** | |
| 18 | **Дзітэр ХЕРЦАГ** | 15.07.1946 | **П** | «Фартуна», Дзюсельдорф | **2 (155)** | |
| 17 | **Бернд ХЁЛЬЦЭНБАЙН** | 09.03.1946 | **П** | «Айнтрахт», Франкфурт | **6 (400)** | |
| 14 | **Ульрых ХЁНЭС** | 05.01.1952 | **Н** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (557)** | **1** |
| 6 | **Хорст-Дзітэр ХЁТГЕС** | 10.09.1943 | **А** | «Вердэр», Брэмен | **1 (22)** | |
| 11 | **Ёзэф ХЭЙНКЕС** | 09.05.1945 | **Н** | «Барусія», Мёнхенгладбах | **2 (135)** | |
| 4 | **Ханс-Георг ШВАРЦЭНБЕК** | 03.04.1948 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (608)** | |

Трэнер: **Хельмут ШОН** (15.09.1915)
Запасныя: 19 Ханс-Ёзэф КАПЕЛЬМАН (19.12.1949 П «Баварыя»), 22 Вольфганг КЛЕФ (16.11.1946 Б «Барусія», Мёнхенгладбах), 20 Хельмут КРЭМЕРС (24.03.1949 П «Шальке-04», Гельзенкірхен), 21 Норберт НІГБУР (08.05.1948 Б «Шальке-04», Гельзенкірхен).




## 1978 Аргентына

**XI. 1–25 чэрвеня, Аргентына**

Нарэшце чэмпіянат свету прыймала Аргентына! Для краіны, якая цярпела ад панавання ваеннага рэжыму, «Мундзіяль» быў сапраўдным промнем святла. Можна ўявіць, з якім імпэтам краіна рыхтавалася да гэтай падзеі і якія надзеі ўскладала на сваю нацыянальную зборную каманду! І каманда Меноці гэтыя надзеі спраўдзіла. У фінале Аргентыне супрацьстаялі ўсё тыя ж «Лятучыя галандцы». Два галы лепшага стральца і футбаліста турніра Марыё Кэмпеса і дакладны ўдар Рыкарда Бертоні зламалі супраціў еўрапейцаў.

Упершыню ў гісторыі чэмпіянатаў аргентынцы зрабілі нумарацыю футбалістаў каманды ў адпаведнасці з алфавітам. Да прыкладу, пад традыцыйным для брамнікаў № 1 гуляў нападнік Нарберта Алонса!

Удзел у турніры бралі 16 каманд. У фінальным матчы Аргентына ў дадатковы час (асноўны час 1-1) перамагла Галандыю з лікам 3-1.

**Зборная каманда Аргентыны**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Нарберта Асвальда АЛОНСА** | 04.01.1953 | **Н** | «Рывер Плэйт», Б-А | **3 (85)** | |
| 2 | **Асвальда Сэзар АРДЗІЛЕС** | 03.08.1952 | **П** | «Уракан», Б-А | **6 (470)** | |
| 15 | **Хорхэ Марыё АЛЬГІН** | 17.05.1952 | **А** | «Сан Ларэнса», Б-А | **7 (660)** | |
| 17 | **Мігель Анхел АЎЕДА** | 12.10.1950 | **А** | «Тальерэс» | **1 (5)** | |
| 4 | **Рыкарда Даніэль БЕРТОНІ** | 14.03.1955 | **Н** | «Індэпэндзьентэ», Б-А | **6 (478)** | **2** |
| 21 | **Хасэ Даніэль ВАЛЕНСІЯ** | 03.10.1955 | **П** | «Атлетыка Тальерэс», Кардоба | **4 (271)** | |
| 22 | **Хулiё Рыкарда ВІЛЬЯ** | 18.08.1952 | **П** | «Рэсінг Клуб Авельянэда» | **2 (90)** | |
| 7 | **Луіс Адольфа ГАЛЬВАН** | 24.02.1948 | **А** | «Атлетыка Тальерэс», Кардоба | **7 (660)** | |
| 6 | **Амерыка Рубен ГАЛЬЕГА** | 25.04.1955 | **П** | «Ньюэл'с Олд Бойс», Расарыё | **7 (655)** | |
| 10 | **Марыё Альберта КЭМПЕС** | 15.07.1954 | **Н** | «Валенсія», Ісп. | **7 (660)** | **6** |
| 12 | **Рубен Амар ЛАРОСА** | 18.11.1947 | **П** | «Індэпэндзьентэ», Б-А | **2 (145)** | |
| 14 | **Леапольда Хасінта ЛЮКЕ** | 03.05.1949 | **Н** | «Рывер Плэйт», Б-А | **5 (480)** | **4** |
| 16 | **Оскар Альберта ОРЦІС** | 08.04.1953 | **Н** | «Рывер Плэйт», Б-А | **6 (293)** | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 19 | **Даніэль Альберта ПАСАРЭЛЬЯ** | 25.05.1953 | **А** | «Рывер Плэйт», Б-А | **7 (660)** | **1** |
| 20 | **Альберта Сэзар ТАРАНЦІНІ** | 03.12.1955 | **А** | без клуба | **7 (660)** | **1** |
| 5 | **Убальда Мацільда ФІЛЬЁЛ** | 21.07.1950 | **Б** | «Рывер Плэйт», Б-А | **7 (660)** | **–4** |
| 9 | **Рэнэ Арланда ХАУСМАН** | 19.07.1953 | **Н** | «Уракан», Б-А | **6 (328)** | **1** |

Трэнер: **Сэзар Луіс МЕНОЦІ** (05.11.1938)

Запасныя: 5 Радольфа Эктар БАЛЕЙ (16.11.1951 Б, «Уракан»), 8 Амерыка Рубен ГАЛЬВАН (25.04.1955 П, «Ньюэл'с Олд Бойс»), 11 Даніэль Педра КІЛЬЕР (21.12.1949 А, «Рэсінг»), 13 Рыкарда Антоніё ЛАВОЛПЕ (06.02.1952 Б, «Сан Ларэнса»; З 2002 гал. тр. зб. Мексікі, якую вывеў у фінальную частку ЧС 2006), 18 Рубен ПАНЬЯНІНІ (31.01.1949 А, «Індэпэндзьентэ»).



# 1982 Італія

**XII. 13 чэрвеня – 11 ліпеня, Іспанія**

У першыню ўдзел у фінальнай частцы чэмпіянату свету бралі 24 каманды – гэта было адзнакай росту майстэрства каманд з Афрыкі, Азіі і Паўночнай Амерыкі. Перамога блякла распачаўшых турнір італьянцаў дазволіла ім дагнаць Бразілію па колькасці заваяваных Кубкаў свету. У складзе новых чэмпіёнаў свету бліскуча згулялі Дзіна Дзоф, Гаэтана Шырэа, Клаўдзіё Джэнціле, Антоніё Кабрыні і асабліва Паола Росі, які з 6 галамі стаў найлепшым стральцом турніру.

У фінале зборная Італіі перамагла ФРГ з лікам 3-1.

**Зборная каманда Італіі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 18 | **Алясандра АЛЬТАБЕЛІ** | 28.11.1955 | **А** | «Інтэр», Мілан | **3 (11)** | **1** |
| 9 | **Джанкарла АНТАНІЁНІ** | 01.04.1954 | **Н** | «Фіярэнціна» Фларэнцыя | **6 (477)** | |
| 13 | **Габрыэле АРЫЯЛІ** | 25.12.1952 | **П** | «Інтэр», Мілан | **5 (435)** | |
| 3 | **Джузэпэ БЕРГОМІ** | 22.12.1963 | **А** | «Інтэр», Мілан | **3 (237)** | |
| 19 | **Франчэска ГРАЦЫЯНІ** | 16.12.1952 | **Н** | «Фіярэнціна», Фларэнцыя | **7 (526)** | **1** |
| 6 | **Клаудзіё ДЖЭНЦІЛЕ** | 27.09.1953 | **А** | «Ювентус», Турын | **6 (540)** | |
| 1 | **Дзіна ДЗОФ** | 28.02.1942 | **Б** | «Ювентус», Турын | **7 (630)** | **-6** |
| 4 | **Антоніё КАБРЫНІ** | 08.10.1957 | **А** | «Ювентус», Турын | **7 (630)** | **1** |
| 5 | **Фульвіё КАЛАВАЦІ** | 09.05.1957 | **А** | «Інтэр», Мілан | **7 (573)** | |
| 15 | **Франка КАУЗІЁ** | 01.02.1949 | **П** | «Удзінэзэ» | **2 (48)** | |
| 16 | **Бруна КОНЦІ** | 13.03.1955 | **Н** | «Рома», Рым | **7 (630)** | **1** |
| 11 | **Джампьера МАРЫНІ** | 25.02.1951 | **П** | «Інтэр», Мілан | **5 (273)** | |
| 20 | **Паола РОСІ** | 23.09.1956 | **Н** | «Ювентус», Турын | **7 (575)** | **6** |
| 14 | **Марка ТАРДЭЛІ** | 24.09.1954 | **П** | «Ювентус», Турын | **7 (615)** | **2** |
| 7 | **Гаэтана ШЫРЭА** | 25.05.1953 | **А** | «Ювентус», Турын | **7 (630)** | |

Трэнер: **Вінчэнца БЕАРДЗОТ** (26.09.1927)

Запасныя: 12 Івана БАРДОН (13.04.1951 Б, «Інтэр»), 2 Франка БАРЭЗІ (08.05.1960 А, «Мілан»), 8 Пьетра ВЕРХАВОД (06.04.1959 А, «Фіярэнціна»), 22 Джавані ГАЛІ (29.04.1958 Б, «Фіярэнціна»), 10 Джузэпэ ДАСЭНА (02.05.1958 П,

«Тарына»), 17 Даніэле МАСАРА (23.05.1961 П, «Фіярэнціна»), 21 Франка СЕЛЬВАДЖЫ (15.05.1953 П, «Кальяры»).



# 1986 Аргентына

**XIII. 31 мая – 29 чэрвеня, Мексіка**

Упершыню адна краіна прыймала чэмпіянат свету другі раз. Здарылася гэта пасля таго, як стала зразумела, што Калумбія, якой было дадзена права правесці турнір 1986 г., не справіцца з гэтай задачай з-за складанай эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў краіне. Нягледзячы на тое, што на арганізацыю турніру прэтэндавалі таксама ЗША і Бразілія, выбар ФІФА быў зроблены на карысць мексіканцаў.

Гаспадары турніра не былі ў ліку фаварытаў. Куды больш шансаў на перамогу мелі італьянцы, новыя чэмпіёны Еўропы французы, заўсёды моцныя немцы і бразільцы. Свята, аднак, прыйшло на вуліцы аргентынскіх гарадоў і мястэчак. Каманда Карласа Біларда і Дзіега Марадоны другі раз прывезла ў сваю краіну Кубак свету. Цікава, што на траву мексіканскіх стадыёнаў не выйшаў аніводзін з пераможцаў не такога далёкага чэмпіянату свету 1978 г. (у складзе каманды быў толькі траўмаваны Пасарэлья, які так і не згуляў аніводнай хвіліны).

І гэтым разам нумарацыя аргентынцаў адпавядала алфавіту – выключэнне было зроблена толькі для Марадоны, які ўпадабаў «дзесятку» і не жадаў выступаць пад іншым нумарам.

Удзел у чэмпіянаце бралі 24 каманды. У фінальным матчы каманда Аргентыны перамагла ФРГ з лікам 3-2.

**Зборная каманда Аргентыны**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 16 | **Хулiё Хорхэ АЛАРЦІКАЭЧЭА** | 18.10.1958 | **А** | «Бока Хуніёрс», Б-А | **7 (366)** | |
| 2 | **Серхіё Даніэль БАЦІСТА** | 09.11.1962 | **П** | «Архенцінас Хуніёрс», Б-А | **7 (534)** | |
| 3 | **Рыкарда Энрыке БАЧЫНІ** | 25.01.1954 | **П** | «Індэпэндзьентэ», Б-А | **1 (5)** | |
| 4 | **Клаўдзіё Даніэль БОРГІ** | 28.09.1964 | **Н** | «Архенцінас Хуніёрс», Б-А | **2 (119)** | |
| 5 | **Хасэ Луіс БРАУН** | 10.11.1956 | **А** | «Дэпарціва Эспаньёл», Б-А | **7 (630)** | **1** |
| 7 | **Хорхэ Луіс БУРУЧАГА** | 09.10.1962 | **П** | «Нант», Фра. | **7 (608)** | **2** |
| 11 | **Хорхэ Альберта ВАЛЬДАНА** | 04.10.1955 | **Н** | «Рэал», Мадрыд, Ісп. | **7 (630)** | **4** |
| 13 | **Оскар Альфрэда ГАРЭ** | 09.12.1956 | **А** | «Ферра Карыл Аэстэ», Б-А | **4 (360)** | |
| 8 | **Нестар Ранальда КЛАУСЭН** | 29.09.1962 | **А** | «Індэпэндзьентэ», Б-А | **1 (90)** | |
| 9 | **Хасэ Луіс КУСІУФА** | 01.02.1961 | **А** | «Велес Сарсфілд», Б-А | **6 (540)** | |
| 10 | **Дзіега Арманда МАРАДОНА** | 30.10.1960 | **П** | «Напалі», Іта. | **7 (630)** | **5** |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | **Педра Пабла ПАСКУЛІ** | 17.05.1960 | **Н** | «Леччэ», Іта. | **2 (163)** | **1** |
| 18 | **Нэры Альберта ПУМПІДА** | 30.07.1957 | **Б** | «Рывер Плэйт», Б-А | **7 (630)** | **–5** |
| 19 | **Оскар Альфрэда РУДЖЭРЫ** | 26.01.1962 | **А** | «Рывер Плэйт», Б-А | **7 (630)** | **1** |
| 20 | **Карлас Даніэль ТАПІЯ** | 20.08.1962 | **Н** | «Бока Хуніёрс», Б-А | **2 (32)** | |
| 21 | **Марсэла Антоніё ТРАБІЯНІ** | 17.02.1955 | **Н** | «Эльчэ», Ісп. | **1 (2)** | |
| 14 | **Рыкарда Амар ХІУСЦІ** | 11.12.1956 | **А** | «Індэпэндзьентэ», Б-А | **7 (630)** | |
| 12 | **Эктар Адольфа ЭНРЫКЕ** | 26.04.1962 | **П** | «Рывер Плэйт», Б-А | **5 (331)** | |

Трэнер: **Карлас Сальвадор БІЛАРДА** (16.03.1938)

Запасныя: 1 Серхіё Амар АЛЬМІРОН (18.01.1958 Н, «Ньюэл'с Олд Бойс»), 15 Луіс Альберта ІСЛАС (22.12.1965 Б, «Эстудзіянтэс»), 6 Даніэль Альберта ПАСАРЭЛЬЯ (25.05.1953 А «Фіярэнціна», Іта.), 22 Эктар Мігель СЕЛАДА (30.04.1957 Б, «Амерыка», Мекс.)




# 1990 ФРГ

### XIV. 8 чэрвеня – 8 ліпеня, Італія

Услед за Мексікай другі раз у гісторыі чэмпіянат свету прымала Італія. Гаспадары турніра спадзяваліся, што іх нацыянальная каманда здолее апярэдзіць бразільцаў па колькасці заваяваных Кубкаў свету. Здарылася, аднак, тое, што і бразільцаў, і італьянцаў (ім дасталося толькі 3-е месца) па гэтым паказчыку дагналі немцы, якія ў трэцім запар для сябе фінале чэмпіянатаў свету здолелі, нарэшце, адсвяткаваць перамогу. Цікава, што ў выпадку чарговай паразы немцаў да ліку трохразовых уладальнікаў Кубка свету далучыліся б аргентынцы! Свайго часу, ім, аднак, давядзецца яшчэ пачакаць...

Удзел у чэмпіянаце бралі 24 каманды. У фінальным матчы каманда ФРГ з лікам 1-0 перамагла Аргентыну.

**Зборная каманда ФРГ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | **Клаус АЎГЕНТАЛЕР** | 26.09.1957 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **7 (660)** | |
| 15 | **Увэ БАЙН** | 26.09.1960 | **П** | «Айнтрахт», Франкфурт | **4 (292)** | **1** |
| 14 | **Томас БЕРТАЛЬД** | 12.11.1964 | **А** | «Рома», Іта. | **7 (599)** | |
| 3 | **Андрэас БРЭМЭ** | 09.11.1960 | **А** | «Інтэр», Іта. | **6 (570)** | **3** |
| 6 | **Гвіда БУХВАЛЬД** | 24.01.1961 | **А** | «Штутгарт» | **7 (660)** | |
| 1 | **Бода ІЛГНЕР** | 07.04.1967 | **Б** | «Кёльн» | **7 (660)** | **–5** |
| 18 | **Юрген КЛІНСМАН** | 30.07.1964 | **Н** | «Інтэр», Іта. | **7 (629)** | **3** |
| 4 | **Юрген КОЛЕР** | 06.10.1965 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **4 (390)** | |
| 7 | **П'ер ЛІТБАРСКІ** | 16.04.1960 | **П** | «Кёльн» | **6 (376)** | **1** |
| 10 | **Лотар Херберт МАТЭУС** | 21.03.1961 | **П** | «Інтэр», Іта. | **7 (660)** | **4** |
| 17 | **Андрэас МЁЛЕР** | 02.09.1967 | **П** | «Барусія», Дортмунд | **2 (23)** | |
| 19 | **Ханс ПФЛЮГЛЕР** | 27.03.1960 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **1 (90)** | |
| 2 | **Штэфан РОЙТЭР** | 16.10.1966 | **А** | «Баварыя», Мюнхен | **6 (429)** | |
| 13 | **Карл-Хайнц РЫДЛЕ** | 16.09.1965 | **Н** | «Вердэр», Брэмэн | **4 (204)** | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 20 | **Олаф ТОН** | 01.05.1966 | **П** | «Баварыя», Мюнхен | **2 (123)** | |
| 9 | **Рудольф ФЁЛЕР** | 13.04.1960 | **Н** | «Рома», Іта. | **6 (418)** | **3** |
| 8 | **Томас ХЁСЛЕР** | 30.05.1966 | **П** | «Кёльн» | **5 (408)** | |

Трэнер: **Франц БЭКЕНБАУЭР** (11.09.1945)

Запасныя: 12 Раймонд АУМАН (12.10.1963 Б, «Баварыя»), 22 Андрэас КЁПКЕ (12.03.1962 Б, «Нюрнберг»), 11 Франк МІЛ (23.07.1958 Н, «Барусія» Дортмунд), 16 Пауль ШТАЙНЕР (23.01.1957 А, «Кёльн»), 21 Гюнтэр ХЕРМАН (05.12.1960 П, «Вердэр»).




## 1994 Бразілія

**XV. 17 чэрвеня – 17 ліпеня, ЗША**

Чэмпіянат свету прымалі Злучаныя Штаты, які здолелі апярэдзіць у змаганні за права правесці турнір Бразілію і Марока. Упершыню перамога ацэньвалася ў тры ачкі, а нічыя – у адно.

Чацвёрты раз Кубак свету заваявалі бразільцы. Ніколі да гэтага пераможца чэмпіянату не вызначаўся ў серыі пенальці. Галоўным трэнерам бразільцаў быў Карлас Альберта Парэйра, які ў 1970 г. дапамагаў тагачаснаму кіраўніку каманды Марыё Загала заваяваць трэці для Бразіліі Кубка свету. На турніры ў ЗША Загала і Парэйра памяняліся ролямі!

Галоўнымі зоркамі каманды былі Рамарыё, Бебета, Бранка, Тафарэл і Дунга. Аднак не ім, а Кафу пашчасціць праз восем гадоў узняць над сабой пяты для Бразіліі Кубак свету. Зазначым, што ў складзе бразільскай каманды на турнір прыехаў і Ранальда, якому, аднак, так і не давялося згуляць у ЗША аніводнай хвіліны.

Удзел у чэмпіянаце бралі 24 каманды. У фінальным матчы каманда Бразілія па пенальці з лікам 3-2 (асноўны час 0-0) перамагла Італію.

**Зборная каманда Бразіліі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 13 | **АЛДАІР Сантас** | 30.11.1965 | **А** | «Рома», Іта. | **7 (593)** | |
| 7 | **БЕБЕТА** | 16.02.1964 | **Н** | «Дэпарціва», Ла-Карунья, Ісп. | **7 (660)** | **3** |
| 6 | **БРАНКА** | 04.04.1964 | **А** | «Флумінэнсэ», Р-д-Ж | **3 (298)** | **1** |
| 21 | **ВІЁЛА** | 01.01.1969 | **Н** | «Карынціянс», Сан Паула | **1 (16)** | |
| 8 | **ДУНГА** | 31.10.1963 | **П** | «Штутгарт», Герм. | **7 (648)** | |
| 2 | **ЖАРЖЫНЬЁ** | 17.08.1964 | **А** | «Баварыя», Герм. | **7 (559)** | |
| 9 | **ЗІНЬЁ** | 17.06.1967 | **П** | «Палмейрас», Сан Паула | **7 (605)** | |
| 14 | **КАФУ** | 19.06.1970 | **А** | «Сан Паула» | **3 (125)** | |
| 16 | **ЛЕАНАРДА Насімента дэ** | 05.09.1969 | **П** | «Сан Паула» | **4 (312)** | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Араужа** | | | | | |
| 15 | **МАРСІЁ Раберта дос САНТАС** | 15.09.1969 | **А** | «Бардо», Фра. | **7 (660)** | **1** |
| 5 | **МАУРА да СІЛЬВА Гомес** | 12.01.1968 | **П** | «Дэпарціва», Ла-Карунья, Ісп. | **7 (615)** | |
| 17 | **МАЗІНЬЁ** | 08.04.1966 | **П** | «Палмейрас», Сан Паула | **6 (392)** | |
| 19 | **МЮЛЕР** | 31.01.1966 | **Н** | «Сан Паула» | **1 (11)** | |
| 18 | **ПАУЛА СЕРЖЫЁ** | 02.06.1969 | **Н** | «Баер 04», Герм. | **2 (27)** | |
| 10 | **РАІ Соуза Віейра дэ Алівейра** | 15.05.1965 | **П** | «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра. | **5 (304)** | **1** |
| 11 | **РАМАРЫЁ да Соуза Фарыя Фільё** | 29.01.1966 | **Н** | «Барселона», Ісп. | **7 (660)** | **5** |
| 3 | **РЫКАРДА Раберта Барэта да РОЧА** | 11.09.1962 | **А** | «Васка да Гама», Р-д-Ж | **1 (67)** | |
| 1 | **Клаудзіё Андрэ Морген ТАФАРЭЛ** | 08.05.1966 | **Б** | «Рэджана», Іта. | **7 (660)** | **–3** |

Трэнер: **Карлас Альберта ПАРЭЙРА** (25.03.1943)

Запасныя: 22 ЖЫЛМАР – Луіс Рынальдзі (13.01.1959 Б, «Фламенга»), 12 ЗЭЦІ-Армеліна Данізэці Куальята (10.01.1965 Б, «Сан Паула»), 4 РАНАЛЬДАА – Ранальда Радрыгес дэ Жесус (19.06.1965 А, «Сан Паула») 20 РАНАЛЬДА Луіс Назарыё дэ Ліма (22.09.1976 Н, «Крузэйра»).




## 1998 Францыя

**XVI. 10 чэрвеня – 12 ліпеня, Францыя**

Шэсцьдзесят гадоў давялося чакаць французам, каб другі раз убачыць на стадыёнах сваёй краіны гульні наймацнейшых каманд свету! Упершыню ўдзел у турніры бралі 32 каманды, а ўдзел у адборавых гульнях – 174 краіны (абсалютны рэкорд на той час). Сярод удзельнікаў адборавага турніру былі ажно 32 каманды-дэбютанткі (у іх ліку – Беларусь).

Упершыню на чэмпіянатах свету дзейнічала права «залатога гола», пасля якога гульня ў дадатковы час адразу спынялася. Першымі аўтарамі такога гола сталі французы, якія ў 1/8 фінала перамаглі такім чынам Парагвай. Немец Лотар Матэус паўтарыў рэкорд мексіканскага брамніка Антоніё Карбахала – абодва бралі ўдзел у 5 фінальных турнірах чэмпіянатаў свету! Але галоўнымі героямі турніру сталі французы, якія ў фінале бліскуча перайгралі бразільцаў з лікам 3-0.

**Зборная каманда Францыі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | **Ц'еры АНРЫ** | 17.08.1977 | **Н** | «Манако» | **6 (367)** | **3** |
| 14 | **Ален БАГАСЯН** | 27.10.1970 | **П** | «Сампдорыя», Іта. | **5 (216)** | |
| 16 | **Фаб'ен БАРТЭС** | 28.06.1971 | **Б** | «Манако» | **7 (684)** | **–2** |
| 5 | **Ларан БЛАН** | 19.11.1965 | **А** | «Алімпік», Марсэль | **5 (487)** | **1** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4 **Патрык ВІЕЙРА** | 23.06.1976 | **П** | «Арсенал», Англ. | **2 (106)** | |
| 9 **Стэфан ГІВАРШ** | 06.09.1970 | **Н** | «Асэр» | **6 (267)** | |
| 6 **Юры ДЖАРКАЕФ** | 09.03.1968 | **П** | «Інтэр», Іта. | **7 (585)** | **1** |
| 21 **Крыстоф ДЗЮГАРЫ** | 24.03.1972 | **Н** | «Алімпік», Марсэль | **3 (118)** | **1** |
| 13 **Бернар ДЫЯМЕД** | 23.01.1974 | **Н** | «Асэр» | **3 (222)** | |
| 8 **Марсэль ДЭСАІ** | 07.09.1968 | **А** | «Мілан», Іта. | **7 (661)** | |
| 7 **Дзідзье ДЭШАМ** | 15.10.1968 | **П** | «Ювентус», Іта. | **6 (594)** | |
| 10 **Зінэдзін ЗІДАН** | 23.06.1972 | **П** | «Ювентус», Іта. | **5 (459)** | **2** |
| 2 **Венсан КАНДЭЛЯ** | 24.10.1973 | **А** | «Рома», Іта. | **1 (90)** | |
| 19 **Крысціян КАРАМБЁ** | 03.12.1970 | **П** | «Рэал», Мадрыд, Ісп. | **4 (239)** | |
| 18 **Франк ЛЕБЁФ** | 22.01.1968 | **А** | «Чэлсі», Англ. | **3 (197)** | |
| 3 **Біксант ЛІЗАРАЗЮ** | 09.12.1969 | **А** | «Баварыя», Герм. | **6 (594)** | **1** |
| 17 **Эманюэль ПЕЦІ** | 22.09.1970 | **П** | «Арсенал», Англ. | **6 (502)** | **2** |
| 11 **Рабер ПІРЭС** | 29.01.1973 | **П** | «Мец» | **3 (134)** | |
| 20 **Давід ТРЭЗЭГЕ** | 15.10.1977 | **Н** | «Манако» | **6 (347)** | **1** |
| 15 **Ліліян ЦЮРАМ** | 01.01.1972 | **А** | «Парма», Іта. | **6 (594)** | **2** |

Трэнер: **Эмэ ЖАКЭ** (27.11.1941)

Запасныя: 1 Бернар ЛАМА (07.04.1963 Б «Вэст Хэм Юнайтэд», Англ.), 22 Ліянэль ШАРБАНЬЕ (25.10.1966 Б «Асэр»).




## 2002 Бразілія

**XVII. 31 мая – 30 чэрвеня, Паўднёвая Карэя/Японія**

Упершыню чэмпіянат свету праводзіўся на стадыёнах двух краін і ўпершыню – ў Азіі. Першапачаткова абедзве краіны самастойна прэтэндавалі на правядзенне турніру. Пагадненне пра сумеснае правядзенне чэмпіянату было дасягнута ў 1996 г. Да ўдзелу у турніры заявіліся 198 краін, што з'явілася новым рэкордам чэмпіянатаў свету.

Пяты раз Кубак свету заваявалі бразільцы. Іх капітан Кафу стаў першым у свеце гульцом, які тройчы запар гуляў у фінальных матчах чэмпіянатаў свету. Упершыню у паўфінале чэмпіянатаў свету гуляла каманда з Азіі – зборная Паўднёвай Карэі. Найлепшым стральцом турніру стаў бразілец Ранальда, на рахунку якога 8 галоў. У фінальным турніры бразільцы перамаглі ва ўсіх сямі сваіх гульнях (падобны вынік быў у іх у 1970 г., але тады давялося гуляць на гульню менш).

Удзел у чэмпіянаце бралі 32 каманды. У фінальным матчы каманда Бразіліі з лікам 2-0 перамагла Германію.

**Зборная каманда Бразіліі**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 14 **АНДЭРСАН Карэа ПОЛГА** | 09.02.1979 | **А** | «Грэміё» Порту-Алегры | **2 (180)** |
| 13 **Жуліяна Хаус БЕЛЕЦІ** | 10.06.1976 | **А** | «Сан Паула» | **1 (5)** |
| 18 **ВАМПЕТА** | 13.03.1974 | **П** | «Карынціянс», Сан Паула | **1 (18)** |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | **ДЭНІЛСАН дэ Алівейра** | 24.08.1977 | **Н** | «Беціс», Ісп. | **5 (117)** | |
| 16 | **ЖУНІЁР** | 20.06.1973 | **А** | «Парма», Іта. | **1 (90)** | **1** |
| 19 | **ЖУНІНЬЁ ПАУЛІСТА** | 22.02.1973 | **П** | «Атлетыка», Мадрыд, Ісп. | **5 (265)** | |
| 8 | **ЖЫЛБЕРТА Апарэсіда да СІЛЬВА** | 07.10.1976 | **П** | «Атлетыка Мінэйра» | **7 (630)** | |
| 23 | **КАКА** | 22.04.1982 | **Н** | «Сан Паула» | **1 (18)** | |
| 2 | **КАФУ** | 07.06.1970 | **А** | «Рома», Іта. | **7 (630)** | |
| 15 | **Жазэ КЛЕБЕРСАН Перэйра** | 19.06.1979 | **П** | «Атлетыка Паранаэнсэ» | **5 (307)** | |
| 21 | **ЛУІЗАА** | 14.11.1975 | **Н** | «Грэміё», Порту-Алегры | **2 (39)** | |
| 3 | **ЛУСІЁ** | 08.05.1978 | **А** | «Баер 04», Герм. | **7 (630)** | |
| 1 | **МАРКАС Раберта Сільвейра Рэйс** | 03.07.1974 | **Б** | «Палмейрас», Сан Паула | **7 (630)** | **–4** |
| 6 | **РАБЕРТА КАРЛАС да Сільва** | 10.04.1973 | **А** | «Рэал», Мадрыд, Ісп. | **6 (540)** | **1** |
| 9 | **РАНАЛЬДА Луіс Назарыё дэ Ліма** | 22.09.1976 | **Н** | «Інтэр», Іта. | **7 (552)** | **8** |
| 11 | **РАНАЛЬДЗІНЬЁ** | 21.03.1980 | **Н** | «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра. | **5 (334)** | **2** |
| 4 | **Жазэ Вітор РОКЕ ЖУНІЁР** | 31.08.1976 | **А** | «Мілан», Іта. | **6 (540)** | |
| 10 | **РЫВАЛДА Віктор Борба Ферэйра** | 19.04.1972 | **Н** | «Барселона», Ісп. | **7 (611)** | **5** |
| 7 | **РЫКАРДЗІНЬЁ** | 23.05.1976 | **П** | «Карынціянс», Сан Паула | **3 (50)** | |
| 20 | **ЭДЗІЛСАН да Сільва Ферэйра** | 17.09.1971 | **Н** | «Крузэйра», Белу Арызонці | **4 (170)** | |
| 5 | **ЭДМІЛСАН Жазэ Гомес Мараэс** | 10.07.1976 | **А** | «Алімпік», Ліён, Фра. | **6 (540)** | **1** |

Трэнер: **Луіс Феліпэ СКАЛАРЫ** (09.11.1948)

Запасныя: 12 ДЗІДА – Нэльсан дэ Жэзус да Сільва (07.10.1973 Б, «Карынціянс», Сан Паула), 22 РАЖЭРЫЁ Сэні (22.01.1973 Б, «Сан Паула»).

# 2006 Італія

**XVII. 9 чэрвеня – 9 ліпеня, Германія**

Другі раз у гісторыі наймацнейшая каманда свету вызначалася на нямецкай зямлі. За права ўзяць удзел у турніры змагаліся 194 каманды, якім спатрэбілася правесці ў адборавым турніры 847 гульняў ды забіць 2464 галы... Уся Германія спадзявалася на паўтарэнне трыюмфу 1974 г., але яркай камандзе Юргена Клінсмана давялося задаволіцца толькі «бронзаю»...

Героямі турніру сталі італьянцы і французы. Галоў-

ным расчараваннем – Бразілія, ад зорак якой заўзятары так і не дачакаліся чэмпіёнскай гульні. Адзначым, аднак, асабістае дасягненне Ранальда, які забіў свой 15-ты гол у фінальных частках ЧС і стаў аднаасобным лідэрам па гэтым паказчыку. Не абмінем і поспеху суседзяў-украінцаў, якія ў сваім першым турніры здолелі прабіцца ў васьмёрку наймацнейшых каманд свету.

Другі раз у гісторыі лёс Кубка свету вызначаўся ў серыі пенальці. У адрозненні ад 1994 г. італьянцы гэтым разам выйгралі ў «латэрэі»: пасля нічыёй 1-1 у асноўным і дадатковым часе яны былі мацнейшымі за французаў у серыі адзінаццацімятровых удараў 5-3.

**Зборная каманда Італіі**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | **Андрэа БАРДЗАЛЫ** | 08.05.1981 | **А** | «Палерма» | **2 (125)** | |
| 17 | **Сімонэ БАРОНЭ** | 30.04.1978 | **П** | «Палерма» | **2 (40)** | |
| 1 | **Джанлуіджы БУФОН** | 28.01.1978 | **Б** | «Ювентус», Турын | **7 (690)** | **-2** |
| 8 | **Джэнара ГАТУЗА** | 09.01.1978 | **П** | «Мілан» | **6 (552)** | |
| 3 | **Фабіё ГРОСА** | 28.01.1977 | **А** | «Палерма» | **6 (600)** | **1** |
| 11 | **Альберта ДЖЫЛАРДЗІНА** | 05.07.1982 | **Н** | «Мілан» | **5 (304)** | **1** |
| 2 | **Крысціян ДЗАКАРДА** | 21.12.1981 | **А** | «Палерма» | **3 (157)** | |
| 19 | **Джанлука ДЗАМБРОТА** | 19.02.1977 | **А** | «Ювентус», Турын | **6 (600)** | **1** |
| 4 | **Даніэле ДЭ РОСІ** | 24.07.1983 | **П** | «Рома», Рым | **3 (177)** | |
| 7 | **Алясандра ДЭЛЬ П'ЕРА** | 09.11.1974 | **Н** | «Ювентус», Турын | **5 (172)** | **1** |
| 18 | **Філіпа ІНДЗАГІ** | 09.08.1973 | **Н** | «Мілан» | **1 (31)** | **1** |
| 16 | **Маура КАМАРАНЭЗІ** | 04.10.1976 | **П** | «Ювентус», Турын | **5 (350)** | |
| 5 | **Фабіё КАНАВАРА** | 13.09.1973 | **А** | «Ювентус», Турын | **7 (690)** | |
| 23 | **Марка МАТЭРАЦЫ** | 19.08.1973 | **А** | «Інтэр», Мілан | **4 (363)** | **2** |
| 13 | **Алясандра НЭСТА** | 19.03.1976 | **А** | «Мілан» | **3 (196)** | |
| 22 | **Масіма ОДА** | 14.06.1976 | **А** | «Лацыё», Рым | **1 (23)** | |
| 20 | **Сімонэ ПЕРОТА** | 17.09.1977 | **П** | «Рома», Рым | **7 (613)** | |
| 21 | **Андрэа ПІРЛА** | 19.05.1979 | **П** | «Мілан» | **7 (667)** | **1** |
| 9 | **Лука ТОНІ** | 26.05.1977 | **Н** | «Фіярэнціна», Флар. | **6 (479)** | **2** |
| 10 | **Франчэска ТОЦІ** | 27.09.1976 | **П** | «Рома», Рым | **7 (465)** | **1** |
| 15 | **Вінчэнца ЯКВІНТА** | 21.11.1979 | **Н** | «Удзінэзэ», Удзіна | **5 (192)** | **1** |

Трэнер: **Марчэла ЛІПІ** (11.04.1948)

Запасныя: 14 Марка АМЕЛІЯ (02.04.1982 Б «Ліворна»), 12 Анжэла ПЕРУЦЫ (16.02.1970 Б «Лацыё», Рым).

## Гульцы і трэнеры – чэмпіёны свету 1930–2006[***]



**АЛАРЦІКАЭЧЭА Хуліё Хорхэ** (OLARTICOECHEA Julio Jorge). Аргентына. 18.10.1958. Паўабаронца. **ЧС 1986 (7-0)**. «Рэсінг», Б-А. (1976-81, 1988-90, 249-10), «Рывер Плэйт» (1981-84), «Бока Хуніёрс» (1985-86, 44-4),«Нант», Фра. (1986-87, 27-0), «Архенцінас Хуніёрс» (1987-88, 23-1), «Дэпарціва», Мандзію дэ Карыентэс (1990-92). За зб. Аргентыны (1982-90) згуляў 17 гульняў. Срэбны прызёр ЧС 1990 (5-0). Запасны на ЧС 1982. Удзельнік КА 1983 і 1987.



**АЛДАІР дос Сантас Насімента** (ALDAIR dos Santos Nacimento). Бразілія. 30.11.1965. Абаронца. **ЧС 1994 (7-0)**. «Фламенга» (1986-87, 1989), «Бенфіка», Парт. (1988-89, 22-5), «Рома», Іта. (1990-2003, 317-14). Чэмпіён Італіі 2001, уладальнік Кубка Італіі 1991. За зб. Бразіліі (1989-2000) згуляў 81 гульню, забіў 3 галы. Срэбны прызёр ЧС 1998 (6-0), запасны на ЧС 1990. Уладальнік КА 1989 і 1997, срэбны прызёр КА 1995, бронзавы прызёр АГ 1996. Асноўны гулец абароны зб. Бразіліі 1990-х.



**АЛЕМАНДЗІ Луіджы** (ALLEMANDI Luigi). Італія. 13.07.1903 – 16.05.1959. Абаронца. **ЧС 1934 (5-0)**. «Ювентус», Турын (1935-28, 37-0), «Інтэр-Амбразіяна», Мілан (1928-35, 193-1), «Рома» (1935-37, 48-1). Чэмпіён Італіі 1926, 1930. У чэмпіянаце краіны згуляў 278 гульняў, забіў 2 галы. За зб. Італіі (1925-34) згуляў 24 гульні. У 1927 г. быў пажыццёва дыскваліфікаваны за «здачу» гульні ў матчы «Ювентус»-«Тарына». Дыскваліфікацыя была знятая толькі пасля вялікіх намаганняў дзеячоў «Інтэра», куды перабраўся пасля гэтай гісторыі Алемандзі.



**АЛІЎЕРЫ Альда** (OLIVIERI Aldo). Італія. 02.10.1910 – 05.04.1999. Брамнік, трэнер. **ЧС 1938 (4/-5)**. «Верона» (1930-33), «Падова» (1933-34), «Лукезэ Лібертас», Лука (1934-38), «Тарына» (1938-42,

---

* Падаецца наступная інфармацыя: • ПРОЗВІШЧА і поўнае імя па-беларуску з захаваннем правілаў транскрыпцыі імёнаў і прозвішчаў з іншых моваў на беларускую • ПРОЗВІШЧА і поўнае імя на мове арыгіналу • Краіна • Даты нараджэння і смерці • Пазіцыя на полі (у час чэмпіянатаў свету, пра якія ідзе гаворка) • Год турніра і дасягненні на ім – гульні і галы (у брамнікаў – прапушчаныя галы) • Клубы, у складзе якіх выступаў той альбо іншы гулец, з пазначэннем у большасці выпадкаў гадоў выступлення, колькасці праведзеных гульняў і забітых галоў у складзе кожнага клуба • Дасягненні на ўзроўні клубаў (перамогі ў розыгрышах кантынентальных і Міжкантынентальнага кубкаў, чэмпіянатах і Кубках краін) • Перыяд гульні за нацыянальную зборную каманду, колькасць праведзеных у яе складзе гульняў і забітых галоў • Дасягненні ў выступах у складзе нацыянальнай зборнай каманды (перамогі, прызавыя месцы і ўдзел у прэстыжных турнірах) • Кароткая характарыстыка, адметнасці, цікавыя факты з жыцця і кар'еры.

** Знак «*» пасля даты пачатку выступу за клуб азначае, што футбаліст на момант падрыхтоўкі гэтай кнігі да друку працягваў выступаць за гэтую каманду. Звесткі пра колькасць праведзеных гульняў і забітых галоў прыведзены па стане на 09.07.2006. Іншыя звесткі – па стане на 01.07.2006.

81 гульня). За зб. Італіі (1936-41) згуляў 24 гульні. Найлепшы брамнік ЧС 1938. Меў мянушку «Кот-чараўнік». Працаваў трэнерам у клубах «Удзінэзэ» (1948-50, 1952-53), «Інтэр», Мілан (1950-51), «Трыесціна» (1957-59), «Верона» (1959-60).



**АЛОНСА Нарберта Асвальда** (ALONSO Norberto Osvaldo). Аргентына. 04.01.1953. Паўабаронца. **ЧС 1978 (3-0)**. «Сан-Ларэнса», «Рывэр Плэйт» (1971-76, 1977-82, 1983-87, 299-133), «Алімпік», Марсэль, Фра. (1976, 17-3), «Велес Сарсфілд» (1982-83, 73-16). Уладальнік КЛ 1986 і МК 1986, чэмпіён Аргентыны 1975 (М), 1975 (Н), 1979 (М), 1980 (М), 1981 (Н), 1986. У чэмпіянаце Аргентыны згуляў 447 гульняў, забіў 163 галы. За зб. Аргентыны (1972-83) згуляў 18 гульняў, забіў 4 галы. Вельмі папулярны ў 1970-х у Паўднёвай Амерыцы футбаліст, выбітны дыспетчар гульні. Не карыстаўся, аднак, вялікім даверам у трэнера зб. Аргентыны МЕНОЦІ, з-за чаго, да прыкладу, на ЧС 1978 згуляў толькі 85 хвілін. Выступаў на турніры пад № 1, бо аргентынцы размеркавалі нумары паміж сабой у адпаведнасці з алфавітам.



**АЛЬГІН Хорхэ Марыё** (OLGUIN Jorge Mario). Аргентына. 17.05.1952. Абаронца. **ЧС 1978 (7-0)**. «Сан-Ларэнса», Б-А. (1971-79, 252-18), «Індэпэндзьентэ» (1980-84, 127-13), «Архентынас Хуніёрс», Б-А. (1984-88, 148-22). Уладальнік КЛ 1985. Чэмпіён Аргентыны 1972 (М), 1972 (Н), 1974 (Н), 1983, 1984, 1985 (Н). За зб. Аргентыны (1976-82) згуляў 60 гульняў. Удзельнік ЧС 1982 (5-0). Адзін з найлепшых стральцоў сярод футбалістаў-абаронцаў: у 529 гульнях у Д-1 (1971-88) забіў 53 галы. Узначальваў «Бічо», «Калон», «Альмагра», «Дэпарціва Эспаньёл», «Авіспа Фукуока», Яп., «Алаюэлэнсэ», Каста-Рыка (2003), «Сапрыса», Коста-Рыка (2003-04).



**АЛЬТАБЕЛІ Алясандра** (ALTOBELLI Alessandro). Італія. 28.11.1955. Нападнік. **ЧС 1982 (3-1)**. «Лаціна», Д-III, (1965-74, 28-7), «Брэшыя», Д-II, (1974-77, 1989-90, 108-33), «Інтэр» (1977-88, 317-128), «Ювентус» (1988-89, 20-4), «Леччэ», Д-II (1990-93, 76-19). Чэмпіён Італіі 1980, уладальнік Кубка Італіі 1978 і 1982. За зб. Італіі (1980-88) згуляў 61 гульню, забіў 25 галоў. Удзельнік ЧЕ 1980 і 1988, удзельнік ЧС 1986 (4-4). Выбітны італьянскі нападнік 1980-х. Найлепшы футбаліст краіны 1984. На няўдалым для італьянцаў ЧС 1986 быў адзіным у камандзе, хто забіваў галы. Аўтар 39 галоў у еўракубках, аніводнага з якіх, аднак, так і не выйграў. У Серыі «А» у 337 гульнях забіў 132 галы.



**АМАРЫЛДА Таварэс да Сільвейра** (AMARILDO Tavares da Silveira). Бразілія. 29.06.1939. Нападнік. **ЧС 1962 (4-3)**. «Фламенга» (1957), «Батафога» (1958-63, 238-135), «Мілан», Іта. (1963-67, 107-32), «Фіярэнціна», Іта. (1967-70, 62-16), «Рома», Іта. (1970-72, 33-10), «Васка да Гама» (1973-74). Чэмпіён Бразіліі 1974, чэмпіён Італіі 1969, уладальнік Кубка Італіі 1967, найлепшы стралец чэмпіяната штата Р-д-Ж 1961 (18). У Серыі «А» італьянскага футбола згуляў 208 гульняў, забіў 58 галоў. За зб. Бразіліі (1961-66) згуляў 23 гульні, забіў 6 галоў. Зрабіў сабе імя на ЧС 1962, калі замяніў траўмаванага ПЕЛЕ. Аўтар пераможнага гола ў фінале ў браму каманды Чэхасла-

вакіі. Узначальваў «Фіярэнціну-м» (1974-78), «Батафога-м» (1978-81), «Сорса», Д-5, Іта. (1981-83), «Эсперанс», Туніс (1985-87), «Рандзінэла», Д-4, Іта. (1987-88), «Турыс Торэ дэль Грэка», Д-4, Іта. (1988-90), «Аль-Айн», ААЭ (1992).



**АНДРАДЭ РАДРЫГЕС Віктор Пабла Карлас** (ANDRADE RODRIGUEZ Victor Pablo Carlos). Уругвай. 14.02.1927 – 19.05.1985. Паўабаронца. **ЧС 1950 (4-0)**. «Сэнтрал Эспаньёл», «Уондэрэрс», «Пеньяроль». Чэмпіён Уругвая 1953 і 1954. За зб. Уругвая (1947-57) згуляў 44 гульні. Удзельнік ЧС 1954 (5-0). Уладальнік КА 1956, удзельнік КА 1955. Пляменнік Хасэ АНДРАДЭ – чэмпіёна свету 1930 г. За сваю кар'еру ані разу не папярэджваўся і не выдаляўся з поля.



**АНДРАДЭ Хасэ Леандра** (ANDRADE Jose Leandro). Уругвай. 22.11.1901 – 01.10.1957. Паўабаронца. **ЧС 1930 (4-0)**. «Пеньяроль» (1920, 1932-35), «Мірамар Місьёнэс» (1921), «Белья Віста» (1922, 1924, 1936), «Рэформэрс» (1923), «Насьяналь» (1925-31), «Атланта», Б-А., Арг. (1936) «Уондэрэрс» (1937). Чэмпіён Уругвая 1934. За зб. Уругвая (1923-1930) гуляў 33 гульні, забіў 1 гол. Найлепшы футбаліст ЧС 1930. Уладальнік КА 1923 і 1926, срэбны прызёр КА 1927, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1924 і 1928. За сваю кар'еру згуляў больш 800 гульняў, у час якіх забіў больш за 300 галоў. Лічыцца аўтарам удара, якія атрымаў назву «нажніцы». Першая цемнаскурая зорка футбола сусветнага маштабу. За віртуозную гульню і выбітную тэхніку меў мянушку «Чорная пантэра». Пасля сканчэння кар'еры працаваў танцоўшчыкам і спеваком у начных клубах Парыжу. Апошнія гады жыцця злоўжываў алкаголем. Памёр ад сухотаў у прытулку для бедных. Дзядзька Віктора АНДРАДЭ – чэмпіёна свету 1950 г.



**АНДРЭОЛА Мікеле (Мігель Анхел)** (ANDREOLO Michele (Miguel Angel). Італія. 06.09.1912 – 15.05.1981. Паўабаронца. **ЧС 1938 (4-0)**. «Насьяналь», Уру. (1933-35), «Балонья» (1935-43, 195-24), «Лацыё» (1943-45), «Напалі» (1945-48, 93-11), «Катанія», Д-ІІІ. Чэмпіён Уругвая 1933, 1934 і Італіі 1936, 1937, 1939, 1941. У складзе зб. Італіі (1936-42) згуляў 26 гульняў, забіў 1 гол. Натуралізаваны ў Італіі ўругваец, надзвычай тэхнічны гулец, адзін з лідараў зб. Італіі канца 1930-х.



**АНДЭРСАН Карэа ПОЛГА** (ANDERSON Correa POLGA). Бразілія. 09.02.1979. Абаронца. **ЧС 2002 (2-0)**. «Грэміё» (1999-2003, 38-4), «Спорцінг», Ліс., Парт. (2003-*, 85-0). Уладальнік Кубка Бразіліі 2001. За зб. Бразіліі (2002-2003) згуляў 11 гульняў, забіў 3 галы. У чэрвені 2006 працягнуў кантракт са «Спорцінгам» да 2009 г.



**АНРЫ Ц'еры** (HENRY Thierry). Францыя. 17.07.1977. Нападнік. **ЧС 1998 (6-3)**. INF, Клэрфантэйн (1990-92), «Вэрсаль» (1992-93), «Манако» (1994-02.99, 107-20), «Ювентус», Іта. (02.1999-07.99, 16-3), «Арсенал», Англ. (1999-*, 237-165). Чэмпіён Францыі 1997 і Англіі 2002 і 2004, уладальнік Кубка Англіі 2000, 2002, 2003 і 2005, Суперкубка Англіі 2002 і 2004, найлепшы стралец

чэмпіянату Англіі 2002 (24), 2004 (30), 2005 (25) і 2006 (27) За зб. Францыі (1997-2006) згуляў 85 гульняў, забіў 36 галоў. Срэбны прызёр ЧС 2006 (7-3), удзельнік ЧС 2002 (2-0). Чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧЕ 2004, уладальнік, найлепшы гулец і найлепшы стралец Кубка Канфедэрацый 2003. Надзвычай таленавіты нападнік, які імкліва зрабіў сабе імя пасля ўдалых выступаў на ЧС 1998 і ЧЕ 2000. Найлепшы футбаліст краіны 2000, найлепшы футбаліст Англіі 2003 па версіях журналістаў, Асацыяцыі прафесійных футбалістаў і заўзятараў! У 2004 другі раз запар быў прызнаны найлепшым футбалістам краіны па версіі ангельскай Асацыяцыі прафесійных футбалістаў. Уладальнік «Залатой бутсы» 2004 і 2005. На ЧС 2002 быў выдалены ў гульні супраць Уругвая.



**АНСЭЛЬМА Хуан Пелегрына** (ANSELMO Juan Pelegrino). Уругвай. 03.08.1904 – 27.10.1975. Нападнік. **ЧС 1930 (2-3)**. «Пеньяроль» (1922-35, 180-102). Чэмпіён краіны 1924, 1926, 1928, 1929 і 1932. Срэбны прызёр КА 1927, запасны на пераможных для Уругвая АГ 1928. Пасля сканчэння кар'еры гульца працаваў як трэнер (у тым ліку – як галоўны трэнер «Пеньяроля», разам з якім стаў чэмпіёнам краіны 1962).



**АНТАНЬЁНІ Джанкарла** (ANTOGNONI Giancarlo). Італія. 01.04.1954. Паўабаронца. **ЧС 1982 (6-0)**. «Асцімакобі», Д-III (1970-72, 27-4), «Фіярэнціна» (1972-87, 341-61), «Лазана», Швайц. (1987-88, 33-5). Уладальнік Кубка Італіі 1975. За зб. Італіі (1974-83) згуляў 73 гульні, забіў 7 галоў. Удзельнік ЧС 1978 (5-0) і ЧЕ 1980. Зорка італьянскага футболу, адзін з сімвалаў «Фіярэнціны». Найлепшы футбаліст Італіі 1974. Перад ЧС 1982 ледзь не памёр на футбольным полі пасля сутыкнення з брамнікам суперніка (выратаваў зроблены на месцы масаж сэрца). Пасля сканчэння кар'еры працаваў спартыўным дырэктарам «Фіярэнціны».



**АРДЗІЛЕС «Оссі» Асвальда Сэзар** (ARDILES «Ossi» Osvaldo Cesar). Аргентына. 03.08.1952. Паўабаронца. **ЧС 1978 (3-0)**. «Інстытута», Кардоба (1969-73, 14-3), «Бельграна», Кардоба (1974, 16-2), «Уракан», Б-А (1975-78, 113-11), «Тотэнхэм Хотспур», Англ. (1978-82, 1983-88, 237-16), «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра. (1982-83, 14-1), «Блэкбэрн Ровэрс», Англ. (1988-89, 5-0), «Куінз Парк Рэйнджэрс», Англ. (1989, 2-0), «Суіндан Таўн», Англ. (1989, 2-0). Уладальнік Кубка УЕФА 1984, Кубка Англіі 1981 і 1982. У чэмпіянаце Аргентыны згуляў 143 гульні, забіў 16 галоў. За зб. Аргентыны (1975-82) згуляў 61 гульню, забіў 12 галоў. Удзельнік ЧС 1982 (5-1), КА 1975. Адзін з вядучых гульцоў чэмпіёнаў свету 1978. Найлепшы футбаліст Англіі 1979. Пасля сканчэння кар'еры гульца ўзначальваў «Суіндан Таўн», Англ. (1991, гул. тр.), «Ньюкасл Юнайтэд», Англ. (1991-92), «Вэст Бромвіч Альбіён», Англ. (1992-93), «Тотэнхэм Хотспур», Англ. (1993-94), «Гвадалахара», Мекс. (1995), «Шымідзу Палс», Яп. (1996-98, найлепшы трэнер японскай J-Лігі 1998), «Дынама», Харв. (1999, чэмпіён краіны 2000), «Ёкагама Марынас», Яп. (12.1999-2000), «Аль Іцціхад», Сауд. Аравія (2001), «Рэсінг», Б-А (2002-2003), «Токіё Вэрдзі», Яп. (05.2003-05.2006, уладальнік Кубка Імператара 2005), «Бейтар», Ерусалім, Ізр. (05.2006-*).



**АРЛАНДА Пеканья дэ КАРВАЛЬЁ** (ORLANDO Pecanha de CARVALHO). Бразілія. 20.09.1935. Паўабаронца. **ЧС 1958 (6-0)**. «Васка да Гама» (1954-60, 1969), «Бока Хуніёрс» Арг., (1961-65, 120 гульняў), «Сантас» (1965-69). Чэмпіён Бразіліі 1966, чэмпіён штата Р-д-Ж 1956 і 1958, чэмпіён штата Сан Паула 1965 і 1967, чэмпіён Аргентыны 1962 і 1964. За зб. Бразіліі (1958-66) згуляў 29 гульняў. Срэбны прызёр КА 1959-I*, удзельнік ЧС 1966 (1-0). Пасля сканчэння кар'еры гульца стаў вядомым у Бразіліі трэнерам: узначальваў клубы «Васка да Гама», «Флунінэнсэ дэ Фэйра», «Амерыка», Санта Прэтэ, «Віторыя» Эштарыл, «Козма» (Кувейт) і інш.



**АРЫЯЛІ Габрыэле** (ORIALI Gabriele). Італія. 25.12.1952. Паўабаронца. **ЧС 1982 (5-0)**. «Інтэр» (1970-83, 277-33), «Фіярэнціна» (1983-87, 105-7). Чэмпіён Італіі 1971 і 1980, уладальнік Кубка Італіі 1978 і 1982. За зб. Італіі (1978-83) згуляў 28 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік ЧЕ 1980.



**АЎГЕНТАЛЕР Клаўс** (AUGENTHALER Klaus). ФРГ – Германія. 26.09.1957. Абаронца. **ЧС 1990 (7-0)**. «Вільсхофен» (1964-75), «Баварыя» (1975-91). Чэмпіён Германіі 1980, 1981, 1985, 1986, 1987, 1989 і 1990, уладальнік Кубка Германіі 1982, 1984 і 1986, Суперкубка Германіі 1983, 1987 і 1990. У бундэслізе згуляў 404 гульні, забіў 52 галы. За зб. ФРГ (1983-90) згуляў 27 гульняў. Срэбны прызёр ЧС 1986 (2-0). Найстарэйшы пераможца ЧС 1990. Зорка «Баварыі». Працаваў у трэнерскім штабе клуба (1991-97). Ачольваў аўстрыйскі «Грацэр АК» (1997-2000), «Нюрнберг» (2000-05.2003; вывеў каманду ў бундэслігу ў сезоне 2001/2002). У маі 2003 узначаліў леверкузэнскі «Баер», які пад кіраўніцтвам новага трэнера здолеў захаваць месца сярод нямецкай футбольнай эліты, а ў наступным сезоне прабіцца ў групавы турнір Лігі чэмпіёнаў. Звольнены ў верасні 2005 пасля няўдалага старту каманды ў чэмпіянаце краіны. У студзені 2006 ачоліў «Вольфсбург».



**АЎЕДА Мігель Анхел** (OVIEDO Miguel Angel). Аргентына. 12.10.1950. Паўабаронца. **ЧС 1978 (1-0)**. «Тальерэс», Кардоба (1974-1987, 366 гульняў), «Дэпарціва Арменіё». За зб. Аргентыны (1975-79) згуляў 10 гульняў. Дзеля атрымання тытулу чэмпіёна света гэтаму гульцу хапіла 5-ці хвілін удзелу ў турніры. Рэкардсмен «Тальерэса» па колькасці гульняў у чэмпіянатах краіны.



**БАГАСЯН Ален** (BOGHOSSIAN Alain). Францыя. 27.10.1970. Паўабаронца. **ЧС 1998 (5-0)**. «Алімпік-2», Марсэль, Д-III (1989-92, 78-12), «Істр», Д-II (1992-1993, 33-8), «Алімпік», Марсэль (1993-94, 28-2), «Напалі», Іта. (1994-97, 54-4), «Сампдорыя», Іта. (1997-98, 31-6), «Парма», Іта. (1998-2002, 68-7), «Эспаньёл», Ісп. (2002-2003, 5-0). Уладальнік Кубка УЕФА 1999 і Кубка Італіі 1999 і 2002. За зб. Францыі (1997-2000) згуляў 26 гульняў, забіў 2 галы. Запасны на ЧЕ 2000.

---

* У 1959 г. праводзіліся **два** розыгрышы КА. У кнізе яны азначаны як **1959-I** і **1959-II**.



**БАЙН Увэ** (BEIN Uwe). ФРГ — Германія. 26.09.1961. Паўабаронца. **ЧС 1990 (4-1)**. ТСВ, Лангерс (1968-75), «Херынген» (1975-78), «Кікерс», Офэнбах (1978-84, 34-14), «Кёльн» (1984-87, 64-16), «Гамбург» (1987-89, 52-22), «Айнтрахт», Ф-н-М. (1989-94, 123-39), «Урава Рэд Даймандс», Яп. (1994-96), «Гісэн» (1997-98), «Ашбах Бад Херсфельд» (2002). За зб. ФРГ (1989-93) згуляў 17 гульняў, забіў 3 галы. Зорка «Айнтрахта» канца 1980 – пач. 1990-х гадоў. Аўтар 91 гола ў бундэслізе (у 300 гульнях).



**БАЛЬЕСТРЭРА Энрыке** (BALLESTRERO Enrique). Уругвай. 18.01.1905 – 11.10.1969. Брамнік. **ЧС 1930 (4/-3)**. «Дублін» (1921), «Рампла Хуніёрс» (1923-35), «Пеньяроль» (1935-37). Чэмпіён Уругвая 1927, 1935, 1936 і 1937. За зб. Уругвая (1930-1937) згуляў 17 гульняў, у якіх прапусціў 25 галоў. Пераможца КА 1935, удзельнік КА 1937.



**БАРДЗАЛЫ Андрэа** (BARZAGLI Andrea). Італія. 08.05.1981. Абаронца. **ЧС 2006 (2-0).** «Рандзінэла», Д-4 (1998-2000, 2001, 64-4), «Пістаэзэ», Д-2 (2000-01.2001, 5-0), «Асколі», Д-3, Д-2 (2001-03, 46-3), «Кьева» (2003-04, 29-3), «Палерма» (2004-*, 71-5). За зб. Італіі (2004-2006) згуляў 10 гульняў. Бронзавы прызёр АГ 2000, чэмпіён Еўропы сярод мол. каманд 2004.



**БАРОНЭ Сімонэ** (BARONE Simone). Італія. 30.04.1978. Паўабаронца. **ЧС 2006 (2-0).** «Парма» (1996-98, 2002-04, 64-4), «Падова», Д-3 (1998-99, 28-5), «Альцана», Д-2 (1999-2000, 28-1), «Кьева» (2000-2002, 47-4), «Палерма» (2004-*, 71-5). За зб. Італіі (2004-2006) згуляў 15 гульняў, забіў 1 гол.



**БАРТЭС Фаб'ен** (BARTHEZ Fabien). Францыя. 28.07.1971. Брамнік. **ЧС 1998 (7/-2)**. «Стад» Лавелан (1983-91), «Тулуза» (1991-92, 26 гульняў), «Алімпік», Марсэль (1992-95, 2003-*, 180 гульняў), «Манако» (1995-2000, 143 гульні), «Манчэстэр Юнайтэд», Англ. (2000-2003, 62 гульні). Уладальнік КЕЧ 1993, чэмпіён Францыі 1993, 1997 і 2000 і Англіі 2001 і 2003. За зб. Францыі (1994-2006) згуляў 87 гульняў. Срэбны прызёр ЧС 2006 (7/-3), удзельнік ЧС 2002 (3/-3), чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧЕ 2004, запасны на ЧЕ 1996. Уладальнік Кубка Канфедэрацый 2003. Харызматычны футбаліст, здольны запаліць сваім настроем каманду. Адзін з кавалёў перамогаў французаў на ЧС 1998 і ЧЕ 2000. Вясной 2005 быў дыскваліфікаваны на 6 месяцаў за тое, што плюнуў у арбітра ў час таварыскага матча ў Марока.



**БАРЭЛЬ Фелічэ Пласіда** (BOREL Felice Placido). Італія. 05.04.1914 – 21.02.1993. Нападнік. **ЧС 1934 (1-0)**. «Ювентус», Турын (1932-46, 258-131), «Тарына» (1941-42, 7 галоў), «Напалі» (1946-47). «Алесандрыя» (1947-48), Чэмпіён Італіі 1933, 1934, 1935. Уладальнік Кубка Італіі 1938, 1942. Найлепшы стралец Серыі «А» 1933 (29) і

1934 (32). За зб. Італіі (1933-34) згуляў 3 гульні, забіў 1 гол. Адзін з самых наймалодшых чэмпіёнаў свету за ўсе часы. Добры стралец, які, аднак, так і не здолеў здабыць сталага месца ў складзе зб. Італіі. Усяго ў чэмпіянаце краіны ў 285 гульнях забіў 137 галоў. Рэкардсмен «Ювентуса» па колькасці галоў за сезон – 32 (1934).



**БАУЭР Ханс** (BAUER Hans). ФРГ. 28.07.1927 – 31.10.1997. Абаронца. **ЧС 1954 (2-0)**. «Баварыя». Уладальнік Кубка Германіі 1957. За зб. Германіі (1951-58) згуляў 5 гульняў (ва ўсіх быў капітанам каманды). Рэкардсмен «Баварыі» па колькасці гульняў у чэмпіянаце ФРГ (да стварэння бундэслігі) – 226 гульняў.



**БАЦІСТА Серхіё Даніэль** (BATISTA Sergio Daniel). Аргентына. 09.11.1962. Паўабаронца, абаронца. **ЧС 1986 (7-0)**. «Архенцінас Хуніёрс» (1981-88, 1991, 272-25), «Рывер Плэйт» (1988-90), «Чыкага Нуэвас» (1992, 5-0), «Тосу Фьючэрс», Яп. (1993-97), «Олд Бойз» (1997-99). Уладальнік КЛ 1985. Чэмпіён Аргентыны 1985. За зб. Аргентыны (1985-90) згуляў 39 гульняў. Срэбны прызёр ЧС 1990 (4-0). Удзельнік КА 1987, бронзавы прызёр КА 1989. Узначальваў уругвайскі «Белья Віста», «Тальерэс», «Архенцінас Хуніёрс» (2003-2005), «Чыкага Нуэвас» (12.2005). Зараз з'яўляецца трэнерам-дарадчыкам РУДЖЭРЫ ў «Сан Ларэнса».



**БАЧЫНІ Рыкарда Энрыке** (BOCHINI Ricardo Enrique). Аргентына. 25.01.1954. Паўабаронца. **ЧС 1986 (1-0)**. «Індэпэндзьентэ» (1972-92, 638-97). Уладальнік КЛ 1972, 1973, 1974, 1975 і 1984, МК 1973 і 1984. Чэмпіён Аргентыны 1977 (Н), 1978 (Н), 1983 (М), 1989. За зб. Аргентыны згуляў 28 гульняў. Удзельнік КА 1979. Адзін з найвыбітнейшых футбалістаў у гісторыі «Індэпэндзьентэ», рэкардсмен па колькасці гульняў за клуб. На ЧС 1986 быў найстарэйшым з аргентынцаў, якія выходзілі на поле. Пры гэтым за ўвесь турнір згуляў толькі 5 (!) хвілін (менш – 2 хв., згуляў толькі маладзейшы на адзін год ТРАБІЯНІ). Найлепшы футбаліст краіны 1983. Пяціразовы ўладальнік КЛ! Рэкардсмен сярод палявых гульцоў па колькасці гульняў у чэмпіянаце Аргентыны – 638!



**БЕАРДЗОТ Вінчэнца (Энца)** (BEARZOT Vincenzo (Enzo). Італія. 25.09.1927. Трэнер. **ЧС 1982**. Як абаронца выступаў за «Аёлу», «Про Гарыцыю» (1947-48), «Інтэр» (1948-51, 1956-57), «Катанію» (1951-54, 95-4), «Тарына» (1954-56, 1957-64, 229-8). Быў уладальнікам Кубка Італіі 1964. Згуляў 1 гульню за зб. Італіі (1955, супраць зб. Венгрыі). Узначальваў «Тарына» (1964-67), «Прата» (1968-69), быў другім трэнерам зб. Італіі (1970-77). У гэтай ролі браў удзел у ЧС 1970 і 1974. Галоўны тр. зб. Італіі (1977-86, 84=26-22). Браў удзел у ЧС 1978, заняў з камандай 4-е месца на ЧЕ 1980. Пайшоў у адстаўку пасля няўдалага для італьянцаў ЧС 1986. Славутая постаць сусветнага футболу. Выбітны трэнер, які стварыў зорную італьянскую зб. узору 1982. У 1982 г. часопісам «World Soccer» быў прызнаны найлепшым трэнерам свету.



**БЕБЕТА – дэ АЛІВЕЙРА Жазэ Раберта Гама** (BEBETO – de OLIVEIRA Jose Roberto Gama). Бразілія. 16.02.1964. Нападнік. **ЧС 1994 (7-3)**. «Фламенга» (1983-89, 1996, 284-141), «Васка да Гама» (1989-92, 2002, 38-15), «Дэпарціва», Ла-Карунья, Ісп. (1992-96, 131-86), «Севілья», Ісп. (10.1996-01.97, 5-0), «Віторыя дэ Байя» (1982, 1997, 2000-2001, 14 галоў), «Крузэйра» (1997-98, 1-0), «Батафога» (1998-1999, 74-36), «Торас Нэса», Мекс. (1999-2000, 8-2), «Касіма Энтлерс», Яп. (2000, 8-1), «Аль-Іцціхад», Сауд. Аравія (11.2002-12.2002, 3-1). Чэмпіён Бразіі 1983 і 1989. Уладальнік Кубка і Суперкубка Іспаніі 1995, найлепшы стралец чэмпіянатаў Бразіліі 1992 (17) і Іспаніі 1993 (30). Усяго ў Д-1 згуляў 536 гульняў, забіў 283 галы. За зб. Бразіліі (1985-98) згуляў 75 гульняў, забіў 39 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1998 (7-3), удзельнік ЧС 1990 (1-0). Уладальнік КА 1989, срэбны прызёр АГ 1988, бронзавы прызёр АГ 1996 (6-6, найлепшы стралец турніра разам з аргентынцам Крэспа). Найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1989 (па версіі уругвайскай газеты «Эль Паіс»), адзін з найлепшых бразільскіх футбалістаў канца XX-га ст. Уладальнік Bola de Prata 1992.



**БЕЛЕЦІ Жуліяна Хаус** (BELLETTI Juliano Haus). Бразілія. 20.06.1976. Абаронца. **ЧС 2002 (1-0)**. «Крузэйра» (1994-96, 22-0), «Сан Паула» (1996-98, 2000-2002, 54-4), «Атлетыка Мінэйра» (1999-2000, 9-4), «Вільярэал», Ісп. (2002-2004, 59-6), «Барселона», Ісп. (2004-*, 57-0). Уладальнік КЕЧ 2006 (аўтар пераможнага гола ў браму лонданскага «Арсенала»). Чэмпіён Іспаніі 2005 і 2006, уладальнік Суперкубка Іспаніі 2005. Чэмпіён штатаў Мінас Жэраіс 1994, 1996 і 1999 і Сан Паула 1998 і 2000. За зб. Бразіліі (2001-2005) згуляў 15 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік КА 2001. Уладальнік Кубка канфедэрацый 2005. Лаўрэат Bola de Prata 1999.



**БЕЛІНІ Хідэральда Луіс** (BELLINI Hideraldo Luiz). Бразілія. 07.06.1930. Абаронца. **ЧС 1958 (6-0)**. «Ітапірэнсэ», «Эспарціва» (1948-51), «Васка да Гама» (1952-57, 1959-62), «Сан Паула» (1963-68, 204 гульні), «Атлетыка», Парана (1968-69). За зб. Бразіліі (1957-66) згуляў 51 гульню. Удзельнік ЧС 1966 (2-0), срэбны прызёр КА 1959-І, запасны на ЧС 1962. Капітан зб. Бразіліі ва ўсіх сваіх гульнях на чэмпіянатах свету! Адзін з найлепшых абаронцаў у гісторыі бразільскага футбола. Скончыў кар'еру ў 39 гадоў. Заснавальнік першай у Бразіліі футбольнай школы.



**БЕРГОМІ Джузэпэ** (BERGOMI Giuseppe). Італія. 22.11.1963. Абаронца. **ЧС 1982 (3-0)**. «Інтэр», Мілан (1980-99, 519-23). Уладальнік Кубка УЕФА 1991, 1994 і 1998, чэмпіён Італіі 1989, уладальнік Кубка Італіі 1982 і Суперкубка Італіі 1989. За зб. Італіі (1982-98) згуляў 81 гульню, забіў 6 галоў. Удзельнік ЧС 1986 (3-0), бронзавы прызёр ЧС 1990 (7-0, капітан каманды), удзельнік ЧС 1998 (3-0), паўфіналіст ЧЕ 1988. Сімвал «Інтэру», рэкардсмен клуба па колькасці матчаў у Серыі «А». У няпоўных 19 гадоў стаў чэмпіёнам свету.



**БЕРТАЛІНІ Луіджы** (BERTOLINI Luigi). Італія. 13.09.1904 – 11.02.1977. Паўабаронца. **ЧС 1934 (4-0)**. «Савона» (1920-26), «Алесандрыя» (1926-31), «Ювентус» (1931-37, 137-5), «Цігулія», Раппала (1937-40). Чэмпіён Італіі 1932, 1933, 1934, 1935. За зб. Італіі (1929-35) згуляў 26 гульняў.



**БЕРТАЛЬД Томас** (BERTHOLD Thomas). ФРГ – Германія. 12.11.1964. Абаронца. **ЧС 1990 (7-0)**. «Кева», Вахенбюхэн (1974-76), «Хохштадт-Вахенбюхэн» (1976-78), «Айнтрахт», Ф-н-М. (1978-87, 117-17), «Верона», Іта. (1987-89, 52-2), «Рома», Іта. (1989-91, 62-3), «Баварыя» (1991-93, 30-1), «Штутгарт» (1993-2000, 189-4), «Аданаспор», Тур. (2000-2001, 5-0). Уладальнік Кубка Германіі 1997. За зб. ФРГ (1985-94) згуляў 62 гульні, забіў 1 гол. Срэбны прызёр ЧС 1986 (6-0), удзельнік ЧС 1994 (5-0), паўфіналіст ЧЕ 1988. У бундэслізе згуляў 332 гульні, забіў 22 галы. Усяго ў Д-1 згуляў 451 гульню, забіў 27 галоў. Генеральны мэнэджэр клуба «Фартуна», Дзюсельдорф.



**БЕРТОНІ Рыкарда Даніэль** (BERTONI Ricardo Daniel). Аргентына. 14.03.1955. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1978 (6-2)**. «Кільмес», Банья-Бланка, Д-ІІ (1971-72, 32-12), «Індэпэндзьентэ» (1972-78, 179-79), «Севілья», Ісп. (1978-80, 57-24), «Фіярэнціна», Іта. (1980-84, 97-27), «Напалі», Іта. (1984-86, 53-14), «Удзінэзэ», Іта. (1986-87, 20-1), «Авеліна», Іта. (1987-88). Уладальнік КЛ 1973, 1974 і 1975. Уладальнік МК 1973. Чэмпіён Аргентыны 1977 (Н), 1978 (Н). За зб. Аргентыны (1974-82) згуляў 38 гульняў, забіў 12 галоў. Удзельнік ЧС 1982 (5-2). Узначальваў «Лос Андэс» (2004). Галоўны трэнер «Індэпэндзьентэ».



**БІЛАРДА Карлас Сальвадор** (BILARDO Carlos Salvador). Аргентына. 16.03.1938. Трэнер. **ЧС 1986**. Гуляў нападнікам у камандах «Сан Ларэнса» (1955-63), «Дэпарціва Эспаньёл», Б-А. (1961-65), «Эстудзіянтэс» (1965-70, 208-13). Уладальнік КЛ 1968, 1969 і 1970. Уладальнік МК 1968. Чэмпіён Аргентыны 1967 (М). У Д-1 згуляў 178 гульняў, забіў 12 галоў. У складзе зб. Аргентыны браў удзел у АГ 1960. Узначальваў «Эстудзіянтэс»(1971-76, 1982, чэмпіён краіны 1982 (Н), 2003-2004, 305 гульняў), «Дэпарціва», Калі, Калумбія (1977-78, чэмпіён краіны 1977 (Н), 1978), «Сан Ларэнса» (1979, 32+10=13-9), зб. Калумбіі (1980-81, 23+10=6-7), зб. Аргентыны (1983-90, 81+28=30-23), «Севілью», Ісп. (1990-91, 1997), «Бока Хуніёрс» (1995-11.96, 42+19=11-12), зб. Лівіі (1999-2000). Удзельнік КА 1987, бронзавы прызёр КА 1989, срэбны прызёр ЧС 1990. Адзін з найлепшых трэнераў у гісторыі футбола. Найлепшы трэнер Паўднёвай Амерыкі 1986 і 1987 па версіі ўругвайскай газеты «Эль Паіс». Доктар па адукацыі.



**БЛАН Ларан** (BLANC Laurent). Францыя. 19.11.1965. Абаронца. **ЧС 1998 (5-1)**. «Манпелье» (1983-1991, 243-76), «Напалі», Іта. (1991-92, 31-6), «Нім» (1992-93, 29-1), «Сэнт-Эцьен» (1993-95, 70-18), «Асэр» (1995-96, 23-2), «Барселона», Ісп. (1996-97, 28-1), «Алімпік», Марсэль (1997-99, 63-13), «Інтэр», Іта. (1999-2001, 67-6), «Манчэстэр Юнайтэд», Англ. (2001-2003, 48-1). Уладальнік КУК 1997, чэмпіён Францыі 1996, чэмпіён Англіі 2001 і

2003, уладальнік Кубка Францыі 1990 і 1996. За зб. Францыі (1989-2000) згуляў 97 гульняў, забіў 16 галоў. Удзельнік ЧЕ 1992 і ЧЕ 1996, чэмпіён Еўропы 2000. Выдатны французкі абаронца, які пад канец кар'еры заслужана спазнаў смак перамогаў на ЧС 1998 (найстарэйшы пераможца турніру сярод французаў, якія выходзілі на поле) і ЧЕ 2000. Рэдка на якім турніры не забіваў галоў. Выдатна гуляў галавой, умела далучаўся да атакаў. Мае 6-ты вынік сярод абаронцаў па колькасці забітых галоў (95 у 506 гульнях) у Д-1 за ўсю гісторыю футбола па звестках IFFHS на 31.12.2005. У канцы 90-х легендай стаў яго традыцыйны пацалунак у лысіну брамніку БАРТЭСУ напярэдадні гульняў зб. краіны. У 1998 стаў аўтарам першага «Залатога гола», уведзенага ФІФА ў фінальных частках ЧС: на 113 хв. гульні прынёс перамогу французам у гульні супраць Парагвая. У 2004 быў адным з прэтэндэнтаў на пасаду галоўнага трэнера зб. Францыі.



**БОЛ Алан Джэймс** (BALL Alan James). Англія. 12.05.1945. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1966 (4-0)**. «Фарнвот» (1955-62), «Болтан Уондэрэрс» (1962-65), «Блэкпул» (1965-67, 1980, 146-46), «Эвертан» (1967-71, 208-66), «Арсенал» (1971-76, 177-48), «Саўтгемптан» (1976-79, 1980-82, 195-11), «Філадэльфія», ЗША (1978-79, 34-5) «Ванкувер Уайткэпс», Канада (1979-80, 38-10), «Брысталь Ровэрс» (1983, гул. тр.), «Портсмут» (1984-89, гул. тр.). Чэмпіён Англіі 1970. Усяго ў чэмпіянаце Англіі згуляў 673 гульні, забіў 173 галы. За зб. Англіі (1965-76) згуляў 73 гульні, забіў 8 галоў. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968, удзельнік ЧС 1970 (4-0). Універсальны футбаліст, зорка зб. Англіі 1960–1970-х гадоў. Пасля сканчэння кар'еры трэнераваў «Сток Сіці» (1989-91), «Эксэтэр» (1991-94), «Саутгемптан» (01.1994-95), «Манчэстэр Сіці» (1995-09.96).



**БОНХАФ Райнэр** (BONHOF Rainer). ФРГ. 29.03.1952. Паўабаронца. **ЧС 1974 (4-1)**. SuS «Эмэрых» (1964-70), «Барусія», Мёнхенгладбах (1970-78), «Валенсія», Ісп. (1978-80, 61-10), «Кёльн» (1980-82), «Герта» (1982-83). Уладальнік Кубка УЕФА 1975 і КУК 1980, чэмпіён ФРГ 1971, 1975, 1976 і 1977. За зб. ФРГ (1972-81) згуляў 53 гульні, забіў 9 галоў. Удзельнік ЧС 1978 (6-0), срэбны прызёр ЧЕ 1976. У бундэслізе згуляў 311 гульняў, забіў 57 галоў. Мае галандскія карэнні – нямецкае грамадзянства атрымаў толькі ў 1967. Пасля сканчэння кар'еры працаваў з «Баерам» з Юрдзінгена (1989-90) і «Барусіяй» з Мёнхенгладбаха (1998-99). Узначальваў юнацкую зб. Германіі (1990-98), СК «Кувейт», Кувейт (2001) і моладзевую зб. Шатландыі (2002-2005).



**БОРГІ Клаўдзіё Даніэль** (BORGHI Claudio Daniel). Аргентына. 28.09.1964. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1986 (2-0)**. «Архенцінас Хуніёрс» (1981-87, 55-9), «Кома», Іта. (1987-88, 7-0), «Ксамакс», Швайц. (1988-11.1988), «Рывер Плэйт», (11.1988-89), «Фламенга», Бра. (1989-90), «Індэпэндзьентэ» (1990), «Уніён», Санта Фэ (1990-91, 12-1), «Уракан», Б-А (1991-92, 7-0), «Кола-Кола», Чылі (1992), «Платэнсэ» (1992-93, 12-0), «Карэкамінас», Мекс. (1994), «О'Хігінс Ранкагуа», Чылі (1995), «Одакс Італьяна», Чылі (1995), «Санц'яга Уондэрэрс», Чылі (1998-99). Уладальнік КЛ 1985. Чэмпіён Аргентыны 1985. За зб. Аргентыны згуляў 6 гульняў, забіў 1 гол. Наймалодшы

з чэмпіёнаў свету 1986. Узначальваў чылійскія клубы «Одакс Італьяна» і «Кола Кола».



**БРАЙТНЕР Пауль** (BREITNER Paul). ФРГ. 05.09.1951. Абаронца. **ЧС 1974 (7-3)**. «Кольбермор» (1957-61), «Фрайласінг» (1961-70), «Баварыя» (1970-74, 1978-83, 216-83), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1974-77, 84-10), «Айнтрахт», Браўншвайг (1977-78, 30-10). Уладальнік КЕЧ 1974, чэмпіён ФРГ 1972, 1973, 1974, 1980, 1981. Уладальнік Кубка ФРГ 1971 і 1982. Чэмпіён Іспаніі 1975 і 1976, уладальнік Кубка Іспаніі 1976. За зб. ФРГ (1971-82) згуляў 48 гульняў, забіў 10 галоў. Чэмпіён Еўропы 1972. Срэбны прызёр ЧС 1982 (7-1). Зорка нямецкага футболу 1970– пач. 1980-х гадоў. Найлепшы футбаліст краіны 1981. У бундэслізе згуляў 285 гульняў, забіў 93 галы. Усяго ў Д-І: 369 гульняў – 103 галы (5-ты вынік сярод абаронцаў за ўсю гісторыю футбола па звестках IFFHS на 31.12.2005). Трэці пасля бразільцаў ВАВА і ПЕЛЕ гулец, які забіваў галы ў фінальных матчах двух ЧС. Адзін з найлепшых крайніх абаронцаў у гісторыі нямецкага футболу.



**БРАНКА – Клаўдзіё Ібрахім Вас ЛЕАЛ** (BRANCO – Claudio Ibrahim Vaz LEAL). Бразілія. 04.04.1964. Абаронца. **ЧС 1994 (3-1)**. «Гуарані» (1981), «Флумінэнсэ» (1982-86, 1994), «Брэшыя», Іта. (1986-88, 50-4), «Порту», Парт. (1988-90, 60-7), «Джэнаа», Іта. (1990-93, 71-8), «Грэміё» (1993), «Карынціянс» (1994-01.95), «Фламенга» (01.1995-02.1996), «Мідлсбро», Англ. (02.1996-10.96, 9-0), «Ню-Ёрк/Ню-Джэрсі Метрастарс», ЗША (1997, 12-1). Чэмпіён Бразіліі 1984 і Партугаліі 1990. За зб. Бразіліі (1985-94) згуляў 72 гульні, забіў 9 галоў. Удзельнік ЧС 1986 (5-0) і 1990 (4-0), уладальнік КА 1989, срэбны прызёр КА 1991.



**БРАУН Хасэ Луіс** (BROWN Jose Luis). Аргентына. 10.11.1956. Абаронца. **ЧС 1986 (7-1)**. «Эстудзіянтэс», Ла-Плата (1975-82, больш 300 гульняў), «Атлетыка Насьяналь», Калумбія (1983-85), «Дэпарціва Эспаньёл», Б-А. (1985-86), «Брэст», Фра. (1986-87), «Мурсія», Ісп. (1987-88), «Рэсінг», Б-А. (1989-90), «Ланус» (1990-91). Чэмпіён Аргентыны 1982 (М) і 1983 (Н). За зб. Аргентыны (1983-89) згуляў 21 гульню, забіў 2 галы. Удзельнік КА 1983 і 1987, бронзавы прызёр КА 1989. Узначальваў «Альмагра» (2001, 27+9=7-11), «Чыкага Нуэвас» (2001, 11+3=4-4), балівійскі «Блумінг» (2002, 16+8=2-6), «Рафаэла», Д-ІІ (2004).



**БРЫТА – РУАС Эркулес дэ Брыта** (BRITO – RUAS Hercules de Brito). Бразілія. 09.08.1939. Абаронца. **ЧС 1970 (6-0)**. «Інтэрнасьёналь» (1957), «Фламенга» (1958-59, 1969-70), «Васка да Гама» (1960-69), «Крузэйра» (1970), «Батафога» (1971-73), «Карынціянс» (1974), «Атлетыка Мінэйра» (1975). Чэмпіён штата Сан Паула 1966. За зб. Бразіліі (1964-73) згуляў 45 гульняў. Удзельнік ЧС 1966 (1-0). Уладальнік Bola de Prata 1970.



**БРЭМЭ Андрэас** (BREHME Andreas). ФРГ – Германія. 09.11.1960. Абаронца. **ЧС 1990 (6-3)**. «Бармбек – Уленхорст» (196580), «Саарбрукен», Д-ІІ, (1980-81, 36-3), «Кайзэрслаўтэрн» (1981-86, 1993-98, 242-43), «Баварыя» (1986-88, 63-7), «Інтэр», Іта.

(1988-92, 85-8), «Рэал», Сарагоса, Ісп. (1992-93, 24-1). Уладальнік Кубка УЕФА 1991, чэмпіён Германіі 1987, чэмпіён Італіі 1989. За зб. ФРГ (1984-94) згуляў 86 гульняў, забіў 8 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1986 (5-0), удзельнік ЧС 1994 (5-0), ЧЕ 1984, срэбны прызёр ЧЕ 1992. Удзельнік АГ 1984. Адзін з найлепшых нямецкіх абаронцаў усіх часоў. У бундэслізе згуляў 301 гульню, забіў 50 галоў. Усяго ў Д-1 згуляў 451 гульню, забіў 62 галы. Узначальваў «Кайзэрслаўтэрн» (2000-2002) і «Унтэрхахінг», Д-II (09.2004-04.2005). Уваходзіць з 2005 у трэнерскі штаб «Штутгарта».



**БУРУЧАГА Хорхэ Луіс** (BURRUCHAGA Jorge Luis). Аргентына. 09.10.1962. Паўабаронца. **ЧС 1986 (7-2)**. «Арсенал», дэ Сарандзі (1980-81), «Індэпэндзьентэ» (1982-85, 1995-98, 266-80), «Нант», Фра. (1985-92, 85-19), «Валансьен», Фра. (1992-93). Уладальнік КЛ і МК 1984, чэмпіён Аргентыны 1983, чэмпіён Францыі 1986. У чэмпіянаце Аргентыны згуляў 235 гульняў, забіў 72 галы. За зб. Аргентыны (1983-90) згуляў 59 гульняў, забіў 13 галоў. Адзін з герояў ЧС 1986, аўтар пераможнага гола ў браму зб. ФРГ у фінале турніра. Срэбны прызёр ЧС 1990 (6-0). Удзельнік КА 1983, бронзавы прызёр КА 1989. Узначальваў «Дэфенса і Юстыцыя», Д-II (1999), «Лос Андэс», «Арсенал», Б-А. (2002-2005, 145+56=52-37), «Эстудзіянтэс» (2005-*).



**БУФОН Джанлуіджы** (BUFFON Gianluigi). Італія. 28.01.1978. Брамнік. **ЧС 2006 (7/-2).** «Парма» (1994-2001, 168 гульняў), «Ювентус» (2001-*, 153 гульні). Уладальнік Кубка УЕФА 1999, чэмпіён Італіі 2002, 2003, 2005 і 2006, уладальнік Кубка Італіі 1999 і Суперкубка Італіі 1999 і 2003. За зб. Італіі (1997-2006) згуляў 67 гульняў. Удзельнік ЧС 2002 (4/-5), запасны на ЧС 1998. Удзельнік ЧЕ 2004. У 2001 за 46 млн. долараў перайшоў у «Ювентус», стаўшы найдаражэйшым брамнікам свету. Лепшы брамнік свету 2003 і 2004 па версіі Міжнароднай Федэрацыі гісторыі і статыстыкі футбола. Лепшы брамнік ЧС 2006. Паходзіць з сям'і з спартыўнай традыцыяй: маці, Марыя Стэла Масока, была чэмпіёнкай Італіі ў кіданні дыска.



**БУХВАЛЬД Гвіда** (BUCHWALD Guido). ФРГ – Германія. 24.01.1961. Абаронца. **ЧС 1990 (7-0)**. «Ванвайль» (1969-77), «Пліцхаузэн» (1977-78), «Штутгартэр Кікерс», Штутгарт (1978-83), «Штутгарт» (1983-94, 325-28), «Урава Рэд Даймандс», Яп. (1994-97, 127-11), «Карлсруэ» (1998-99, 40-3). Чэмпіён Германіі 1984 і 1992. За зб. ФРГ (1984-94) згуляў 76 гульняў, забіў 4 галы. Удзельнік ЧС 1994 (3-0), АГ 1984, ЧЕ 1984, паўфіналіст ЧЕ 1988, срэбны прызёр ЧЕ 1992. Адзін з найлепшых нямецкіх абаронцаў апошняй чвэрці XX ст. У бундэслізе згуляў 334 гульні, забіў 28 галоў. Пасля сканчэння кар'еры – спартыўны дырэктар «Карлсруэ» (1999-2001). У 2004 узначаліў японскі клуб «Урава Рэд Даймандс» (уладальнік Кубка краіны 2006).



**БЬЯВАЦІ Амедэа** (BIAVATI Amedeo). Італія. 04.04.1915 – 22.04.1979. Нападнік. **ЧС 1938 (3-0).** «Балонья» (1925-34, 1935-48, 172-74), «Катанія» (1934-35). Чэмпіён Італіі 1937, 1939, 1941. За зб. Італіі (1938-47) згуляў 18 гульняў, забіў 8 галоў.



**БЭКЕНБАЎЭР Франц** (BECKENBAUER Franz). ФРГ — Германія. 11.09.1945. Паўабаронца, абаронца, трэнер. **ЧС 1974 (7-0), ЧС 1990**. «Мюнхен-1906» (1954-58), «Баварыя» (1958-77, 396-43), «Нью-Ёрк Космас», ЗША, (1977-80, 1983, 105-20), «Гамбург» (1980-82, 28-0). Уладальнік КЕЧ 1974, 1975, 1976, КУК 1967, МК 1976. Чэмпіён ФРГ 1969, 1972, 1973, 1974 і 1982, уладальнік Кубка ФРГ 1966, 1967, 1969 і 1971, чэмпіён NASL 1977, 1978, 1980. За зб. ФРГ (1965-77) згуляў 103 гульні, забіў 14 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1966 (6-4), удзельнік ЧС 1970 (5-1), чэмпіён Еўропы 1972, срэбны прызёр ЧЕ 1976. Адзін з найлепшых гульцоў у гісторыі футбола. Па версіі IFFHS заняў 3-е месца ў спаборы на вызначэнне найлепшых гульцоў XX ст. Уладальнік «Залатога мяча» 1972 і 1976, найлепшы футбаліст ФРГ 1966, 1968, 1974 і 1976, найлепшы футбаліст NASL 1977. У бундэслізе згуляў 424 гульні, забіў 44 галы. Пасля сканчэння кар'еры ўзначальваў зб. ФРГ (1984-90, 66+34=20-12 107:61). Пад яго кіраўніцтвам немцы сталі срэбранымі прызёрамі ЧС 1986, паўфіналістамі ЧЕ 1988, а таксама пераможцамі ЧС 1990. У 1990-91 ачольваў «Алімпік», Марсэль, Фра. У 1993-94 і 1996 узначальваў «Баварыю», якую зрабіў уладальніцай Кубка УЕФА 1996 і чэмпіёнам краіны 1994. Найлепшы трэнер свету 1990 па версіі «World Soccer». У красавіку 2004 быў прызнаны УЕФА другім пасля ЗІДАНА найлепшым футбалістам Еўропы за апошнія 50 гадоў. Адзіны ў свеце, хто заваяваў Кубак свету спачатку ў якасці капітана каманды, а затым яе трэнера. Прэзыдэнт «Баварыі» да 2001, пасля чаго ўзначаліў аргкамітэт па правядзенні ЧС 2006 у Германіі.



**БЭНКС Гордан** (BANKS Gordon). Англія. 30.12.1937. Брамнік. **ЧС 1966 (6/-3)**. «Мілквэй Сціл Уокс» (1953-54), «Роумарш Вэлфер» (1954-55), «Чэстэрфілд», Д-3 (1955-59), «Лэстэр Сіці» (1959-67, 293/-457), «Сток Сіці» (1967-73, 194/-265), «Форт Лаўдэрдэйл Страйкерс», ЗША (1977-78, 39/-67). За зб. Англіі (1963-72) згуляў 73 гульні, прапусціў 57 галоў. Удзельнік ЧС 1970 (3/-1), запасны на ЧС 1962. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968. Па версіі Міжнароднай асацыяцыі гісторыі і статыстыкі футбола другі пасля Яшына найлепшы футбольны брамнік XX-га стагоддзя. Найлепшы футбаліст Англіі 1972. У чэмпіянаце Англіі згуляў 510 гульняў. У 1973 патрапіў у аўтакатастрофу, у выніку якой страціў вока і вымушаны быў скончыць кар'еру гульца. Трэнераваў зб. Англіі-м., «Мортан», Шатл., «Форт Лаўдэрдэйл Страйкерс», ЗША, «Порт Уэл».



**ВАВА — Эдвальда ІСІДЗІЁ НЭТА** (VAVA – Edvaldo IZIDIO NETO). Бразілія. 12.11.1934 – 19.01.2002. Нападнік. **ЧС 1958 (4-5)**, **ЧС 1962 (6-4)**. «Спорт», Рэсіфэ (1948-51), «Васка да Гама» (1951-58), «Атлетыка», Мадрыд, Ісп. (1958-61), «Палмейрас» (1961-67), «Амерыка», Мекс. (1966, 1970), «Партугеза», (1968-69), «Сан-Дзіега Торас», ЗША (1968). За зб. Бразіліі (1955-64) згуляў 19 гульняў, забіў 13 галоў. Удзельнік АГ 1952 (найлепшы стралец турніра). Першы гулец, які вызначыўся галамі ў двух фінальных матчах чэмпіянатаў свету. Асыстэнт гал. тр. зб. Бразіліі на ЧС 1982. Працаваў трэнерам у Калумбіі, Бразіліі, Мексіцы.



**ВАЛЕНСІЯ Хасэ Даніэль** (VALENCIA Jose Daniel). Аргентына. 03.10.1955. Паўабаронца. **ЧС 1978 (4-0)**. «Атлетыка Хімнасія і Эсгрыма», Хухуй (1972-74), «Тальерэс», Кардоба (1974-85, 1986-88, 274-27), «Дэпарціва Унівэр», Кіта, Эквадор (1986), «Расарыё Сэнтрал» (1989-90). За зб. Аргентыны (1975-82) згуляў 39 гульняў, забіў 4 галы. Удзельнік ЧС 1982 (1-0). Браў удзел у КА 1975 і 1979.



**ВАЛЬДАНА Хорхэ Альберта Франсіска** (VALDANO Jorge Alberto Francisco). Аргентына. 04.10.1955. Нападнік. **ЧС 1986 (7-4)**. «Ньюэл'с Олд Бойс» (1972-75, 49-11), «Алавес», Ісп., Д-2 (1975-79), «Рэал», Сарагоса, Ісп. (1979-84, 143-46), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1984-87, 85-39). Уладальнік Кубка УЕФА 1985 і 1986. Чэмпіён Аргентыны 1974 (М) і Іспаніі 1986, 1987. У Д-1 згуляў 277 гульняў, забіў 97 галоў. За зб. Аргентыны (1981-86) згуляў 22 гульні, забіў 7 галоў. Удзельнік ЧС 1982 (2-0). Яркі аргентынскі нападнік, які амаль усю кар'еру адгуляў у Іспаніі, грамадзянства якой у рэшце і ўзяў. Трэнераваў «Тэнэрыфэ», Ісп. (1992-94), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1994-01.1996, чэмпіён краіны 1995), «Валенсію», Ісп. (1996-97). Да лета 2004 працаваў тэхнічным дырэктарам мадрыдскага «Рэала». У сакавіку 2006 цудам выжыў у авіякатастрофе ў гарах Мексікі.



**ВАЛЬТЭР Отмар** (WALTER Ottmar). Германія-ФРГ. 06.03.1924. Нападнік. **ЧС 1954 (5-4)**. «Кайзэрслаўтэрн» (1938-58, 275-295). Чэмпіён ФРГ 1951 і 1953. За зб. ФРГ (1950-56) згуляў 21 гульню, забіў 10 галоў. Ён і ягоны больш славуты брат Фрыц сталіся першай парай братоў–чэмпіёнаў свету.



**ВАЛЬТЭР Фрыдрых (Фрыц)** (WALTER Friedrich (Fritz). Германія-ФРГ. 31.10.1920 – 17.06.2002. Нападнік. **ЧС 1954 (6-3)**. «Кайзэрслаўтэрн» (1930-59, 379-306). Чэмпіён ФРГ 1951 і 1953, найлепшы стралец нямецкай лігі 1953 (38). За зб. ФРГ (1940-58) згуляў 61 гульню, забіў 33 галы. Удзельнік ЧС 1958 (5-0). Зорка нямецкага футболу. Капітан зб. ФРГ ў 30 гульнях, у тым ліку і на пераможным ЧС 1954. У чэмпіянатах Германіі-ФРГ згуляў 416 гульняў, забіў 381 гол. Узначальваў малавядомыя «Нойштадт-Кобург» (1960), «Альзэнборн» (1962-68). Імя Фрыца Вальтэра носіць з 1985 стадыён у Кайзэрслаўтэрне. Брат Отмара ВАЛЬТЭРА.



**ВАМПЕТА – Маркас Андрэ Бацiста дос САНТАС** (VAMPETA – Marcos Andre Batista dos SANTOS). Бразілія. 13.03.1974. Абаронца, паўабаронца. **ЧС 2002 (1-0)**. «Віторыя», Байя (1990-94, 04.2004-06.2004, 14-0), «ФСФ Эйндховен», Гал. (1994-95, 1996-98, 49-5), «Венло», Гал. (1995, 8-6), «Флумінэнсэ» (1995-96, 23-1), «Карынціянс» (1998-2000, 2002-3, 69-5), «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра (2000-01, 7-1), «Інтэр», Іта. (2000-12.2000, 1-0), «Фламенга» (2001-02, 16-1), «Кувейт Спорт Клуб», Кувейт (07.2004-04.2005), «Бразіленсэ» (04.2005-12.2005), «Гояс» (02.2006-*). Пераможца першага чэмпіянату света сярод клубных каманд (2000), чэмпіён Бразіліі 1998 і 1999, штатаў Сан Паула 1999, 2002, 2003 і Гояс 2006, чэмпіён Галандыі 1997, уладальнік Суперкубка Галандыі 1996 і 1997. За зб. Бразіліі

(1998-2002) згуляў 39 гульняў, забіў 2 галы. Уладальнік КА 1999, срэбны прызёр Кубка Канфедэрацый 1999. Уладальнік Bola de Prata 1998 і 1999.



**ВАРЭЛА – МУІНЬЁС ВАРЭЛА Абдуліё Хасінта** (VARELA – MUINOZ VARELA Obdulio Jacinto). Уругвай. 20.09.1917 – 02.08.1996. Паўабаронца, абаронца. **ЧС 1950 (4-1)**. «Хувентуд» (1936-38), «Уондэрэрс» (1937-43), «Пеньяроль» (1943-55). Чэмпіён Уругвая 1944, 1945, 1949, 1951, 1953, 1954. За зб. Уругвая (1939-1954) згуляў 49 гульняў, забіў 10 галоў. Удзельнік ЧС 1954 (3-1). Капітан каманды на абодвух турнірах. Уладальнік КА 1942, удзельнік КА 1939, 1941, 1945 і 1946. Культавая постаць уругвайскага футболу. Найстарэйшы аўтар галоў на ЧС 1950 і 1954.



**ВІДАЛЬ Эрнэста Хасэ** (VIDAL Ernesto Jose). Уругвай. 15.11.1921–13.06.1974. Нападнік. **ЧС 1950 (3-1)**. «Расарыё Сэнтрал», Арг., «Пеньяроль» (1944-53), «Фіярэнціна», Іта. (1953-55, 29-6), «Про Патрыя», Іта. (1955-56), «Насьяналь» (1956). Чэмпіён Уругвая 1944, 1945, 1949 і 1951. Нарадзіўся ў Італіі, выхоўваўся ў Аргентыне, здабыў славу ў Уругваі.



**ВІЕЙРА Патрык** (VIEIRA Patrick). Францыя. 23.06.1976. Паўабаронца. **ЧС 1998 (2-0)**. «Кан» (1993-95, 49-2), «Мілан», Іта. (11.1995-96, 1-0), «Арсенал», Англ. (1996-2005, 279-29), «Ювентус», Іта. (2005-*, 31-5). Чэмпіён Англіі 1998, 2002 і 2004, Італіі 2006. Уладальнік Кубка Англіі 1998, 2000, 2002, 2003 і 2005, Суперкубка Англіі 1999 і 2002. За зб. Францыі (1997-2006) згуляў 93 гульні, забіў 6 галоў. Срэбны прызёр ЧС 2006 (7-2), удзельнік ЧС 2002 (3-0). Чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧЕ 2004, уладальнік Кубка Канфедэрацый 2001. Нарадзіўся ў Сенегале. Цэнтральная постаць паўабароны зб. Францыі часоў яе трыюмфу. Найлепшы футбаліст Францыі 2001. З-за траўмы не дагуляў фінальную гульню на ЧС 2006, дзе быў адным з самых яркіх гульцоў.



**ВІЁЛА – Пауло Сержыё РОСА** (VIOLA – Paulo Sergio ROSA). Бразілія. 01.01.1969. Нападнік. **ЧС 1994 (1-0)**. «Карынціянс» (1988-90, 1991-95), «Сан-Жазэ», Сан Паула (1990), «Алімпія», Сан Паула (1991), «Валенсія», Ісп. (1995-96), «Палмейрас» (1996-98), «Сантас» (1998-99), «Васка да Гама» (1999-2002), «Газіянтэпспор», Тур. (2002-01.2004), «Гуарані» (01.2004-11.2004), «Байя» (01.2005-01.2006), «Сан Раймунда» (05.2006-*). Чэмпіён Бразіліі 2000. Уладальнік Кубка Бразіліі 1995, чэмпіён штата Сан Паула 1988 і 1995. Найлепшы стралец чэмпіяната Бразіліі 1998 (21). За зб. Бразіліі (1993-95) згуляў 8 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік КА 1993. На ЧС 1994 згуляў толькі 16 хвілінаў.



**ВІЛЬЯ Хуліё Рыкарда** (VILLA Julio Ricardo). Аргентына. 18.08.1952. Паўабаронца. **ЧС 1978 (2-0)**. «Кільмес» (1970-73, 1974), «Сан Марцін», Тукуман (1973), «Атлетыка», Тукуман (1974-76), «Рэсінг» (1977-78), «Тотэнхэм Хотспур», Англ. (1978-83, 132-18), «Астан Віла», Англ. (1983), «Маямі Страйкерс», ЗША (1983), «Дэпарціва», Калі, Калумбія (1984-85), «Дэфэнса і Юстыцыя» (1986-89). За зб. Ар-

гентыны (1975-78) згуляў 18 гульняў, забіў 1 гол. Працуе дарадчыкам прэзыдэнта міжнароднага агенцтва, якое займаецца трансферамі футбалістаў.



**ВІМЭР Херберт** (WIMMER Herbert). ФРГ. 09.11.1944. Паўабаронца. **ЧС 1974 (2-0)**. «Барусія», Аахен (1960-66), «Барусія», Мёнхенгладбах (1966-78). Уладальнік Кубка УЕФА 1975. Чэмпіён ФРГ 1970, 1971, 1975, 1976 і 1977, уладальнік Кубка ФРГ 1973. За зб. ФРГ (1968-76) згуляў 36 гульняў, забіў 4 галы. Чэмпіён Еўропы 1972. Срэбны прызёр ЧЕ 1976. Згуляў 366 гульняў у бундэслізе, забіў 52 галы.



**ГАЛЬВАН Луіс Адольфа** (GALVAN Luis Adolfo). Аргентына. 24.02.1948. Абаронца. **ЧС 1978 (7-0)**. «Тальерэс», Кардоба (1970-83, 1988), «Лома Нэгра», Алаварыя (1983-84), «Бельграна», Кардоба (1984-85), «Сэнтрал Нортэ», Салта (1985-86), «Балівар», Балівія (1986-87). Уладальнік КЛ 1973, 1974 і 1975. Уладальнік МК 1973. За зб. Аргентыны (1975-82) згуляў 34 гульні. Удзельнік ЧС 1982 (5-0). Ягоны брат Рубен быў сярод запасных на ЧС 1978.



**ГАЛЬЕГА Амерыка Рубен** (GALLEGO Américo Rubén). Аргентына. 25.04.1955. Паўабаронца. **ЧС 1978 (7-0)**. «Альянса Спорт», Расарыё, «Ньюэл'с Олд Бойс», Расарыё (1974-81, 265-25), «Рывэр Плэйт» (1981-88, 203-11). Уладальнік КЛ 1986. Уладальнік МК 1986. Чэмпіён краіны 1974 (М), 1981 (Н), 1986. У чэмпіянаце Аргентыны згуляў 340 гульняў, забіў 35 галоў. За зб. Аргентыны (1976-82) згуляў 73 гульні, забіў 3 галы. Удзельнік ЧС 1982 (4-0) і КА 1979. Адзін з найлепшых аргентынскіх гульцоў 1970-х гадоў. Пасля сканчэння кар'еры працаваў памагатым ПАСАРЭЛЫ ў «Рывер-Плэйце» і зб. Аргентыны, узначальваў «Рывэр Плэйт» (1994-2001; 109+63=32-14, чэмпіён Аргентыны 1994 (А) і 2000 (К), «Індэпэндзьентэ» (2002-03; 34+14=12-8, чэмпіён Аргентыны 2003 (А), «Ньюэл'с Олд Бойс» (2004-2005, чэмпіён Аргентыны 2004 (А), «Талука», Мекс. (05.2005).



**ГАМБЕТА Шуберт** (GAMBETTA Schubert). Уругвай. 14.04.1920–09.08.1991. Абаронца. **ЧС 1950 (2-0)**. «Сюд Амерыка», «Прагрэса», «Насьяналь» (1940-48, 1950-56), «Мільянарыс», Калумбія (1948-50), «Мар дэ Фонда». Чэмпіён Уругвая 1940, 1941, 1942, 1943, 1946, 1947, 1950, 1952, 1955. За зб. Уругвая (1941-52) згуляў 36 гульняў, забіў 3 галы. Уладальнік КА 1942, срэбны прызёр КА 1941, бронзавы прызёр КА 1947, удзельнік КА 1945. Адзін з трэнераў зб. Уругвая на ЧС 1954.



**ГАНСАЛЕС Маціяс** (GONZÁLEZ Matías) Уругвай. 06.08.1925 – 12.05.1984. Абаронца. **ЧС 1950 (4-0)**. «Серра», Мантэвідэа. За зб. Уругвая (1949-56) згуляў 31 гульню. Бронзавы прызёр КА 1953, удзельнік КА 1949. Вымушаны быў прапусціць ЧС 1954 з-за ранення, нанесенага нажом псіхічна хворага фаната пасля адной з таварыскіх гульняў напярэдадні турніра. Імя Маціяса ГАНСАЛЕСА нададзена аднаму са стадыёнаў у Мантэвідэа.



**ГАНСАЛЕС Хуан Карлас** (GONZÁLEZ Juan Carlos). Уругвай. 22.08.1924. Абаронца. **ЧС 1950 (2-0)**. «Пеньяроль» (1943-57). Чэмпіён Уругвая 1945, 1949, 1951, 1954.



**ГАРЫНЧА — Мануэль Франсіска дос Сантас** (GARRINCHA - Manoel Francisco dos Santos). Бразілія. 28.10.1933 – 21.01.1983. Нападнік. **ЧС 1958 (4-0)**, **ЧС 1962 (6-4)**. «Крузэйра», Петропаліс (1946), «Серрана», Петропаліс (1947), «Пау Грандэ» (1948-53), «Батафога» (1953-65, 608-245), «Карынціянс» (1966-67, 3-0), «Атлетыка», Баранкілья, Калумбія (1968, 1-0), «Фламенга» (1968-69), «Аларыя», Р-д-Ж (1972, 10-1). Чэмпіён штата Р-д-Ж 1957, 1961 і 1962. За зб. Бразіліі (1955-66) згуляў 50 гульняў, забіў 12 галоў. Удзельнік ЧС 1966 (2-1). Срэбны прызёр КА 1957 і 1959-I. Зорка сусветнага футболу. За сваю кар'еру ў 717 гульнях забіў 282 галы (у Д-1: 245-82). Па версіі IFFHS восьмы па сіле гулец у гісторыі футбола ў ХХ-м стагоддзі. Фенаменальны дрыблёр. Пасля перанесеных у дзяцінстве аперацый на назе меў асаблівую манеру рухацца па полі, якая нагадвала хаду птушкі гарынчы (адсюль і мянушка). Памёр у галечы ад алкагалізма.



**ГАРЭ Оскар Альфрэда** (GARRE Oscar Alfredo). Аргентына. 09.12.1956. Абаронца. **ЧС 1986 (4-0)**. «Ферра Карыл Аэстэ», Б-А. (1976-89, 1991-94, 581-16), «Уракан» (1989), «Хапаэль», Кфар-Саба, Ізр. (1990-91). За зб. Аргентыны (1983-88) згуляў 41 гульню. Удзельнік КА 1983. Узначальваў «Гімназію» (1999-2000), «Эстудзіянтэс», дэ Касэрас (2000-2001), «Ферра Карыл Аэстэ», «Гуачыпата», а таксама чылійскія клубы «Дэпарціва Кансэпсьён» і «Універсідад Католіка» (2004).



**ГАТУЗА Джэнара Іван** (GATTUSO Gennaro Ivan). Італія. 09.01.1978. Паўабаронца. **ЧС 2006 (6-0).** «Перуджа» (1995-97, 10-0), «Глазга Рэйнджэрс», Шатл. (1997-10.1998, 40-7), «Салернітана» (1998-99, 25-0), «Мілан» (1999-*, 203-5).Уладальнік КЕЧ 2003, СК 2003. Чэмпіён Італіі 2004, уладальнік Кубка Шатландыі 1999, Кубка Італіі 2003 і Суперкубка Італіі 2004. За зб. Італіі (2000-2006) згуляў 47 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік ЧС 2002 (2-0), ЧЕ 2004, АГ 2000. За жорсткую і ўчэпістую манеру гульні атрымаў мянушку «Звераня».



**ГЕСЦІДА Альвара** (GESTIDO Alvaro). Уругвай. 17.05.1907 – 18.01.1957. Абаронца. **ЧС 1930 (4-0)**. «Сальферына», «Пеньяроль». Чэмпіён Уругвая 1928, 1929, 1932, 1935, 1937, 1938. За зб. Уругвая (1927-40) згуляў 25 гульняў. Чэмпіён АГ 1928. Больш за дваццаць гадоў выступаў у складзе «Пеньяроля». Брат прэзыдэнта краіны Аскара ГЕСЦІДА.



**ГІВАРШ Стэфан** (GUIVARCH Stephane). Францыя. 06.09.1970. Нападнік. **ЧС 1998 (6-0)**. «Брэст» (1989-91, 16-2), «Генгам» (1991, 1992-95, 2001-02, 131-69), «Асэр» (1995-96, 1997-98, 1999-2002, 115-49), «Рэн» (1996-97, 36-22), «Ньюкасл Юнайтэд», Англ. (1998, 4-1), «Глазга Рэйнджэрс», Шатл. (10.1998-99, 14-5). Чэмпіён Францыі 1996, уладальнік Кубка Францыі 1996, найлепшы стралец

чэмпіяната Францыі 1998 (21), чэмпіён і ўладальнік Кубка Шатландыі 1999. Усяго ў Д-1 згуляў 316 гульняў, забіў 148 галоў. За зб. Францыі (1989-2000) згуляў 14 гульняў, забіў 1 гол. На ЧС 1998 прыехаў у якасці асноўнага форварда, аднак не здолеў забіць аніводнага гола. Няўдалымі сталіся спробы замацавацца ў складах «Ньюкасла» і «Глазга Рэйнджэрс», пасля чаго давялося вярнуцца на радзіму, дзе пакрысе пачаў аднаўляць сваю стралецкую славу. У 2002 г., аднак, з-за траўмаў скончыў кар'еру.



**ГІГЬЯ Альчыдэ Эдгарда** (GHIGGIA Alcide Edgardo). Уругвай. 22.12.1926. Нападнік. **ЧС 1950 (4-4)**. «Пеньяроль» (1940-53), «Рома», Іта. (1953-61, 201-19), «Мілан», Іта. (1961-62, 4-0), «Данубіё» (1962-68). Чэмпіён Уругвая 1945, 1949, 1951, 1953. Чэмпіён Італіі 1962. Уладальнік КК 1961. За зб. Уругвая (1950-52) згуляў 12 гульняў, забіў 4 галы. За зб. Італіі (1957-59) згуляў 5 гульняў, забіў 1 гол. Адзін з найлепшых правых нападнікаў у гісторыі ўругвайскага футбола. Нарадзіўся ў сям'і італьянскіх эмігрантаў. Пасля амаль 10 сезонаў у Італіі вярнуўся ў Паўднёвую Амерыку.



**ГРАБОЎСКІ Юрген** (GRABOWSKI Jurgen). ФРГ. 07.07.1944. Нападнік. **ЧС 1974 (6-1)**. «Бібрых» (1955-64), «Айнтрахт», Ф-н-М. (1964-80, 526-137). Уладальнік Кубка УЕФА 1980, уладальнік Кубка ФРГ 1974 і 1975. За зб. ФРГ (1966-74) згуляў 44 гульні, забіў 5 галоў. Запасны на ЧС 1966, бронзавы прызёр ЧС 1970 (5-0). Чэмпіён Еўропы 1972.



**ГРАЦЫЯНІ Франчэска** (GRAZIANI Francesco). Італія. 16.12.1952. Нападнік. **ЧС 1982 (7-1)**. «Арэцца» (1970-73, 48-11), «Тарына» (1973-81, 222-97), «Фіярэнціна» (1981-83, 52-14), «Рома» (1983-86, 57-12), «Удзінэзэ» (1986-88, 32-8). Чэмпіён Італіі 1976, уладальнік Кубка Італіі 1984 і 1986. Найлепшы стралец Серыі «А» 1977 (21). За зб. Італіі (1975-83) згуляў 64 гульні, забіў 23 галы. Удзельнік ЧС 1978 (3-0) і ЧЕ 1980. Зорка італьянскага футболу канца 1970-х – пач. 1980-х. Найлепшы футбаліст краіны 1976. У 353 гульнях у Серыі «А» забіў 130 галоў.



**ГРОСА Фабіё** (GROSSO Fabio). Італія. 28.01.1977. Абаронца. **ЧС 2006 (6-1).** «Кьеці», Д-4 (1998-2001, 68-17), «Перуджа» (2001-01.2004, 67-7), «Палерма» (01.2004-2006, 69-1), «Інтэр» (2006-*). За зб. Італіі (2003-2006) згуляў 23 гульні, забіў 2 галы. Адзін з галоўных герояў зб. Італіі на ЧС 2006: спачатку зарабіў пенальці ў 1/8 турніра ў сустрэчы з Аўстраліяй (за 4 сек. да канца асноўнага часу пры ліку 0-0 і пры колькаснай меншасці італьянцаў на полі), а затым забіў першы і рашаючы гол за хвіліну да канца дадатковага часу паўфінальнай гульні з немцамі! Дадамо да гэтага пераліку і рашаючы ўдар у серыі пенальці ў фінале супраць французаў!



**ГРЫЎЗ Джэймс Пітэр (Джымі)** (GREAVES James Peter (Jimmi). Англія. 20.02.1940. Нападнік. **ЧС 1966 (3-0)**. «Чэлсі» (1958-61, 157-124), «Мілан», Іта. (1961, 10-9), «Тотэнхэм Хотспур», Лондан (1961-71, 321-220), «Вэст Хэм Юнайтэд», Лондан

(1969-70, 38-13). Уладальнік КУК 1963. Чэмпіён Англіі 1961, уладальнік Кубка Англіі 1961, 1962, 1967. Найлепшы стралец чэмпіянатаў Англіі 1959 (33), 1961 (41), 1963 (37), 1964 (35), 1965 (29), 1969 (27). За зб. Англіі (1959-67) згуляў 57 гульняў, забіў 44 галы. Удзельнік ЧС 1962 (4-1) і КЕ 1964. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968. Рэкардсмен па колькасці галоў у чэмпіянатах Англіі – 357 у 516 гульнях. Усяго ў Д-1 гуляў 527 гульняў, забіў 366 галоў (11 вынік у свеце). У няпоўны 21 год ужо меў на сваім рахунку 100 галоў у чэмпіянатах Англіі, за што атрымаў мянушку «Залатое дзіця англійскага футбола». Першы, хто ў чэмпіянатах краіны забіў больш за 100 галоў у складзе двух розных клубаў. Толькі ў 2002 г. гэтае дасягненне паўтарыў Алан ШЫРЭР. Пры гэтым не заўсёды меў стабільнае месца ў зб. Англіі, што не перашкодзіла яму і там забіць 44 галы ў браму супернікаў. Даволі рана, у 31 год, скончыў кар'еру з-за празмернага захаплення алкаголем. Пасля доўгіх гадоў змагання з хваробай выйшаў пераможцам, стаўшы сябрам Таварыства ананімных алкаголікаў.



**ГУАІТА Энрыка Гансалес Лукас** (GUAITA Gonzales Enrique Lucas). Аргентына — Італія. 15.07.1910 – 02.05.1959. Нападнік. **ЧС 1934 (4-1)**. «Эстудзіянтэс», Арг. (1927-33, 1937-39, 91-45), «Рома», Іта. (1933-35, 61-42), «Рэсінг», Б.-А. (1935-37, 28 гульняў). Найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 1935 (28). У складзе зб. Аргентыны (1933-37) згуляў 4 гульні, забіў 1 гол і стаў пераможцам КА 1937. У 1933 г. атрымаў італьянскае грамадзянства. За зб. Італіі (1934-35) згуляў 10 гульняў, забіў 5 галоў. Меў мянушку «Чорны пірат». Неўзабаве пасля перамогі на ЧС 1934 уцёк на радзіму, бо не захацеў служыць у італьянскім войску. Пасля сканчэння кар'еры футбаліста (у 29 гадоў) пэўны час працаваў начальнікам турмы!



**ГУАРЫСІ Анфіладжына Маргес** (GUARISI Anfilogino Margues). Бразілія – Італія. 26.12.1905 – 08.06.1974. Нападнік. **ЧС 1934 (1-0)**. «Партугеза» (1922-24), «Паўлістана» (1924-29, 68-52), «Карынціянс», Бра. (1929-31, 1936-38), «Лацыё», Іта. (1931-36, 125-41), «Палестра Італьяна» (1940). Чэмпіён штата Сан Паула 1926, 1929, 1930, 1937, 1938. Найлепшы стралец чэмпіяната штата 1926 (16 галоў). За зб. Бразіліі (1925) згуляў 4 гульні, забіў 1 гол. За зб. Італіі (1932-34) згуляў 6 гульняў, забіў 1 гол.



**ДАРАДА Пабла** (DORADO Pablo). Уругвай. 22.06.1908 – 18.11.1978. Нападнік. **ЧС 1930 (3-2)**. «Белья Віста», Мантэвідэа, «Рывэр Плэйт», Арг. (1932-35). Самы малады чэмпіён свету 1930.



**ДЖАЛМА дос САНТАС** ( DJALMA dos SANTOS). Бразілія. 27.04.1929. Абаронца. **ЧС 1958 (1-0)**, **ЧС 1962 (6-0)**. «Парадэ Інглеза» (1940-48), «Партугеза» (1948-58, 453 гульні ў розных турнірах), «Палмейрас» (1958-68), «Атлетыка Паранаэнсэ», Курыціба (1969-72). Чэмпіён штата Сан Паула 1959, 1963 і 1966, а таксама штата Парана 1970. За зб. Бразіліі (1952-68) згуляў 98 гульняў, забіў 3 галы. Удзельнік ЧС 1954 (3-1) і 1966 (2-0). Срэбны прызёр КА 1953 і 1959-І, удзельнік КА 1956 і 1957. Зорка сусветнага футболу. Найлепшы правы абаронца свету свайго часу. Найстарэйшы ўдзельнік ЧС 1966.

Бацька гульца зб. Бразіліі і многіх вядомых клубаў ДЖАЛМІНЫ.



**ДЖАРКАЕФ Юры** (DJORKAEFF Youri). Францыя. 09.03.1968. Паўабаронца. **ЧС 1998 (7-1)**. «Грэнобль» (1984-89, 91-23), «Страсбур», Д-II (1988-11.1990, 32-25), «Манако» (11.1990-95, 155-60), «Пары Сэн-Жэрмэн» (1995-96, 35-13), «Інтэр», Іта. (1996-99, 87-30), «Кайзэрслаўтэрн», Герм. (1999-02.2002, 55-14), «Болтан Уондэрэрс», Англ. (02.2002-2004, 75-20), «Блэкбэрн Ровэрс», Англ. (09.2004-12.2004, 3-0), «Нью-Ёрк/Нью-Джэрсі Метрастарс», ЗША (04.2005-12.2005, 26-11). Уладальнік КУК 1996, Кубка УЕФА 1998, Кубка Францыі 1991. Найлепшы стралец чэмпіяната Францыі 1994 (20). За зб. Францыі (1993-2002) згуляў 82 гульні, забіў 28 галоў. Удзельнік ЧЕ 1996, чэмпіён Еўропы 2000. Удзельнік ЧС 2002 (2-0). Зорка еўрапейскага футболу канца 1990-х гадоў. Адзін з аўтараў перамогаў зб. Францыі на ЧС 1998 і ЧЕ 2000. Сын Жана ДЖАРКАЕФА, які таксама з поспехам выступаў за зб. Францыі.



**ДЖЫЛАРДЗІНА Альберта** (GILARDINO Alberto). Італія. 05.07.1982. Нападнік. **ЧС 2006 (5-1).** «Пьячэнца» (1997-98, 17-3), «Верона» (2000-02, 39-5), «Парма» (2002-2005, 96-50), «Мілан» (2005-*, 34-17). За зб. (2004-2006) згуляў 20 гульняў, забіў 8 галоў. Бронзавы прызёр АГ 2004, чэмпіён Еўропы сярод моладзевых каманд 2004, найлепшы стралец гэтага турніра (4 галы).



**ДЖЭНЦІЛЕ Клаўдзіё** (GENTILE Claudio). Італія. 27.09.1953. Абаронца. **ЧС 1982 (6-0)**. «Варэзэ» (1970-71, 1972-73, 34-1), «Арона», Д-III (1971-72, 34-4), «Ювентус» (1973-84, 283-9), «Фіярэнціна» (1984-87, 70-0), «Пьячэнца» (1987-88, 20-0). Уладальнік КУК 1984 і Кубка УЕФА 1977, Суперкубка 1984. Чэмпіён Італіі 1975, 1977, 1978, 1981, 1982 і 1984, уладальнік Кубка Італіі 1979 і 1983. За зб. Італіі (1975-84) згуляў 71 гульню, забіў 1 гол. Удзельнік ЧС 1978 (7-0) і ЧЕ 1980. Майстар персанальнай апекі. Вызначаўся надзвычай жорсткай, часам грубай гульнёй. З 1998 працаваў асістэнтам гал. тр. зб. Італіі-м. У 2000 узначаліў гэтую каманду і зрабіў яе чэмпіёнам Еўропы 2004 і бронзавым прызёрам АГ 2004.



**ДЗАКАРДА Крысціян** (ZACCARDO Cristian). Італія. 21.12.1981. Абаронца. **ЧС 2006 (3-0).** «Балонья» (1999-2000, 2001-04, 79-2), «Спецыя», Д-3 (2000-01, 28-0), «Палерма» (2004-*, 71-2). За зб. Італіі (2004-2006) згуляў 15 гульняў, забіў 1 гол. Учыніў аўтагол у гульні супраць ЗША на ЧС 2006. Чэмпіён Еўропы сярод мол. каманд 2004.



**ДЗАМБРОТА Джанлука** (ZAMBROTTA Gianluca). Італія. 19.02.1977. Абаронца, паўабаронца. **ЧС 2006 (6-1).** «Кома» (1994-97, 48-6), «Бары» (1997-99, 59-6), «Ювентус» (1999-*, 217-6).Чэмпіён Італіі 2002, 2003, 2005 і 2006, уладальнік Суперкубка Італіі 2003. За зб. Італіі (1997-2006) згуляў 58 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік ЧС 2002 (4-0), срэбны прызёр ЧЕ 2000, удзельнік ЧЕ 2004 і АГ 2000.



**ДЗІДА — Эдвальда Алвес дэ Санта Роса** (DIDA – Edvaldo Alves de Santa Rosa). Бразілія. 16.03.1934 – 12.09.2002. Нападнік. **ЧС 1958 (1-0)**. «Фламенга» (1954-64, 350-244), «Партугезэ» (1964-65), «Хуніёр», Баранкілья, Калумбія (1966-68). За зб. Бразіліі (1958-61) згуляў 6 гульняў, забіў 4 галы. Выбітны нападнік, які, аднак, застаўся ў цені Пеле і іншых зорных бразільскіх нападнікаў таго часу.



**ДЗІДЗІ — Валдзір Пэрэйра** (DIDI – Waldir Perreira). Бразілія. 08.10.1928 – 12.05.2001. Паўабаронца. **ЧС 1958 (6-1)**, **ЧС 1962 (6-0)**. «Рыё Бранка» (1944), «Лейсоэш» (1945), «Амерыка Кампас» (1946), «Мадурэйра» (1947-50, 32-8), «Флумінэнсэ» (1950-56, 134-51), «Батафога» (1956-58, 1960-62, 1964, 97-44), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1959-60, 19-6), «Веракрус», Мекс. (1964-66, 29-4). Чэмпіён штата Р-д-Ж 1951, 1957, 1961 і 1962. За зб. Бразіліі (1952-62) згуляў 68 гульняў, забіў 20 галоў. Удзельнік ЧС 1954 (3-2). Срэбны прызёр КА 1953, удзельнік КА 1957 і 1959-І. Зорка сусветнага футболу. За час выступаў у Д-1 згуляў 349 гульняў, забіў 130 галоў. Пасля сканчэння кар'еры гульца з поспехам працаваў у якасці трэнера: «Крыстал», Ліма, Перу (1962-64), «Атланта», Мехіка, Мекс. (1964-65), «Сан Паула» (1966-67), зб. Перу (1968-70, удзельнік ЧС 1970), «Рывер Плэйт», Арг. (1971-72), «Фенэрбахчэ», Тур. (1972-75), «Флумінэнсе» (1981-82), «Крузэйра» (1982).



**ДЗІНА Сані** (DINO Sani). Бразілія. 23.05.1932. Паўабаронца. **ЧС 1958 (2-0)**. «Палмейрас» (1949-50), «XV дэ Жау» (1951), «Камерсіал» (1952-54), «Сан Паула» (1955-60, 292 гульні), «Бока Хуніёрс», Арг., (1961, 14-4), «Мілан», Іта. (1961-64, 62-14), «Карынціянс» (1965-68, 115-32). Уладальнік КЕЧ 1963, чэмпіён Італіі 1962, чэмпіён штата Сан Паула 1957. За зб. Бразіліі (1957-66) згуляў 24 гульні, забіў 4 галы. Срэбны прызёр КА 1959-І, удзельнік КА 1957. Трэнераваў «Карынціянс», «Інтэрнасьёналь», «Палмейрас», «Фламенга», «Флумінэнсе», «Пеньяроль», Уру. (1978-81, чэмпіён краіны 1978 і 1979), «Бока Хуніёрс», Арг. (1984), «Курыціба» (1985, чэмпіён краіны 1985).



**ДЗІЯМЕД Бернар** (DIOMEDE Bernard). Францыя. 23.01.1974. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1998 (3-0)**. «Асэр» (1992-2000, 176-0), «Ліверпуль», Англ. (2000-2002, 2-0), «Аячо» (01.2003-2004, 49-9), «Крэтэйль», Д-2 (2004-2005, 12-4), «Клермон Фут», Д-2 (01.2006-*, 11-1). Уладальнік Кубка УЕФА 2000. Чэмпіён і ўладальнік Кубка Францыі 1996, уладальнік Кубка Англіі і Кубка Англійскай Лігі 2001. За зб. Францыі (1998) згуляў 8 гульняў.



**ДЗОФ Дзіна** (ZOFF Dino). Італія. 28.02.1942. Брамнік, трэнер. **ЧС 1982 (7/-6)**. «Удзінэзэ» (1961-63, 40/-54), «Мантова» (1963-67, 131/-85), «Напалі» (1967-72, 143/-110), «Ювентус» (1972-83, 330/-214). Уладальнік Кубка УЕФА 1977, чэмпіён Італіі 1973, 1975, 1977, 1978, 1981, 1982, уладальнік Кубка Італіі 1979 і 1983. За зб. Італіі (1968-83) згуляў 112 гульняў,

прапусціў 93 галы. Чэмпіён Еўропы 1968, запасны на ЧС 1970, удзельнік ЧС 1974 (3/-4) і 1978 (7/-6). Разам з камандай Італіі быў 4-м на ЧЕ 1980. Капітан каманды і найстарэйшы яе гулец на пераможным для Італіі ЧС 1982. Выбітная постаць італьянскага футболу, найстарэйшы пераможца ЧС (40 гадоў і 133 дні). У Серыі «А» згуляў 570 гульняў, у якіх прапусціў 430 галоў. Рэкардсмен па колькасці «сухіх» хвілін у гульнях за нац. зборную – 1143 у сезоне 1973-74. На працягу 11 сезонаў (1972-1983) гуляў у Серыі «А» без заменаў. Таленавіты трэнер і мэнэджэр. У 1984-86 працаваў трэнерам брамнікаў «Ювентуса», у 1986-88 кіраваў алімпійскай зб. Італіі, браў удзел у АГ 1988. У 1988-90 узначальваў «Ювентус», разам з якім перамог у Кубку УЕФА 1990. З 1990 да 1994 быў галоўным трэнерам, а ў 1995-98 – прэзыдэнтам «Лацыё». У 1998-2000 узначальваў зб. Італіі, якая стала срэбным прызёрам ЧЕ 2000. У студзені–верасні 2001 зноў трэнераваў «Лацыё». У пачатку 2005 часова ўзначальваў «Фіярэнціну». Кавалер Залатога ордэна ФІФА.



**ДЗЮГАРЫ Крыстоф** (DUGARRY Christophe). Францыя. 24.03.1972. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1998 (3-1)**. «Бардо», (1988-96, 01.2000-01.2003), «Мілан», Іта. (1996-96, 21-5), «Барселона», Ісп. (1997-98, 21-2), «Алімпік», Марсэль (1998-01.2000, 52-8), «Бірмінгем Сіці», Англ. (01.2003-03.2004, 30-6). Уладальнік Кубка Французкай Лігі 2002. За зб. Францыі (1994-2002) згуляў 55 гульняў, забіў 8 галоў. Удзельнік ЧЕ 1996, чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧС 2002 (3-0). Таленавіты гулец атакі, якога на працягу ўсёй кар'еры праследвалі траўмы.



**ДУНГА – Карлас Каэтана Бледорм ВЭРЫ** (DUNGA – Carlos Caetano Bledorm VERRI). Бразілія. 04.04.1964. Паўабаронца. **ЧС 1994 (7-0)**. «Інтэрнасьёналь» (1978-84, 1999-2000), «Карынціянс» (1984-85), «Сантас» (1986), «Васка да Гама» (1987), «Піза», Іта. (1987-88, 23-2), «Фіярэнціна», Іта. (1988-92, 122-10), «Пяскара», Іта. (1992-93, 23-3), «Штутгарт», Герм. (1993-95, 53-7), «Джубіла Івата», Яп. (1995-01.99). Чэмпіён штата Сан Паула 1984 і штата Р-д-Ж 1986, чэмпіён японскай Джэй-лігі 1997. За зб. Бразіліі (1982-99) згуляў 91 гульню, забіў 6 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1998 (7-0), удзельнік ЧС 1990 (4-0). Уладальнік КА 1989 і 1997, срэбны прызёр КА 1995. Срэбны прызёр АГ 1984. Лідэр паўабароны зб. Бразіліі 90-х гадоў XX-га ст. Трэці ў гісторыі футбаліст, які двойчы выводзіў сваю каманду на фінальныя матчы ў ролі капітана. Удалым, аднак, быў толькі ЧС 1994. Найлепшы футбаліст Японіі 1997. Па сканчэнні кар'еры заснаваў у Порту-Алегры Інстытут Дунгі на карысць развіцця горада, які займаецца арганізацыяй дабрачыннай дапамогі хворым і бедным людзям.



**ДЭ РОСІ Даніэле** (DE ROSSI Daniele). Італія. 24.07.1983. Паўабаронца. **ЧС 2006 (3-0).** «Рома» (2000-*, 85-10). За зб. (2004-2006) згуляў 20 гульняў, забіў 3 галы. Бронзавы прызёр АГ 2004, чэмпіён Еўропы сярод моладзевых каманд 2004. На ЧС 2006 быў дыскваліфікаваны на 4 гульні за грубы ўдар локцем суперніка ў сустрэчы з камандай ЗША (адбыўшы дыскваліфікацыю, паспеў згуляць у фінале турніра). Наймалодшы гулец, які выходзіў на поле ў складзе італьянцаў на гэтым турніры.



**Дэ СОРДЗІ Нілтан** (De SORDI Nilton). Бразілія. 14.02.1931. Абаронца. **ЧС 1958 (5-0)**. «XV Піракікаба» (1951), «Сан Паула» (1951-64), «Уніаа», Бандэйрантэс (1965-66). Чэмпіён штата Сан Паула 1953 і 1957. За зб. Бразіліі (1955-61) згуляў 22 гульні. Удзельнік КА 1956. Рэкардсмен па колькасці гульняў за «Сан Паула» – 501.



**ДЭЛЬ П'ЕРА Алясандра** (DEL PIERO Alessandro). Італія. 09.11.1974. Нападнік. **ЧС 2006 (5-1).** «Падова» (1991-93, 14-1), «Ювентус» (1993-*, 331-134). Уладальнік МК 1996, КЕЧ 1996, СК 1996. Чэмпіён Італіі 1995, 1997, 1998, 2002, 2003, 2005 і 2006, уладальнік Кубка Італіі 1995 і Суперкубка Італіі 1995, 1997, 2003. За зб. Італіі (1995-2006) згуляў 79 гульняў, забіў 27 галоў. Удзельнік ЧС 1998 (4-0) і 2002 (3-1), срэбны прызёр ЧЕ 2000, удзельнік ЧЕ 1996 і 2004. Зорка італьянскага футболу мяжы стагоддзяў. Гулец з выдатнай тэхнікай, майстар рэалізацыі стандартных становішчаў. Найлепшы футбаліст МК 1996.



**ДЭМАРЫЯ Аціліё Хасэ** (DEMARIA Atilio Jose). Аргентына — Італія. 19.03.1909. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1934 (1-0)**. «Эстудзіанціль Парціьё», Б-А., Арг., «Інстытута», Кардоба, Арг., «Гімнасія і Эсгрыма», Арг., (1930, 1936-38), «Амбразіяна-Інтэр», Мілан (1931-36, 1938-43, 268-76), «Леньяна», Д-ІІІ (1945-46, 16-5), «Казэнца», Д-ІІ, (1946-48, 44-0). Чэмпіён Італіі 1940, уладальнік Кубка Італіі 1939. За зб. Аргентыны (1930-31) згуляў 3 гульні. Срэбны прызёр ЧС 1930 (1-0). За зб. Італіі (1932-40) згуляў 13 гульняў, забіў 3 галы.



**ДЭНІЛСАН дэ Алівейра** (DENILSON de Oliveira). Бразілія. 24.08.1977. Паўабаронца. **ЧС 2002 (5-0)**. «Сан Паула» (1995-98, 96-8), «Рэал Беціс», Ісп. (1998-2000, 2001-2005, 185-13), «Фламенга» (2000, 11-3), «Бардо», Фра. (2005-*, 31-3). За зб. Бразіліі (1997-2003) згуляў 61 гульню, забіў 9 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1998 (7-0). Уладальнік КА 1997, удзельнік КА 2001. У 1998 заключыў адзін з найдаражэйшых кантрактаў у гісторыі футбола, перайшоўшы за 35 млн. долараў у іспанскі «Беціс».



**ДЭСАІ Марсэль** (DESAILLY Marcel). Францыя. 17.09.1968. Абаронца. **ЧС 1998 (7-0)**. «Нант», (1986-92, 164-5), «Алімпік», Марсэль (1992-93, 46-1), «Мілан», Іта. (11.1993-98, 136-5), «Чэлсі», Англ. (1998-2004, 156-6), «Аль-Гарафа», Катар (10.2004-2005, 27-6). Уладальнік КЕЧ 1993 і 1994, Суперкубка 1994 і 1998, чэмпіён Францыі 1993, Італіі 1994 і 1996, Катара 2005. Уладальнік Кубка Англіі 2000 і Суперкубка Англіі 2000. За зб. Францыі (1993-2004) згуляў 116 гульняў, забіў 3 галы. Удзельнік ЧЕ 1996 і 2004, чэмпіён Еўропы 2000. Удзельнік ЧС 2002 (3-0). Нарадзіўся ў Гане. Адна з апораў абароны зб. Францыі ў часы яе росквіту ў канцы 1990-х. Стаў капітанам зборнай па сканчэнні выступаў Ларана БЛАНА.



**ДЭШАМ Дзідзье** (DESCHAMPS Didier). Францыя. 15.10.1968. Паўабаронца. **ЧС 1998 (6-0)**. «Нант», (1986-12.89, 103-3), «Алімпік», Марсэль (12.1989-90, 1991-94, 123-6), «Бардо» (1990-91, 37-3), «Ювентус», Іта. (1994-99, 117-4), «Чэлсі», Англ. (1999-2000, 27-0), «Валенсія»,Ісп. (2000-2001, 13-0). Уладальнік КЕЧ 1993 і 1996, СК 1996, МК 1996, чэмпіён Францыі 1992 і 1993, Італіі 1995, 1997 і 1998. Уладальнік Кубка Італіі 1995 і Кубка Англіі 2000, Суперкубка Англіі 2000. За зб. Францыі (1989-2000) згуляў 103 гульні, забіў 4 галы. Удзельнік ЧЕ 1992 і 1996, чэмпіён Еўропы 2000. Адзін з найлепшых французкіх футбалістаў другой паловы XX-га ст. Капітан зб. Францыі ў час яе найслаўнейшых перамогаў. Першы француз, які згуляў 100 гульняў за зб. сваёй краіны. Скончыў выступы за зб. пасля перамогі на ЧЕ 2000. Адразу ачоліў «Манако» (2001-09.2005), якое зрабіў срэбным прызёрам чэмпіяната краіны 2003 і вывеў у фінал Лігі чэмпіёнаў 2004.



**ЖАІРЗІНЬЁ – ВЕНТУРА ФІЛЬЁ Жаір** (JAIRZINHO – VENTURA FILHO Jair). Бразілія. 25.12.1944. Нападнік. **ЧС 1970 (6-7)**. «Батафога» (1961-74, 1981-82), «Алімпік», Марсэль, Фра. (1974-75, 18-9), «Крузэйра» (1975-76), «Партугеза», Венесуэла (1977), «Нараэстэ», Сан Паула (1978-79), «Фаст», ЗША (1979), «Нэшнл», ЗША (1979), «Хорхе Вільстэрман», Балівія (1980-81), «9 кастрычніка», Эквадор (1982). Уладальнік КЛ 1976. Пераможца чэмпіяната штатаў Р-д-Ж (1967 і 1968) і Мінас Жэраіс (1975), уладальнік Кубка Бразіліі 1968, чэмпіён Венесуэлы 1977 і Балівіі 1979. У розыгрышах КЛ (1963-81) забіў 23 галы ў 38 гульнях. За зб. Бразіліі (1963-82) згуляў 81 гульню, забіў 33 галы. Удзельнік ЧС 1966 (3-0), 1974 (7-2). Усяго на ЧС згуляў 16 гульняў (толькі ў адной сустрэчы быў заменены), у якіх забіў 9 галоў. Адзіны футбаліст, які забіваў галы на ўсіх стадыях аднаго з турніраў: на ЧС 1970 забіваў галы ва ўсіх гульнях, праведзеных яго камандай! Лічыцца, што менавіта Жаірзіньё першым адкрыў талент знакамітага РАНАЛЬДА. Увосень 2003 узначаліў зб. Габона, але быў звольнены ў верасні 2005 за нездавальняючыя вынікі.



**ЖАКЭ Эмэ** (JACQUET Aime). Францыя. 27.11.1941. Трэнер. **ЧС 1998**. У час кар'еры гульца выступаў за «Сэнт-Эцьен» (1960-73, чэмпіён краіны 1964, 1967, 1968, 1969, 1970, уладальнік Кубка Францыі 1968 і 1970) і «Алімпік», Ліён (1973-76). У чэмпіянаце краіны згуляў 212 гульняў, забіў 23 галы. Згуляў 2 гульні за зб. Францыі (1968). Узначальваў «Алімпік», Ліён (1976-80), «Бардо» (1980-89, чэмпіён краіны 1984, 1985, 1987, уладальнік Кубка Францыі 1986 і 1987), «Манпелье» (1989-90, уладальнік Кубка краіны 1990), «Нансі» (1990-91). Працаваў тэхнічным дырэктарам зб. Францыі (1992-93). З 1993 да 1998 – галоўны трэнер зб. Францыі (53+34=16-3). Пад яго кіраўніцтвам каманда брала ўдзел у ЧЕ 1996 і ЧС 1998. Пасля трыюмфальнай перамогі французаў на апошнім турніры пайшоў у адстаўку. Найлепшы трэнер Францыі 1981, 1984 і 1998. Мае найбольшы працэнт перамогаў у гульнях зборнай сярод трэнераў каманды Францыі (64,15%).



**ЖАРЖЫНЬЁ – Жоржэ Жазэ дэ Амарым КАМПАС** (JORGINHO – Jorge Jose de Amorim CAMPOS). Бразілія. 17.08.1964. Абаронца. **ЧС 1994 (7-0)**. «Амерыка», Р-д-Ж., «Фла-

менга» (1984-89), «Баер», Леверкузэн, Герм. (1989-92, 87-9), «Баварыя», Герм. (1992-95, 67-6), «Касіма Энтлерс», Яп. (1995-02.99), «Сан Паула» (1999), «Васка да Гама» (2000-01), «Флумінэнсэ» (2001, 2002-03). Чэмпіён Бразіліі 1987, Германіі 1994, Японіі 1997 і 1999, найлепшы футбаліст Японіі 1996. За зб. Бразіліі (1987-96) згуляў 64 гульні, забіў 3 галы. Удзельнік ЧС 1990 (4-0), срэбны прызёр КА 1995 і АГ 1988.



**ЖАЭЛ Антоніё Марцінс** (JOEL Antonio Martins). Бразілія. 23.11.1931 – 01.01.2003. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1958 (2-0)**. «Батафога» (1948-50), «Фламенга» (1951-58, 1962-63), «Валенсія», Ісп. (1959-61). Чэмпіён штата Р-д-Ж 1953, 1954 і 1955. За зб. Бразіліі (1957-61) згуляў 8 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік КА 1957. У складзе «Фламенга» згуляў 404 гульні, забіў 111 галоў.



**ЖУНІЁР – Жэнілсан Анжэла дэ Соза** (JUNIOR – Jenilson Angelo de Souza). Бразілія. 20.06.1973. Абаронца. **ЧС 2002 (1-1)**. «Байя» (1992-95, 19-0), «Палмейрас» (1995-12.2000, 94-3), «Парма», Іта. (12.2000-01.2004, 05.2004-2005, 87-3), «Сіена», Іта. (01.2004-05.2004, 12-0), «Сан Паула» (2005-*, 41-2). Уладальнік КЛ 2005. Пераможца чэмпіянату свету сярод клубаў 2005. Уладальнік Кубка Бразіліі 1998. За зб. Бразіліі (1996-2003) згуляў 16 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік КА 2001. Уладальнік Bola de Prata 1998.



**ЖУНІНЬЁ ПАУЛІСТА – Асвальда Жыролда ЖУНІЁР** (JUNINHO PAULISTA – Osvaldo Giroldo JUNIOR). Бразілія. 22.02.1973. Паўабаронца. **ЧС 2002 (5-0)**. «Ітуана» (1992-93), «Сан Паула» (1993-95, 44-1), «Мідлсбро», Англ. (1995-97, 1999-2000, 2002-2004, 125-28), «Атлетыка», Мадрыд, Ісп. (1997-1999, 55-13), «Васка да Гама» (2000-2001, 28-5), «Сэлцік», Шатл. (2004-04.2005, 14-1), «Палмейрас» (04.2005-*, 37-14). Уладальнік КЛ і МК 1993, чэмпіён Бразіліі 2000, уладальнік Кубка ангельскай лігі 2004. За зб. Бразіліі (1995-2004) згуляў 54 гульні, забіў 5 галоў. Срэбны прызёр КА 1995 (найлепшы футбаліст турніра), удзельнік КА 2001. Уладальнік Bola de Prata 2000 і 2005.



**ЖЫЛБЕРТА Апарэсіда да СІЛЬВА** (GILBERTO Aparecido da SILVA). Бразілія. 07.10.1976. Паўабаронца. **ЧС 2002 (7-0)**. «Амерыка», Мінас Жераіс (1997-99), «Атлетыка Мінэйра», Белу-Арызонці (1999-2002, 47-4), «Арсенал», Англ. (2002-*, 113-6). Чэмпіён штата Мінас Жэраіс 2000 і чэмпіён Англіі 2004, уладальнік Кубка Англіі 2003 і 2005, а таксама Суперкубка Англіі 2004. За зб. Бразіліі (2001-2006) згуляў 40 гульняў, забіў 3 галы. Удзельнік ЧС 2006 (4-0). Уладальнік Кубка канфедэрацый 2005. Аўтар самага хуткага гола ў Лізе Чэмпіёнаў – у 2002 забіў гол у браму «Эйндховена», калі секундамер паказваў 20,07 сек. ад пачатку гульні.



**ЖЫЛМАР дос Сантас Нэвес** (GILMAR dos Santos Neves). Бразілія. 22.08.1930. Брамнік. **ЧС 1958 (6/-4)**, **ЧС 1962 (6/-5)**. «Сантас» (1945-50, 1961-69), «Карынціянс» (1951-61). Уладальнік КЛ 1962 і 1963. Уладальнік МК 1962 і 1963. Чэмпіён штата Сан Паула 1951, 1952, 1954, 1961, 1962, 1964, 1965, 1967, 1968, 1969. За зб. Бразіліі (1953-69) згуляў 94 гульні. Удзельнік ЧС 1966 (2/-3). Срэбны прызёр КА 1953 і 1959-I, удзельнік КА 1956 і 1957. Найлепшы бразільскі брамнік усіх часоў. Пасля сканчэння кар'еры гульца трэнераваў брамнікаў «Сантаса». У 1968 г. выдаў кнігу, у якой змясціў найбольш цікавыя лісты (галоўным чынам – ад жанчын), якія атрымліваў за час кар'еры.



**ЖЭРСОН – НУНЬЕС Герсон дэ Алівейра** (GERSON – NUNES Gerson de Oliveira). Бразілія. 11.01.1941. Паўабаронца. **ЧС 1970 (4-1)**. «Фламенга» (1955-63), «Батафога» (1964-69, 1970), «Сан Паула» (1969-70, 1971, 93-12), «Флумінэнсэ» (1972-74, 57-4). За зб. Бразіліі (1961-72) згуляў 70 гульняў, забіў 14 галоў. Удзельнік АГ 1960. З-за пералому нагі не трапіў на ЧС 1962. Удзельнік ЧС 1966 (1-0). Адзін з найлепшых бразільскіх паўабаронцаў сярэдзіны XX ст. Пасля сканчэння кар'еры стаў журналістам.



**ЗАГАЛА Марыё Жоржэ Лоба** (ZAGALO Mario Jorge Lobo). Бразілія. 09.08.1931. Нападнік, трэнер. **ЧС 1958 (6-1)**, **ЧС 1962 (6-1)**, **ЧС 1970**. «Амерыка» (1942-46), «Фламенга» (1947-58), «Батафога» (1958-63). За зб. Бразіліі (1957-64) згуляў 33 гульні, забіў 5 галоў. Удзельнік КА 1959-I. Выбітны трэнер. Узначальваў «Батафога» (1966-69, 1977-78, чэмпіён штата Р-д-Ж 1967, 1968), зб. Бразіліі (1969-74, ЧС 1970, 4-е месца на ЧС 1974), «Флумінэнсэ» (1970-71), «Фламенга» (1971-76, 1985-87), зб. Кувэйта (1976-77, 1987-88), «Аль-Хілаль», Сауд. Аравія (1978-79), зб. Саудаўскай Аравіі (1979-85, удзельнік АГ 1984), зб. ААЭ (1989-90, вывеў каманду ў фінальную частку ЧС 1990), зб. Бразіліі (тэхнічны каардынатар, 1994-98, ЧС 1994, срэбны прызёр КА 1995, срэбны прызёр АГ 1996), «Партугеза» (1998-99). Пад кіраўніцтвам ЗАГАЛА зб. Бразіліі згуляла 140 гульняў (99 перамогаў, 30 нічыіх і 12 паразаў). Першы гулец, які стаў затым чэмпіёнам свету і ў якасці трэнера. Рэкардсмен па колькасці перамогаў сярод трэнераў нацыянальных каманд – 99 перамог са зб. Бразіліі. Быў у трэнерскім штабе зб. Бразіліі на ЧС 2006.



**ЗАЗІМА Алвес КАЛАСАНС** (ZOZIMO Alves CALAZANS). Бразілія. 19.06.1932 – 13.09.1977. Абаронца. **ЧС 1962 (6-0)**. «Сан-Крыставаа» (1951), «Бангу» (1951-65), «Фламенга» (1966), «Гуарацінгета» (1967). За зб. Бразіліі (1953-62) згуляў 35 гульняў, забіў 1 гол. Запасны на ЧС 1958. Удзельнік КА 1957 і АГ 1952.



**ЗІДАН Зінэдзін** (ZIDANE Zinedine). Францыя. 23.06.1972. Паўабаронца. **ЧС 1998 (5-2)**. «Кан» (1988-92, 61-6), «Бардо» (1992-96, 140-28), «Ювентус», Іта. (1996-2001, 171-24), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (2001-2006, 143-34). Уладальнік КЕЧ 2001, Суперкубка 1997 і 2002, МК 2002, чэмпіён Італіі 1997 і 1998, Іспаніі 2003, уладальнік Су-

перкубка Італіі 1997. За зб. Францыі (1994-2006) згуляў 108 гульняў, забіў 31 гол. Срэбны прызёр ЧС 2006 (6-3), удзельнік ЧС 2002 (1-0), ЧЕ 1996, чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧЕ 2004. Культавая постаць французкага футболу. Уладальнік «Залатога мяча» 1998, 2000 і 2003. У красавіку 2004 быў прызнаны УЕФА найлепшым футбалістам Еўропы за апошнія 50 гадоў. Аўтар двух галоў у браму бразільцаў у фінале ЧС 1998. Найлепшы футбаліст Францыі 1998. Самы каштоўны футбаліст Лігі чэмпіёнаў 2001/2002 па версіі УЕФА. З-за траўмы прапусціў две першыя гульні ЧС 2002, з-за чаго, на думку многіх спецыялістаў, французы не пераадолелі групавы этап турніра. Пасля няўдалага для французаў ЧЕ 2004 скончыў было кар'еру ў зборнай, але вярнуўся ўвосень 2005, каб дапамагчы ёй трапіць у фінальную частку ЧС 2006 і заваяваць там срэбныя медалі. Апошняя ў кар'еры гульня Зідана прыпала акурат на фінал турніра і была адзначаная спачатку забітым з пенальці голам, а затым азмрочаная выдаленнем у другім дадатковым тайме за удар галавой італьянца Матэрацы. Нягледзячы на гэты выпадак, быў прызнаны лепшым футбалістам ЧС 2006!



**ЗІНЬЁ – Крызам Сэзар Жуніёр дэ АЛІВЕЙРА** (ZINHO – Crizam Cesar Junior de OLIVEIRA). Бразілія. 17.06.1967. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1994 (7-0)**. «Фламенга» (1985-92, 01.2004), «Палмейрас» (1992-02.95, 1999, 2001-2003), «Ёкагама Марынас», Яп. (1995-97), «Грэміё» (2000-2001), «Крузэйра» (05.2003-12.2003), «Нова Ігуаса», Д-2. (04.2005-07.2005), «Маямі», ЗША (03.2006-*). Уладальнік КЛ 1999. Чэмпіён Бразіліі 1987, 1992, 1993, 1994 і 2003, уладальнік Кубка Бразіліі 1990, 1998 і 2001, чэмпіён штатаў Р-д-Ж (1986, 1991, 2004), Сан Паула (1993, 1994) і Рыё Грандэ да Сул (2001). За зб. Бразіліі (1989-97) згуляў 55 гульняў, забіў 7 галоў. Удзельнік КА 1993, срэбны прызёр КА 1995. Уладальнік Bola de Prata 1988, 1992, 1994 і 1997.



**ЗІТА – Жазэ Элі дэ МІРАНДА** (ZITO – Jose Eli de MIRANDA). Бразілія. 08.08.1932. Паўабаронца. **ЧС 1958 (4-0)**, **ЧС 1962 (6-1)**. «Таубатэ» (1951), «Сантас» (1952-65, 1967, 733-57), «Карынціянс» (1966). Уладальнік КЛ 1962 і 1963. Уладальнік МК 1963. Уладальнік Кубка Бразіліі 1961, 1962, 1963, 1964 і 1965. Чэмпіён штата Сан Паула 1956, 1958, 1960, 1961, 1962, 1963, 1964, 1965. За зб. Бразіліі (1955-63) згуляў 46 гульняў, забіў 3 галы. Удзельнік КА 1956, срэбны прызёр КА 1959-І. Запасны на ЧС 1966.



**ІЛГНЭР Бода** (ILLGNER Bodo). ФРГ – Германія. 07.04.1967. Брамнік. **ЧС 1990 (7/-5)**. «Бон-Хартберг», Бон (1981-85), «Кёльн» (1985-96, 326 гульняў), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1996-2001, 91 гульня). Уладальнік КЕЧ 1998 і 2000, МК 1998, чэмпіён Іспаніі 1997. За зб. ФРГ (1987-1994) згуляў 54 гульні. Срэбны прызёр ЧЕ 1992, удзельнік ЧС 1994 (5/-7). Найлепшы нямецкі брамнік першай паловы 1990-х, аднак, ягоная кар'ера заняпала пасля пераходу ў «Рэал».



**ІНДЗАГІ Філіпа** (INDZAGHI Filippo). Італія. 09.08.1973. Нападнік. **ЧС 2006 (1-1).** «Пьячэнца», Д-2 (1991-92, 1-0), «Леффэ», Д-3 (1992-93, 21-13), «Верона», Д-2 (1993-94, 36-13), «Парма» (1995-96, 15-2), «Аталанта» (1996-97, 33-24), «Ювентус»

(1997-2001, 120-57), «Мілан» (2001-2006*, 98-42). Уладальнік КЕЧ 2003. Чэмпіён Італіі 1998 і 2004, уладальнік Кубка Італіі 2003 і Суперкубка Італіі 1997. Лепшы стралец чэмпіяната Італіі 1997 (24). За зб. Італіі (1997-2006) згуляў 50 гульняў, забіў 22 галы. Удзельнік ЧС 1998 (2-0) і 2002 (2-0), срэбны прызёр ЧЕ 2000. Трапіў на свой трэці ЧС дзякуючы бліскучай гульні ў другой палове сезона 2005/06 (у тым ліку – у Лізе Чэмпіёнаў). Найстарэйшы з італьянцаў на гэтым турніры. Брат Сімонэ Індзагі, які таксама паспяхова гуляў у Серыі «А».



**ІРЫЯРТЭ Віктарыяна Сантас** (IRIARTE Victoriano Santos). Уругвай. 02.11.1902 – 10.11.1961. Нападнік. **ЧС 1930 (4-2)**. «Рэсінг Клуб», Мантэвідэа. За зб. Уругвая (1930-31) згуляў 5 гульняў, забіў 2 галы.



**КАБРЫНІ Антоніё** (CABRINI Antonio). Італія. 08.10.1957. Абаронца. **ЧС 1982 (7-1)**. «Крэманэзэ» (1967-75, 29-2), «Аталанта» (1975-76, 35-1), «Ювентус» (1976-89, 297-33), «Балонья» (1989-91, 55-2). Уладальнік КЕЧ 1985, КУК 1984, Кубка УЕФА 1977, СК 1984, і МК 1985, чэмпіён Італіі 1977, 1978, 1981, 1982, 1984 і 1986, уладальнік Кубка Італіі 1979 і 1983. За зб. Італіі (1978-87) згуляў 73 гульні, забіў 9 галоў. Разам з камандай Італіі быў 4-м на ЧС 1978 (7-0) і ЧЕ 1980. Удзельнік ЧС 1986 (4-0). Найлепшы футбаліст Італіі 1984. Адзін з найлепшых абаронцаў у Еўропе на мяжы 70-80-х. Уладальнік усіх самых прэстыжных міжнародных клубных кубкаў.



**КАКА – Рыкарда Ізэксан Сантас Лэйтэ** (КАКА – Ricardo Izecson Santos Leite). Бразілія. 22.04.1982. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 2002 (1-0).** «Сан Паула» (2001-2003, 55-22), «Мілан» (2003-*, 101-31). Чэмпіён Італіі 2004, уладальнік Суперкубка Італіі 2004. За зб. Бразіліі (2002-2006) згуляў 43 гульні, забіў 14 галоў. Наймалодшы чэмпіён свету 2002. Удзельнік ЧС 2006 (5-1). Уладальнік Кубка канфедэрацый 2005. Найлепшы футбаліст чэмпіяната Бразіліі 2002, уладальнік Bola de Prata 2002.



**КАЛАВАЦІ Фульвіё** (COLLOVATI Fulvio). Італія. 09.05.1957. Абаронца. **ЧС 1982 (7-0)**. «Мілан» (1975-82, 158-4), «Інтэр», Мілан (1982-86, 109-3), «Удзінэзэ» (1986-87, 1989-93, 92-2), «Рома» (1987-89, 45-1). Чэмпіён Італіі 1979, уладальнік Кубка Італіі 1977. За зб. Італіі (1979-86) згуляў 50 гульняў, забіў 3 галы. Разам з камандай Італіі быў 4-м на ЧЕ 1980. Удзельнік ЧС 1986 (1-0). Разам з ШЫРЭА складаў адну з найлепшых у Еўропе пару цэнтральных абаронцаў.



**КАЛАУСІ Луіджы (Джына)** (COLAUSSI Luigi (Gino). Італія. 04.03.1914 – 1991. Нападнік. **ЧС 1938 (3-4)**. «Itala дзі Градзіска», «Трыесціна» (1934-40), «Ювентус» (1940-42, 43-7), «Вічэнца» (1942-44, 37-18), «Падова» (1946-48, 45-13). За зб. Італіі (1935-40) згуляў 26 гульняў, забіў 15 галоў. Адзін з тых, хто зрабіў найбольшы ўнёсак у перамогу зб. Італіі на ЧС 1938.



**КАМАРАНЭЗІ Маура Герман** (CAMORANESI Mauro German). Італія. 04.10.1976. Паўабаронца. **ЧС 2006 (5-0).** «Альдасіві», Арг. (1994-95), «Сантас Лагуна», Мекс. (1996-97, 22-8), «Уондэрэрс», Уру. (1997, 6-1), «Банфілд», Арг., Д-2 (1997-98, 38-16), «Крус Асул», Мекс. (1998-2000, 78-32), «Верона» (2000-02, 50-7), «Ювентус» (2002-2006, 126-14). Чэмпіён Італіі 2003, 2005 і 2006. За зб. Італіі (2003-2006) згуляў 26 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік ЧЕ 2004. Аргентынец з італьянскімі карэннямі, дзякуючы якім здолеў атрымаць «прапіску» у зб. Італіі.



**КАНАВАРА Фабіё** (CANNAVARO Fabio). Італія. 13.09.1973. Абаронца. **ЧС 2006 (7-0).** «Напалі» (1992-95, 58-1), «Парма» (1995-2002, 212-4), «Інтэр» (2002-2004, 50-2), «Ювентус» (2004-*, 74-6). Уладальнік КУЕФА 1999, чэмпіён Італіі 2005 і 2006, уладальнік Кубка Італіі 1999 і 2002. За зб. Італіі (1997-2006) згуляў 100 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік ЧС 2002 (3-0), срэбны прызёр ЧЕ 2000, удзельнік ЧЕ 2004, а таксама АГ 1996. Адзін з найлепшых італьянскіх абаронцаў найноўшага часу, капітан зб. Італіі на ЧС 2006. Разам з Буфонам адгуляў усе 690 хв. на турніры. У спаборы за тытул лепшага гульца чэмпіяната саступіў толькі Зідану.



**КАНДЭЛЯ Венсан** (CANDELA Vincent). Францыя. 24.10.1973. Абаронца. **ЧС 1998 (1-0)**. «Тулуза», (1991-94, 29-1), «Тулуза», Д-ІІ (1994-95, 27-2), «Генгам» (1995-97, 48-2), «Рома», Іта. (01.1997-01.2005, 210-14), «Болтан Уондэрэрс», Англ. (01.2005-2005, 10-0), «Удзінэзэ», Іта. (2005-*, 19-1). Чэмпіён Італіі 2001. За зб. Францыі (1996-2003) згуляў 40 гульняў, забіў 2 галы. Чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧС 2002 (2-0) і АГ 1996.



**КАРЛАС АЛЬБЕРТА – ТОРРЭС Карлас Альберта** (CARLOS ALBERTO – TORRES Carlos Alberto). Бразілія. 17.07.1944. Абаронца. **ЧС 1970 (6-1)**. «Сантас» (1965-74, 445 гульняў), «Флумінэнсэ» (1964, 1975-76), «Батафога» (1971, 1982), «Космас», ЗША (1977-80, 145-8), «Каліфорнія Спёрс», ЗША (1981, 19-2). Пераможца чэмпіянатаў НАСЛ 1977 і 1978. За зб. Бразіліі (1964-77) згуляў 53 гульні, забіў 8 галоў. Капітан зб. Бразіліі на ЧС 1970. Трэнер «Фламенга» (1983-85, 2001-05.2002, чэмпіён Бразіліі 1983), «Карынціянс» (1985-86), «Клуб Науціка Карыбарыбэ» (1986-87), «Маямі Шаркс», ЗША (1987-93), «Батафога» (1993-94, 1997-98, 1999-2000, 11.2002-2003), «Флумінэнсэ» (1994-95), зб. Нігерыі (1995-97), «Атлетыка Мінэйра», Белу-Арызонці (1998-99), зб. Амана (03.2000-2001), «Дэспарціва Кабонфірэнсэ», Р-д-Ж. (2001), «Замалек», Егіпет (06.2002-10.2002), зб. Азербайджана (02.2004-06.2005). Чэмпіён штатаў Р-д-Ж (1984, 1995 і 2001) і Мінас Жэраіс (1999). Летам 2005 быў дыскваліфікаваны ФІФА на год за тое, што ў гульні зб. Азербайджана з Польшчай з кулакамі накінуўся на рэзервовага арбітра. У кастрычніку 2005 узначаліў бразільскі клуб «Пайсанду».



**КАРЭМБЁ Крысціян** (KAREMBEU Christian). Францыя. 03.12.1970. Паўабаронца. **ЧС 1998 (4-0)**. «Нант», (1991-95, 130-5), «Сампдорыя», Іта. (1995-98, 62-6), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (01.1998-2000, 51-1),

«Мідлсбро», Англ. (2000-2001, 33-4), «Алімпіякас», Грэ. (2001-2004, 68-3), «Сервэт», Швейц. (2004-01.2005, 12-0), «Басція» (01.2005-05.2005, 7-0). Уладальнік КЕЧ 1998 і 2000, чэмпіён Францыі 1995, Грэцыі 2002 і 2003. За зб. Францыі (1992-2002) згуляў 53 гульні, забіў 1 гол. Удзельнік ЧЕ 1996, чэмпіён Еўропы 2000. Нарадзіўся ў Новай Каледоніі, з поспехам гуляў у Францыі, Італіі, Іспаніі і Грэцыі. Найлепшы футбаліст Акіяніі 1995 і 1998.



**КАСТРА Эктар** (CASTRO Hector). Уругвай. 29.11.1904 – 15.09.1960. Нападнік. **ЧС 1930 (2-2)**. «Літа» (1920-24), «Насьяналь» (1924-32, 1933-39, 231-45), «Эстудзіянтэс» (1932-33). Чэмпіён Уругвая 1924, 1933, 1934. За зб. Уругвая (1924-35) згуляў 25 гульняў, забіў 20 галоў. Уладальнік КА 1926 і 1935, срэбны прызёр КА 1927, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1928. Адзіны чэмпіён свету – інвалід (страціў правую далонь і частку рукі ў няшчасным выпадку ў дзяцінстве, меў ад заўзятараў мянушку «Боскі ляўшун»). У чэмпіянаце Уругвая (1921-36) згуляў 181 гульню, забіў 107 галоў. З 1939 ўзначальваў «Насьяналь», разам з якім перамагаў у чэмпіянатах краіны 1940, 1941, 1942, 1943, 1952. Некалькі разоў ачольваў зборную Уругвая, у тым ліку на пераможным для краіны КА 1959-II.



**КАСТЭЛАЦЫ Арманда** (CASTELLAZZI Armando). Італія. 07.02.1904 – 04.01.1968. Паўабаронца. **ЧС 1934 (1-0)**. «Фіярэнціна», «Амбразіяна-Інтэр» (1926-36, 214-14). Чэмпіён Італіі 1930. За зб. Італіі (1929-34) згуляў 3 гульні. У 1936-1938 узначальваў «Амбразіяну-Інтэр». Чэмпіён Італіі 1938.



**КАУЗІЁ Франка** (CAUSIO Franco). Італія. 01.02.1949. Паўабаронца. **ЧС 1982 (2-0)**. «Леччэ» (1964-65, 1985-86, 29-3), «Санцібенэдэтта» (1965-66, 13-0), «Ювентус» (1966-68, 1970-81, 305-49), «Рэджана» (1968-69, 30-5), «Палерма» (1969-70, 22-3), «Удзінэзэ» (1981-84, 83-11), «Інтэр» (1984-85, 24-0), «Трыесціна», Д-ІІ (1986-88, 64-5). Уладальнік Кубка УЕФА 1977, чэмпіён Італіі 1972, 1973, 1975, 1977, 1978, 1981, уладальнік Кубка Італіі 1979. За зб. Італіі (1972-82) згуляў 63 гульні, забіў 6 галоў. Удзельнік ЧС 1974 (2-0), 1978 (7-1) і ЧЕ 1980. Найлепшы футбаліст Італіі 1971 і 1982. Перамога на ЧС 1982 стала бліскучым фіналам кар'еры аднаго з найлепшых італьянскіх гульцоў 70-х. Усяго ў Серыі «А» ў 434 гульнях забіў 63 галы. Усяго за кар'еру згуляў у Італіі 829 гульняў.



**КАФУ – Маркас Эвангеліста дэ МАРАЭС** (CAFU – Marcos Evangelista de MORAES). Бразілія. 19.06.1970. Абаронца. **ЧС 1994 (3-0)**, **ЧС 2002 (7-0)**. «Сетуба», «Насьяналь», «Сан Паула» (1989-94, 95-6), «Рэал», Сарагоса, Ісп. (01.1995-06.95, 16-0), «Палмейрас» (1995-97, 45-2), «Рома», Іта. (1997-2003, 163-5), «Мілан», Іта. (2003-*, 80-3). Уладальнік КЛ 1992 і 1993, МК 1992 і 1993, КУК 1995, чэмпіён штата Сан Паула 1989, 1991, 1992 і 1996, чэмпіён Бразіліі 1991, Італіі 2001 і 2004, уладальнік Суперкубка Італіі 2004. За зб. Бразіліі (1990-2006) згуляў 142 гульні, забіў 5 галоў. Срэбны прызёр КА 1991, удзельнік КА 1993, уладальнік КА 1997 і 1999, срэбны прызёр ЧС 1998 (6-0), удзельнік ЧС 2006 (4-0). Найлепшы футбаліст Бразіліі на сваёй пазіцыі (прыз Bola de Prata) 1992 і 1993, найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1994 (па

версіі газеты El Pais), адзін з найлепшых бразільскіх футбалістаў канца XX-га ст. Першы футбаліст, які згуляў у трох фінальных гульнях чэмпіянатаў свету. Рэкардсмен па колькасці гульняў за зб. Бразіліі.



**КВЯТКОЎСКІ Хайнрых (Хайнц)** (KWIATKOWSKI Heinrich (Heinz). ФРГ. 16.07.1926. Брамнік. **ЧС 1954 (1/-8)**. «Шальке-04», Гельзенкірхен (1947-50), «Рот-Вайс», Эсэн (1950-52), «Барусія», Дортмунд (1952-64, 310 гульняў, але з іх толькі 3 у бундэслізе). Чэмпіён ФРГ 1956 і 1957, уладальнік Кубка ФРГ 1965. За зб. ФРГ (1954-58) згуляў 4 гульні. Удзельнік ЧС 1958 (1/-6). У двух сваіх гульнях на ўдалых для немцаў ЧС 1954 і 1958 прапусціў аж 14 галоў (8 ад каманды Венгрыі і 6 – ад французаў).



**КЛАДААЛЬДА – САНТАНА Кладаальда дэ Таварэс** (CLODOALDO – SANTANA Clodoaldo de Tavares). Бразілія. 25.09.1949. Паўабаронца. **ЧС 1970 (6-1)**. «Сантас» (1968-78, 510-13), «Тампа Бэй», ЗША (1980), «Насьяналь АМ» (1981). Чэмпіён штата Сан Паула 1967, 1968, 1969, 1973 і 1978. За зб. Бразіліі (1969-74) згуляў 10 гульняў, забіў 1 гол. З-за траўмы дачасна скончыў кар'еру. У 1982 г. узначальваў «Сантас». Зараз працуе спартыўным дырэктарам гэтага клуба.



**КЛАУСЭН Нестар Раланда** (CLAUSEN Nestor Rolando). Аргентына. 29.09.1962. Абаронца. **ЧС 1986 (1-0)**. «Індэпэндзьентэ» (1980-89, 1995-96, 274-7), «Сьён», Швайц. (1989-94), «Рэсінг» (1994-95), «Арсенал» (1998). Уладальнік КЛ і МК 1984. Чэмпіён Аргентыны 1983, чэмпіён Швайцарыі 1992. За зб. Аргентыны (1983-88) згуляў 26 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік КА 1983, бронзавы прызёр КА 1989. Уваходзіў у трэнерскі штаб «Індэпэндзьентэ» (1999-2002). Працаваў з балівійскімі камандамі «Петролеўм Арыентэ» (2002-2003, 32+15=5-12) і «Стронгест» (2003-2004, 65+34=9-22), а таксама «Чакарыта Хуніёрс», Д-ІІ, Арг. (2005, 36+11=13-12). Летам 2006 ачоліў швайцарскі «Сьён».



**КЛЕБЕРСАН Хасэ Перэйра** (KLEBERSON Jose Perreira). Бразілія. 19.06.1979. Паўабаронца. **ЧС 2002 (5-0)**. «Ландрына» (1997-99), «Атлетыка Паранаэнсэ» (1999-2003, 99-12), «Манчэстэр Юнайтэд», Англ. (2003-2005, 20-2), «Бешыкташ», Тур. (2005-*, 31-3). Чэмпіён штата Парана 2001 і 2002, чэмпіён Бразіліі 2001. За зб. Бразіліі (2002-2004) згуляў 28 гульняў, забіў 2 галы. Футбаліст – адкрыццё ЧС 2002. Уладальнік КА 2004. Найлепшы футбаліст Бразіліі 2001 на сваёй пазіцыі (прыз Bola de Prata).



**КЛІНСМАН Юрген** (KLINSMANN Jurgen). ФРГ — Германія. 30.07.1965. Нападнік. **ЧС 1990 (7-3)**. «Гінгэн» (1972-74), «Гайслінгэн» (1974-78), «Штутгартэр Кікерс», Д-ІІ (1978-84, 61-22), «Штутгарт» (1984-89, 156-79), «Інтэр», Іта. (1989-92, 95-24), «Манако», Фра. (1992-94, 65-29), «Тотэнхэм Хотспур», Англ. (194-95, 1997-99, 56-29), «Баварыя» (1995-97, 65-31), «Сампдорыя», Іта. (1997, 8-2). Уладальнік Кубка УЕФА 1991 і 1996. Чэмпіён Італіі 1990 і Германіі 1997. За зб. ФРГ (1987-98) згуляў 108 гульняў, забіў 47 галоў. Удзельнік ЧС

1994 (5-5) і 1998 (5-3). Бронзавы прызёр АГ 1988, паўфіналіст ЧЕ 1988, срэбны прызёр ЧЕ 1992, чэмпіён Еўропы 1996. Бліскучы нямецкі нападнік, зорка еўрапейскага футболу. Найлепшы футбаліст Германіі 1988 і 1994, найлепшы футбаліст Англіі 1995, рэкардсмен па колькасці галоў у адным розыгрышы Еўракубка (15 галоў у розыгрышы КУЕФА 1996). У Д-1 згуляў 448 гульняў, забіў 204 галы. Тройчы браў удзел у фінальных частках ЧС, і ў кожным турніры забіваў 3 галы, ці болей. Разам з ФЁЛЕРАМ мае другі вынік, пасля МЮЛЕРА, па колькасці галоў за зб. Германіі. Пасля сканчэння кар'еры жыў у ЗША, дзе мае свой бізнэс у галіне Інтэрнэта і сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Пасля няўдалага для немцаў выступу на ЧЕ 2004 нечакана для многіх выказаў жаданне паспрабаваць сябе ў ролі галоўнага трэнера нацыянальнай каманды і быў прызначаны на гэтую пасаду ў ліпені 2004. Пад кіраўніцтвам КЛІНСМАНА немцы прадэманстравалі, бадай, самую відовішчную гульню на ЧС 2006 і занялі на турніры пачэснае трэцяе месца.



**КЛОДТ Бернхард** (KLODT Bernhard). ФРГ. 26.10.1926 – 23.05.1996. Нападнік. **ЧС 1954 (2-1)**. «Шальке-04» (1940-48, 1950-62), ТСВ, Хорст-Эмшэр (1948-50). За зб. ФРГ (1950-59) згуляў 19 гульняў, забіў 5 галоў. Удзельнік ЧС 1958 (2-0). Малодшы брат брамніка зб. Германіі (17 гульняў у 1938-41) Ханса Клодта (10.06.1914-07.11.1996).



**КОЛЕР Юрген** (KOHLER Jurgen). ФРГ — Германія. 06.10.1965. Абаронца. **ЧС 1990 (4-0)**. «Ян-Ламбшайн», «Вальдхоф» (1983-87, 95-5) «Кёльн» (1987-89, 59-6), «Баварыя» (1989-91, 55-6), «Ювентус», Іта. (1991-95, 102-8), «Барусія», Дортмунд (1995-2002, 191-14). Уладальнік КЕЧ 1997, Кубка УЕФА 1993. Чэмпіён Італіі 1995 і Германіі 1990, 1996 і 2002, уладальнік Кубка Італіі 1995. За зб. ФРГ (1986-98) згуляў 105 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік ЧС 1994 (5-0) і 1998 (4-0). Паўфіналіст ЧЕ 1988, срэбны прызёр ЧЕ 1992, чэмпіён Еўропы 1996. Асноўны гулец абароны зб. Германіі 90-х, адзін з найлепшых абаронцаў свету на сваёй пазіцыі. Найлепшы футбаліст Германіі 1997. Скончыў кар'еру пасля перамогі ў чэмпіянаце краіны 2002. Узначальваў зб. Германіі-м., да лета 2004 быў спартыўным дырэктарам леверкузэнскага «Баера». Са снежня 2005 да красавіка 2006 ачольваў «Дуйсбург».



**КОЛЬМЭЕР Вэрнэр** (KOHLMEYER Werner). ФРГ. 19.04.1924 – 26.03.1974. Абаронца. **ЧС 1954 (5-0)**. «Кайзэрслаўтэрн» (1941-57, 332-20), «Хомбург/Саар» (1957-59). Чэмпіён ФРГ 1951, 1953. За зб. ФРГ (1951-55) згуляў 22 гульні.



**КОМБІ Джамп'ера** (COMBI Giampiero). Італія. 20.11.1902 – 15.08.1956. Брамнік. **ЧС 1934 (5/-3)**. «Ювентус» (1921-34, 350 гульняў). Чэмпіён Італіі 1926, 1931, 1932, 1933, 1934. За зб. Італіі (1924-34) згуляў 47 гульняў, прапусціў 65 галоў. Бронзавы прызёр АГ 1928. Зорка італьянскага футболу 20-30-х. Дэбют у

зб. Італіі быў фатальным – 7 прапушчаных галоў у сустрэчы з Венгрыяй. Сталае месца ў зборнай заняў пасля АГ 1928. Пасля сканчэння кар'еры працаваў трэнерам брамнікаў у «Ювентусе».



**КОНЦІ Бруна** (CONTI Bruno). Італія. 13.03.1955. Паўабаронца, нападнік. **ЧС 1982 (7-1)**. «Рома» (1972-75, 1976-78, 1979-91, 304-37), «Джэнаа» (1975-76, 1978-79, 68-4). Чэмпіён Італіі 1983, уладальнік Кубка краіны 1980, 1981 і 1984. За зб. Італіі (1980-86) згуляў 47 гульняў, забіў 5 галоў. Удзельнік ЧС 1986 (4-0). Адзін з найлепшых гульцоў у складзе чэмпіёнаў свету 1982. Культавая постаць гісторыі «Ромы». З 2003 – у трэнерскім штабе клуба. Вясной 2005 – часова ў якасці галоўнага трэнера.



**КОННЭЛІ Джон Майкл** (CONNELLY John Michael). Англія. 18.07.1938. Паўабаронца. **ЧС 1966 (1-0)**. «Бёрнлі» (1956-63, 215-86), «Манчэстэр Юнайтэд» (1964-66, 80-22), «Блэкбэрн Ровэрс» (1966-69, 149-36), «Бары» (1970-72, 128-37). За зб. Англіі (1960-66) згуляў 20 гульняў, забіў 1 гол. Запасны на ЧС 1962, удзельнік КЕ 1964.



**КОЭН Джордж Рэджынальд** (COHEN George Reginald). Англія. 22.10.1939. Абаронца. **ЧС 1966 (6-0)**. «Фулхэм» (1956-68, 408-6). За зб. Англіі (1964-68) згуляў 37 гульняў. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968.



**КУЛЬМАН Бернхард** (CULLMANN Bernhard). ФРГ. 01.11.1949. Паўабаронца. **ЧС 1974 (3-1)**. «Порц» (1963-70), «Кёльн» (1970-84, 341-29). Чэмпіён ФРГ 1978, уладальнік Кубка ФРГ 1977 і 1978. За зб. ФРГ (1973-80) згуляў 40 гульняў, забіў 6 галоў. Чэмпіён Еўропы 1980, срэбны прызёр ЧЕ 1976. Запасны на ЧС 1978. Бацька Карстэна Кульмана, які таксама гуляе за «Кёльн» (1997-2006, 68-4).



**КУСІУФА Хасэ Луіс** (CUCIUFFO Jose Luis). Аргентына. 01.02.1961 – 11.12.2004. Абаронца. **ЧС 1986 (6-0)**. «Уракан», Кардоба (1978-80), «Чака Фор Эвер» (1980), «Тальерэс», Кардоба (1981), «Велес Сарсфілд» (1982-87), «Бока Хуніёрс» (1987-90), «Нім», Фра., Д-ІІ (1990-92), «Бельграна», Кардоба (1993). У складзе «Бокі» быў пераможцам Кубкаў «Суперкопа» 1989 і «Копа Інтэрамерыкана» 1990. За зб. Аргентыны (1985-90) згуляў 21 гульню. Удзельнік КА 1987, бронзавы прызёр КА 1989. Працаваў у трэнерскіх штабах «Уракан», Кардоба, «Атэнэа дэ Санта Роса», «24 Септембрэ», Араіта, «Атлетык Бельграна», Кардоба. Загінуў ад выпадковай кулі ў час палявання.



**КЭЛЭГЭН Ян Роберт** (CALLAGHAN Ian Robert) Англія. 10.04.1942. Нападнік. **ЧС (1-0)**. «Ліверпуль» (1960-78, 640-50), «Форт Лаудэрдэйл Страйкерс», ЗША (1978), «Суонсі Сіці» (1978-79, 76-1), «Кру Аляксандра» (1980-81, 15-0). Уладальнік КЕЧ 1977 і 1978, СК 1977, Кубка УЕФА 1973 і 1976. Чэмпіён Англіі 1964, 1966, 1973, 1976, 1977. За зб. Англіі (1966-68) згуляў 4 гульні. Рэкардсмен «Ліверпуля» па коль-

касці гульняў у чэмпіянатах Англіі. Найлепшы футбаліст Англіі 1974.



**КЭМПЕС Марыё Альберта** (KEMPES Mario Alberto). Аргентына. 15.07.1954. Нападнік. **ЧС 1978 (7-6)**. «Тальерэс», Бэль-Віль (1964-72), «Інстытута», Кардоба (1973, 13-11), «Расарыё Сэнтрал» (1974-76, 107-86), «Валенсія», Ісп. (1976-81, 982-84, 184-104), «Рывэр Плэйт» (1981-82, 29-15), «Эркулес», Ісп. (1984-86, 38-10), «Віена», Аўстр. (1986-87, 20-7), «Санкт-Пёльтэн», Аўстр. (1987-90, 64-24), «Крэмс», Аўстр. (1990-92, 39-7), «Фернандэс Віаль», Чылі (1995), «Паліта Хіят», Інданэзія (1996, гул. тр.). Уладальнік КУК 1980, Суперкубка 1980, Кубка Іспаніі 1979. Найлепшы стралец чэмпіянатаў Аргентыны 1974 (Н) – 25, 1976 (М) – 21 і Іспаніі 1977 (24) і 1978 (28). Усяго ў розных лігах згуляў 494 гульні, забіў 276 галоў. За зб. Аргентыны (1973-82) згуляў 43 гульні, забіў 20 галоў. Удзельнік ЧС 1974 (6-0) і 1982 (5-0), КА 1975. Адзін з найлепшых аргентынскіх нападнікаў усіх часоў. Найлепшы гулец і найлепшы стралец ЧС 1978. Найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1978 па версіі газеты «Эль Мунда». Найлепшы футбаліст Аргентыны 1978. Пасля сканчэння кар'еры без поспехаў ўзначальваў інданэзійскую «Персію», албанскую «Люшню» (1997), балівійскі «Стронгэст» (1999), «Фіорэнцуолу», Іта., Д-4 (2001), «Казарана», Іта., Д-4 (2001-01.2002), «Сан-Фернанда», Ісп. (2002). Працуе каментатарам на амерыканскім спартыўным канале ESPN. Летам 2006 мае ачоліць зб. Панамы.



**ЛАБАНД Фрыдрых (Фрыц)** (LABAND Friedrich (Frietz). ФРГ. 01.11.1925–04.01.1982. Абаронца. **ЧС 1954 (3-0)**. «Вісмар», ГДР (?-1949), «Гамбург» (1949-56), «Вердэр», Брэмэн (1956-57). У 1949 уцёк з ГДР у ФРГ. За зб. ФРГ (1954) гуляў 4 гульні.



**ЛАКАТЭЛІ Уга** (LOCATELLI Ugo). Італія. 05.02.1916 – 28.05.1993. Паўабаронца. **ЧС 1938 (4-0)**. «Брэшыя», «Амбразіяна-Інтэр», Мілан (1936-41, 146-1), «Ювентус» (1941-49, 181-8). Чэмпіён Італіі 1938 і 1940. Уладальнік Кубка Італіі 1939 і 1942. За зб. Італіі (1936-40) згуляў 22 гульні. Чэмпіён АГ 1936. Самы малады чэмпіён свету 1938.



**ЛАРОСА Рубэн Амар** (LARROSA Ruben Omar). Аргентына. 18.11.1947. Паўабаронца. **ЧС 1978 (2-0)**. «Бока Хуніёрс» (1967-68, 1969-70), «Архенцінас Хуніёрс» (1969), «Муніцыпаль», Гватэмала (1971), «Уракан» (1972-76), «Індэпэндзьентэ» (1977-80), «Велес Сарсфілд» (1980), «Сан Ларэнса» (1981). За зб. Аргентыны (1977-78) згуляў 11 гульняў. У красавіку 2004 узначаліў малайзійскі клуб «Рэд Джайнтс», Селангор.



**ЛЕАНАРДА Насімента дэ АРАУЖА** (LEONARDO Nascimento de ARAUJO). Бразілія. 05.09.1969. Паўабаронца. **ЧС 1994 (4-0)**. «Фламенга», (1987-89, 2001-02, 52 гульні), «Сан Паула» (1990-91, 1993, 2001, 52-4), «Валенсія», Ісп. (1991-93, 71-6), «Касіма

Энтлерс», Яп. (1994-96, 49-30), «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра. (1996-98, 34-7), «Мілан», Іта. (1998-01, 2002, 97-22). Уладальнік МК 1993. Чэмпіён Бразіліі 1987, 1991, Японіі 1995, Італіі 1999. За зб. Бразіліі (1990-2001) згуляў 55 гульняў, забіў 7 галоў. Пераможца КА 1997, срэбны прызёр ЧС 1998 (7-0). Уладальнік прыза Bola de Prata 1991.



**ЛЕБЁФ Франк** (LEBOEUF Franck). Францыя. 22.01.1968. Абаронца. **ЧС 1998 (3-0)**. «Хьерэс», (1986-12.86, 14-1), «Мо» (1986-88, 39-3), «Лаваль» (1988-91, 69-10), «Рэсінг», Страсбур (1991-96, 189-49), «Чэлсі», Англ. (1996-2001, 143-17), «Алімпік», Марсэль (2001-2003, 51-5), «Аль-Саад», Катар (2003-2005). Уладальнік КУК 1998, Суперкубка 1998, Кубка Англіі і Суперкубка Англіі 2000. За зб. Францыі (1995-2002) згуляў 50 гульняў, забіў 4 галы. Чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧС 2002 (2-0). Дублёр БЛАНА ў цэнтры абароны зб. Францыі. Толькі ў 32 гады, і па тым, як БЛАН скончыў выступаць за зборную, заняў сталае месца ў яе складзе.



**ЛІБРЫХ Вернэр** (LIEBRICH Werner). ФРГ. 18.01.1927 – 20.03.1995. Абаронца. **ЧС 1954 (4-0)**. «Кайзэрслаўтэрн» (1942-63, 412-30). Чэмпіён ФРГ 1951 і 1953. За зб. ФРГ (1951-56) згуляў 16 гульняў. Асноўны гулец абароны зб. ФРГ ўзору 1954. Вызначыўся тым, што траўмаваў на турніры Ферэнца ПУШКАША. Пасля сканчэння кар'еры гульца працаваў у трэнерскім штабе «Кайзерслаўтэрна». Меў старэйшага брата Эрнста, які таксама гуляў за «Кайзэрслаўтэрн». У гонар Вернэра ЛІБРЫХА названая вуліца горада, дзе месціцца трэнінгавы цэнтр «Кайзэрслаўтэрна».



**ЛІЗАРАЗЮ Біксэнт Венсан** (LIZARAZU Bixente Vincent). Францыя. 09.12.1969. Абаронца. **ЧС 1998 (6-1)**. «Бардо» (1988-96, 250-26), «Атлетык», Більбаа, Ісп. (1996-97, 16-0), «Баварыя», Герм. (1997-2004, 01.2005-2006, 174-7), «Алімпік», Марсэль (2004-01.2005, 14-0). Уладальнік КЕЧ 2001, уладальнік МК 2001. Чэмпіён Германіі 1999, 2000, 2001, 2003, 2005 і 2006. Уладальнік Кубка Германіі 1998, 2003, 2005 і 2006. За зб. Францыі (1992-2004) згуляў 97 гульняў, забіў 2 галы. Чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧЕ 1996 і 2004, ЧС 2002 (3-0). Баск па паходжанні. Адзін з асноўных гульцоў зб. Францыі ў часы яе росквіту.



**ЛІМА Паула Сэзар** (LIMA Paulo Cesar). Бразілія. 16.06.1949. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1970 (4-0)**. «Батафога» (1967-71), «Фламенга» (1972-73), «Алімпік», Марсэль, Фра. (1974-75, 31-16), «Флумінэнсэ» (1975-76), «Васка да Гама» (1977-78), «Грэміё» (1979-84), «Карынціянс» (1981). Уладальнік КЛ і МК 1983. За зб. Бразіліі (1967-77) згуляў 58 гульняў, забіў 8 галоў. Удзельнік ЧС 1974 (5-0).



**ЛІПІ Марчэла** (LIPPI Marcello). Італія. 11.04.1948. Трэнер. **ЧС 2006.** Гуляў абаронцам у клубах «Сампдорыя» (1969, 1970-79, 239-7), «Савона» (1969-70, 21-2), «Пістаэзе» (1979-82, 45-0). Згуляў 2 гульні за зб. Італіі-Б (1971). Ачольваў «Сампдорыю» (1984-85), «Пантэдэра» (985-86), «Сіену» (1986-87), «Пістаэзэ» (1987-88),

«Карарэзэ» (1988-89), «Чэзену» (1989-91), «Лукезэ» (1991-92), «Аталанту» (1992-93), «Напалі» (1993-94), «Ювентус» (1994-02.1999, 2001-2004), «Інтэр» (1999-2000), зб. Італіі (07.2004-07.2006). Уладальнік МК 1996, КЕЧ 1996, СК 1996, чэмпіён Італіі 1995, 1997, 1998, 2002, і 2003, уладальнік Кубка Італіі 1995 і Суперкубка Італіі 1995, 1997 і 2003. Лепшы трэнер свету 1998 г.



**ЛІТБАРСКІ П'ер** (LITTBARSKI Pierre). ФРГ – Германія. 16.04.1960. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1990 (6-1)**. «Шонэберг» (1967-76), «Герта-03», Цэлендорф (1976-78), «Кёльн» (1978-86, 1987-93), «Рэсінг», Парыж, Фра. (1986-87), «Джэф Юнайтэд», Яп. (1993-95), «Брумель Сёндаі», Д-ІІ, Яп. (1996, гуляючы трэнер). Уладальнік Кубка ФРГ 1983. За зб. ФРГ (1981-90) згуляў 73 гульні, забіў 18 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1982 (7-2) і 1986 (5-0), удзельнік ЧЕ 1984 і 1988. Адзін з самых таленавітых нямецкіх футбалістаў 80-х. Чэмпіён і двухразовы срэбраны прызёр ЧС. У бундэслізе ў складзе «Кёльна» згуляў 406 гульняў, забіў 116 галоў. Трэнерскую кар'еру распачаў ў «Ёкагама Марынас», Д-ІІІ, Яп. (1999-2001). Быў асыстэнтам Берці ФОГТСА ў «Баеры» з Леверкузэна (2001), узначальваў «Дуйсбург», Д-ІІ. (2001-11.2002), затым зноў вярнуўся ў «Ёкагаму Марынас» (2003), Яп. Зараз узначальвае аўстралійскі «Сіднэй» (2005-*), чэмпіён краіны 2006.



**ЛОПЕС Хуан Фантана** (LOPEZ Juan Fontana). Уругвай. 15.03.1908–04.10.1983. Трэнер. **ЧС 1950**. Узначальваў «Атлетыка», Мантэвідэа (1946-48), «Рэсінг» (1948-49), «Пеньяроль» (чэмпіён краіны 1953 і 1954), зб. Уругвая (1947-54), зб. Эквадора (1956). Уваходзіў у трэнерскі штаб зб. Уругвая на ЧС 1954, 1962, 1966, 1970.



**ЛУІЗАА – Луіс Карлас ГУЛАРТ** (LUIZÃO – Luis Carlos Goulart). Бразілія. 14.11.1975. Нападнік. **ЧС 2002 (2-0)**. «Гуарані» (1991-92, 1994-96, 37-16), «Парана» (1993, 6-0), «Палмейрас» (1996-97, 24-13), «Дэпарціва», Ла-Карунья, Ісп. (1997, 13-4), «Васка да Гама» (1998, 16-8), «Карынціянс» (1999-2002, 34-25), «Грэміё» (2002, 0-0), «Герта», Герм. (2002–03.2004, 26-3), «Батафога» (03.2004–09.2004, 15-9), «Сан Паула» (01.2005–07.2005, 5-2), «Нагоя Грампус Эйт», Яп. (07.2005–09.2005, 6-4), «Сантас» (09.2005–01.2006, 5-0), «Фламенга» (01.2006–*). Уладальнік КЛ 1998 і 2005. Чэмпіён Бразіліі 1999, чэмпіён штатаў Парана (1993), Сан Паула (1996, 1999, 2001), Р-д-Ж (1998), пераможца чэмпіяната свету сярод клубных каманд 2000 і 2005. За зб. Бразіліі (1996-2002) згуляў 12 гульняў, забіў 5 галоў. Бронзавы прызёр АГ 1996. Удзельнік КА 2001. Найлепшы бразільскі стралец у гісторыі КЛ – 28 галоў. Уладальнік Bola de Prata 1994.



**ЛУСІЁ – Лусімар да Сільва Ферэйра** (LUCIO – Lucimar da Silva Ferreira). Бразілія. 08.05.1978. Абаронца. **ЧС 2002 (7-0)**. «Васка да Гама» (1996-98), «Інтэрнасьёналь», Порту-Алегры (1998-2000, 50-5), «Баер», Леверкузэн, Герм. (2000-2004, 65-12), «Баварыя», Герм. (2004-*, 62-5). Чэмпіён Бразіліі 1997, чэмпіён Германіі 2005 і 2006, уладальнік Кубка Германіі 2005 і 2006. За зб. Бразіліі (2000-2006) згуляў 55 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік ЧС 2006 (5-0). Уладальнік Кубка канфедэра-

цый 2005. Лаўрэат трафея Bola de Prata 2000.



**ЛЮКЕ Леапольда Хасінта** (LUQUE Leopoldo Jacinto). Аргентына. 03.05.1949. Нападнік. **ЧС 1978 (5-4)**. «Гімназія і Эсгрыма», «Сэнтрал Нортэ», «Расарыё Сэнтрал» (1972-74, 4-3), «Уніён», Санта Фэ (1975, 1981, 59-20), «Рывэр Плэйт» (1975-81, 176-75), «Рэсінг», Б-А. (1982, 11-2), «Чакарыта Хуніёрс», Б-А. (1984, 11-0), «Дэпарціва», Мендоса (1985). Чэмпіён Аргентыны 1975 (Н), 1977 (М), 1979 (Н), 1979 (М) і 1980 (М). За зб. Аргентыны (1975-81) згуляў 45 гульняў, забіў 22 галы. Удзельнік КА 1975 (найлепшы стралец турніра з 4 галамі). Узначальваў «Уніён», «Бельграна», «Сэнтрал», Кардоба, «Індэпэндзьентэ», Рывадавія.



**МАЕР Ёзаф Дзітэр (Зэп)** (MAIER Josef Dieter (Sepp). ФРГ. 28.02.1944. Брамнік. **ЧС 1974 (7/-4)**. «Хаар» (1958-66), «Баварыя» (1966-79, 473 гульні). Уладальнік КЕЧ 1974, 1975 і 1976, КУК 1967, чэмпіён ФРГ 1969, 1972, 1973 і 1974. Уладальнік Кубка ФРГ 1967, 1969 і 1971. За зб. ФРГ (1966-79) згуляў 95 гульняў (нацыянальны рэкорд сярод брамнікаў), прапусціў 73 галы. Запасны на ЧС 1966, бронзавы прызёр ЧС 1970 (5/-9), ЧЕ 1972, срэбраны прызёр ЧЕ 1976, удзельнік ЧС 1978 (6/-5). Адзін з найлепшых брамнікаў у гісторыі футбола. Найлепшы футбаліст краіны 1975, 1977 і 1978. У бундэслізе згуляў 473 гульні, з іх 442 запар. Вымушаны быў скончыць кар'еру пасля аўтааварыі ў ліпені 1979. Працаваў трэнерам брамнікаў «Баварыі» (1987-2006) і зб. Германіі (да кастрычніка 2004, калі пакінуў каманду з-за канфлікта з новым гал. тр. Юргенам КЛІНСМАНАМ).



**МАЗІНЬЁ – Іамар дзі НАСІМЕНТА** (MAZINHO – Iomar di NASCIMENTO). Бразілія. 08.08.1966. Абаронца. **ЧС 1994 (6-0)**. «Санта Круз» (1983-86), «Васка да Гама» (1986-90, 235-15), «Леччэ», Іта. (1990-91, 34-2), «Фіярэнціна», Іта. (1991-92, 21-0), «Палмейрас» (1992-94), «Валенсія», Ісп. (1994-96, 71-0), «Сэльта», Ісп. (1996-2000, 114-8), «Эльчэ», Д-ІІ, Ісп. (2000-2001, 17-0), «Віторыя», Байя (2001-2003). Чэмпіён Бразіліі 1989, 1993 і 1994, штатаў Р-д-Ж (1987 і 1988) і Сан Паула (1993 і 1994). За зб. Бразіліі (1989-94) згуляў 35 гульняў. Віцэ-чэмпіён АГ 1988, пераможца КА 1989, запасны на ЧС 1990, срэбны прызёр КА 1991. Лаўрэат Bola de Prata 1987, 1988 і 1989.



**МАЙ Карл** (MAI Karl). ФРГ. 27.07.1928 – 15.03.1993. Паўабаронца. **ЧС 1954 (5-0)**. «Фюрт» (1941-58), «Баварыя» (1958-61), «Янг Фелоўс», Швайц. (1961-62), «Дорнбірн», Аўстр. (1962-63). За зб. ФРГ (1953-59) згуляў 21 гульню, забіў 1 гол. Ачольваў клубы з рэгіянальных лігаў: ESV «Інгольштадт» (1964-65), MTV «Інгольштадт» (1965-67), «Ваккер», Мюнхен (1967-69), «Дайсэнхофэн» (1969-75).



**МАНЦЭЛЬЁ Эральда** (MONZEGLIO Eraldo). Італія. 05.06.1906 – 03.11.1981. Абаронца. **ЧС 1934 (4-0)**, **ЧС 1938 (1-0)**. «Казале», «Балонья» (1926-35), «Рома» (1935-39, 108-0). Чэмпіён Італіі 1929. У чэмпіянаце Італіі згуляў 380 гульняў, забіў 5 галоў. За зб. Італіі (1930-38) згуляў 35 гульняў. Працаваў трэнерам у «Кома» (1946-47), «Сампдорыі» (1958-59),

«Ювентусе» (1963-64), «Кьяса», Швайц. (1965-66), «Лекка» (1967-68) і «Роме».



**МАРАДОНА Дыега Арманда** (MARADONA Diego Armando). Аргентына. 04.10.1955. Нападнік. **ЧС 1986 (7-5)**. «Архенцінас Хуніёрс» (1976-80, 166-116), «Бока Хуніёрс» (1981-82, 1995-97, 70-35), «Барселона», Ісп. (1982-84, 36-22), «Напалі», Іта. (1984-91, 188-81), «Севілья», Ісп. (1992-93, 26-4), «Ньюэл'с Олд Бойс» (1993-94, 5-0). Уладальнік Кубка УЕФА 1989. Чэмпіён Аргентыны 1981 і Італіі 1987 і 1990, уладальнік Кубка Іспаніі 1983, Кубка Італіі 1987, Суперкубка Італіі 1990. Найлепшы стралец чэмпіянатаў Аргентыны 1978 (М) – 22, 1979 (Н) – 14, 1979 (Н) – 12, 1979 (М) – 25, 1980 (Н) – 17, чэмпіяната Італіі 1988 (15). Усяго ў Д-1 згуляў 486 гульняў, забіў 259 галоў. За зб. Аргентыны (1977-94) згуляў 91 гульню, забіў 34 галы. Срэбны прызёр ЧС 1990 (7-0), удзельнік ЧС 1982 (5-2) і 1994 (2-1), КА 1979 і 1987, бронзавы прызёр КА 1989. Другі пасля ПЕЛЕ наймацнейшы футбаліст у гісторыі футбола па версіі IFFHS. Найлепшы футбаліст ЧС 1986, найлепшы футбаліст свету 1986 па версіі «World Soccer», найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1979, 1980, 1986, 1989, 1990 і 1992 (па версіі венесуэльскай газеты «Эль Мунда»). Найлепшы футбаліст Аргентыны 1979, 1980, 1981 і 1986. З-за захаплення наркотыкамі напрыканцы кар'еры двойчы быў дыскваліфікаваны (1991-92 і 1994-95), неаднаразова трапляў у скандальныя кронікі. У час другой дыскваліфікацыі спрабаваў сябе ў ролі трэнера «Дэпарціва Мандзію» (1994) і «Рэсінг», Авельянэда (1995). У кастрычніку 2000 стаў прэзыдэнтам «Альмагра». Сябруе з Фідэлем Кастра, і неаднаразова папраўляў на Кубе здароўе, папсаванае нездаровым ладам жыцця. З сярэдзіны 2005 з'яўляецца спартыўным дырэктарам «Бока Хуніёрс». Вядзе ўласнае тэлевізійнае ток-шоў «Вечар з Дзесяткай».



**МАРКА АНТОНІЁ – ФЕЛІСІЯНА Марка Антоніё** (MARCO ANTONIO – FELICIANO Marco Antônio). Бразілія. 06.02.1951. Абаронца. **ЧС 1970 (2-0)**. «Партугеза» (1968-69), «Флумінэнсэ» (1969-76), «Васка да Гама» (1976-80), «Бангу» (1980-82), клубы з Венесуэлы. Чэмпіён штата Р-д-Ж 1969, 1971, 1973, 1975 і 1977. За зб. Бразіліі (1970-79) згуляў 31 гульню. Запасны на ЧС 1974, удзельнік КА 1979. Наймалодшы ўдзельнік ЧС 1970. Лаўрэат Bola de Prata 1975 і 1977.



**МАРКАС Раберта Сільвейра Рэйс** (MARCOS Roberto Silveira Reis). Бразілія. 04.08.1973. Брамнік. **ЧС 2002 (7/-4)**. «Ленкаэнсэ» (1991-93), «Палмейрас» (1993-*). Уладальнік КЛ 1999, Кубка Бразіліі 1998, чэмпіён штата Сан Паула 1996. За зб. Бразіліі (1999-2004) згуляў 25 гульняў, прапусціў 18 галоў. Уладальнік КА 1999, удзельнік КА 2001. Уладальнік Кубка канфедэрацый 2005.



**МАРСІЁ Рабэрта дос САНТАС** (MARCIO Roberto dos SANTOS). Бразілія. 15.09.1969. Паўабаронца. **ЧС 1994 (7-1)**. «Новарызанціна» (1988-90, 53-3), «Інтэрнасьёналь» (1990-91, 5-0), «Батафога» (1991-92), «Бардо», Фра. (1992-94, 56-4) «Фіярэнціна», Іта. (1994-95, 32-2), «Аякс», Гал. (1995-01.97, 21-1), «Атлетыка Мінэйра» (1997), «Сантас» (2000-2001), «Васка да Гама» (2001), «Ланенг Тайчан», Кітай (2001), «Эці Жундзіай», Сан Паула (2002), «Ба-

лівар», Балівія (03.2003-05.2003), «Жанвіль» (2003), «Партугеза Санціста» (01.2004-*). Чэмпіён Бразіліі 2001, штатаў Рыё-Грандэ да Сул (1991) і Сан Паула (1998), чэмпіён і ўладальнік Суперкубка Галандыі 1996. За зб. Бразіліі (1990-97) згуляў 40 гульняў, забіў 5 галоў. Срэбны прызёр КА 1991. Пераможца КА 1997. Уладальнік Bola de Prata 1991.



**МАРЫНІ Джамп'ера** (MARINI Giampiero). Італія. 25.09.1951. Паўабаронца. **ЧС 1982 (5-0)**. «Фанфулья» (1968-69), «Варэзэ» (1969-71, 1972-75, 89-0), «Рэджына» (1971-72), «Трыесціна» (1972, 25-4), «Інтэр» (1975-86, 256-10). Чэмпіён Італіі 1980, уладальнік Кубка Італіі 1978 і 1982. За зб. Італіі (1980-83) згуляў 20 гульняў. У 1994 ў якасці трэнера прывёў «Інтэр» да перамогі ў Кубку УЕФА. У 1997-99 узначальваў «Крэманэзэ».



**МАРЭЙРА Айморэ** (MOREIRA Aimore). Бразілія. 24.04.1912 – 26.07.1998. Брамнік, трэнер. **ЧС 1962**. Выступаў за «Іракаму», «Спортклуб Бразіл», «Амерыка», Р-д-Ж., «Палестра Італьяна», Сан Паула (1934), «Батафога» (1934-46). Згуляў 3 гульні за зб. Бразіліі (1940). Узначальваў «Аларыю» (1946-49), «Бангу» (1950), «Сан Крыставаа», Сан Паула (1951), «Сантас» (1952), «Палмейрас» (1954, 1956-57), «Сан Паула» (1955), «Таубатэ» (1958), «Партугезу», (1962-66, 1969-70), «Фламенга» (1968-69), «Карынціянс» (1970-71), «Баавішта», Парт. (1971-73), «Порту», Парт. (1974), «Панацінаікас», Грэ. (1976), «Віторыя», Сальвадор (1978-79, 1986), «Галісія», Сальвадор (1980), «Байя», Сальвадор (1981-82), «Гатуэнсэ», Сальвадор (1984), «Флумінэнсэ дэ Фейра Сантана» (1985-86). Кіраваў зб. Бразіліі (1953, 1961-63, 1965, 1967 – усяго ў 40 гульнях). Удзельнік КА 1953.



**МАСКЕРОНІ Эрнэста** (MASCHERONI Ernesto). Уругвай. 21.11.1907 – 03.07.1984. Абаронца. **ЧС 1930 (3-0)**. «Алімпія», Мантэвідэа, «Белья Віста», Мантэвідэа, «Пеньяроль», Мантэвідэа, «Амбразіяна-Інтэр», Мілан, Іта. (1934-36, 53-3). Срэбны прызёр КА 1939. У 1935 г. згуляў 2 гульні за зб. Італіі.



**МАСПАЛІ Ракэ Гастон** (MASPOLI Rogue Gaston). Уругвай. 12.10.1917 – 22.02.2004. Брамнік, трэнер. **ЧС 1950 (3/-3)**. «Белья Віста», Мантэвідэа, «Серра», Мантэвідэа, «Уондэрэрс», Мантэвідэа, «Пеньяроль», Мантэвідэа (1938-57). Чэмпіён Уругвая 1944, 1945, 1949, 1951, 1953, 1954. За зб. Уругвая (1945-55) згуляў 45 гульняў. Удзельнік КА 1945, 1946 і 1955. Удзельнік ЧС 1954 (5/-9). З 1964 да 1968 узначальваў «Пеньяроль», разам з якім перамагаў у КЛ 1966, МК 1966, а таксама ў чэмпіянатах Уругвая 1964, 1965, 1967, 1985 і 1986. Некалькі разоў ачольваў зб. Уругвая – у 1966, 1980-1982 і 1997. У час апошняга прызначэння меў 79 гадоў – сусветны рэкорд сярод трэнераў нацыянальных зборных. Працаваў таксама з клубамі Перу, Парагвая і Эквадора.



**МАТЭРАЦЫ Марка** ( MATERAZZI Marco). Італія. 19.08.1973. Абаронца. **ЧС 2006 (4-2).** «Месіна», Д-2 (1990-91), «Тор дзі Квінта» (1991-93), «Марсала», Д-4 (1993-94, 25-4), «Трапані», Д-3 (1994-95, 13-2), «Пе-

руджа», Д-2 (1995-96, 01.1997-98, 1999-2001, 98-22), «Капры», Д-3 (1996-01.1997, 18-7), «Эвертан», Англ. (1998-99, 25-1), «Інтэр» (2001-*, 103-8). Уладальнік Кубка Італіі 2005 і 2006. За зб. Італіі (2001-2006) згуляў 32 гульні, забіў 2 галы. Удзельнік ЧС 2002 (1-0) і ЧЕ 2004 (1-0). На ЧС 2006 вызначыўся двума вельмі важнымі галамі (у тым ліку – у фінале), а таксама тым, што ў слоўнай сутычцы справакаваў Зідана яго ўдарыць, за што француз і быў выдалены з поля.



**МАТЭУС Лотар Херберт** (MATTHÄUS Lothar Herbert). ФРГ -Германія. 21.03.1961. Паўабаронца, абаронца. **ЧС 1990 (7-4)**. «Херцогенраух» (1970-79), «Барусія», Мёнхенгладбах (1979-84, 162-36), «Баварыя» (1984-88, 1992-2000, 287-84) «Інтэр», Іта. (1988-92, 115-40), «Нью-Ёрк/Нью-Джэрсі Мэтрастарс», ЗША (2000-2001, 21-0). Уладальнік Кубка УЕФА 1991 і 1996. Чэмпіён ФРГ-Германіі 1985, 1986, 1987, 1994, 1997, 1999 і 2000, Італіі 1989. Уладальнік Кубка ФРГ-Германіі 1986 і 1998. За зб. ФРГ-Германіі (1980-2000) згуляў 150 гульняў (найлепшы вынік сярод еўрапейскіх футбалістаў), забіў 23 галы. Чэмпіён Еўропы 1980. Срэбны прызёр ЧС 1982 (2-0) і 1986 (7-1), ЧС 1994 (5-1) і 1998 (4-0), ЧЕ 1984, 1988 і 2000. Зорка сусветнага футболу, найлепшы футбаліст свету 1990. Найлепшы футбаліст краіны 1990 і 1999 па версіі нямецкіх журналістаў. Рэкардсмен па колькасці гульняў у фінальных частках ЧС – 25 гульняў. Браў удзел у фінальных частках пяці чэмпіянатаў свету! У бундэслізе забіў 121 гол у 464 гульнях. Усяго ў Д-1 згуляў 595 гульняў, забіў 161 гол. Капітан каманды на ЧС 1994 і 1998. У 2001-2002 узначальваў венскі «Рапід», з 2002 – «Партызан», Белград, Сербія і Чарнагорыя (чэмпіён краіны 2003). З снежня 2003 да канца 2005 узначальваў зб. Венгрыі. З студзеня да сакавіка 2006 – галоўны трэнер бразільскага «Атлетыка Паранаэнсэ», з лета 2006 разам з Трапатоні кіруе аўстрыйскім "Зальцбургам".



**МАУРА да СІЛЬВА Гомес** (MAURO da SILVA Gomes). Бразілія. 12.01.1968. Паўабаронца. **ЧС 1994 (7-0)**. «Гуарані», «Браганціна» (1990-92), «Дэпарціва», Ла-Карунья,Ісп. (1992-2005, 369-1). Чэмпіён Іспаніі 2000, уладальнік Кубка Іспаніі 1995 і Суперкубка Іспаніі 1995. За зб. Бразіліі (1991-2001) згуляў 58 гульняў. Срэбны прызёр КА 1991. Пераможца КА 1997. Лаўрэат Bola de Prata 1991 і 1992.



**МАУРА Рамас дэ АЛІВЕЙРА** (MAURO Ramos de OLIVEIRA). Бразілія. 30.08.1930 – 18.09.2002. Абаронца. **ЧС 1962 (6-0)**. «Саньёанэнсэ» (1947), «Сан Паула» (1948-59), «Сантас» (1960-66, 354 гульні), «Талука», Мекс. (1967), «Арура», Мекс. (1968). Уладальнік КЛ 1962 і 1963, уладальнік МК 1962 і 1963. Уладальнік Кубка Бразіліі 1961, 1962, 1963, 1964 і 1965. Чэмпіён штата Сан Паула 1948, 1949, 1953, 1957, 1960, 1961, 1962, 1964 і 1965. За зб. Бразіліі (1949-65) згуляў 28 гульняў. Запасны на ЧС 1958. Уладальнік КА 1949, удзельнік КА 1956. Адзін з найлепшых бразільскіх абаронцаў свайго часу. Капітан зб. Бразіліі на ЧС 1962. На ЧС 1954 у ліку запасных быў ягоны брат Альфрэда дэ АЛІВЕЙРА. Пасля сканчэння кар'еры працаваў трэнерам у «Сантасе», «Курыцібе», «Дэпарціва Ора», Мекс. і, непрацяглы час – са зб. Мексікі. Імя МАУРА Рамаса носіць адзін са шматлікіх кубкавых турніраў, якія праводзяцца ў Бразіліі.



**МАЦОЛА—Жазэ (Джузэпэ) Жааа Альтафіні** (MAZZOLA – Jose (Giuseppe) Joao Altafini). Бразілія — Італія. 24.07.1938. Нападнік. **ЧС 1958 (3-2)**. «XV дэ Піракікаба» (1954-56), «Палмейрас» (1956-58), «Мілан», Іта. (1958-65, 205-120), «Напалі», Іта. (1965-72, 180-71), «Ювентус», Іта. (1972-76, 74-25), «Кьяса», Швайц., Д-ІІ (1976-79), «Мендрысіё Стар», Швайц. (1980-81). Уладальнік КЕЧ 1963, чэмпіён Італіі 1959, 1962, 1973, 1975, найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 1962 (22). Найлепшы футбаліст Італіі 1972. Усяго ў італьянскай Серыі «А» згуляў 459 гульняў, забіў 216 галоў. За зб. Бразіліі (1957-58) згуляў 8 гульняў, забіў 4 галы. Пасля прыняцця італьянскага грамадзянства (1959) за зб. Італіі (1961-62) згуляў 6 гульняў, забіў 5 галоў. Удзельнік ЧС 1962 (2-0). Пасля пераезду ў Італію адмовіўся ад мянушкі «МАЦОЛА», якую ў свой час узяў у памяць пра загінуўшага ў авіякатастрофе вялікага італьянскага гульца Валянціна МАЦОЛЫ.



**МЕАЦЦА Джузэпэ** (MEAZZA Giuseppe). Італія. 23.08.1910 – 21.08.1979. Нападнік, трэнер. **ЧС 1934 (5-2)**, **ЧС 1938 (4-1)**. «Амбразіяна-Інтэр» (1927-39, 1946-47, 365-242), «Мілан» (1940-42, 37-9), «Ювентус», Турын (1942-43, 27-10), «Варэзэ» (1943-44, 20-7), «Аталанта», Бергама (1945-46, 14-2). Чэмпіён Італіі 1930 і 1938. Найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 1930 (31), 1936 (25), 1938 (20). У чэмпіянаце краіны згуляў 463 гульні, забіў 274 галы. За зб. Італіі (1930-39) згуляў 53 гульні, забіў 33 галы. Семнаццаць разоў выводзіў зб. Італіі ў якасці капітана (у т.л. на ЧС 1938). Пасля сканчэння кар'еры гульца трэнераваў «Інтэр» (1947-48, 1955-56), «Бешыкташ», Тур. (1948-49), «Про Патрыя» (1949-50), уваходзіў у трэнерскі штаб зб. Італіі (1952-53). Адзін з найлепшых футбалістаў у гісторыі італьянскага футбола. Імя Джузэпэ Меаццы носіць з 1982 стадыён «Сан Сіра» ў Мілане.



**МЕБУС Пауль** (MEBUS Paul). ФРГ. 09.06.1920 – 11.12.1993. Паўабаронца. **ЧС 1954 (1-0)**. «Бернрат», «Кёльн». За зб. ФРГ (1951-54) згуляў 6 гульняў. Адзіны выхад на поле ў фінале ЧС 1954 супраць каманды Венгрыі прынёс гульцу залаты медаль чэмпіяната.



**МЁЛЕР Андрэас** (MÖLLER Andreas). ФРГ – Германія. 02.09.1967. Паўабаронца. **ЧС 1990 (2-0)**. «Шварц-Вайс», Ф-н-М. (1974-81), «Айнтрахт», Ф-н-М. (1981-88, 1990-92, 2003, 125-33), «Барусія», Дортмунд (1988-1990, 1994-2000, 228-71), «Ювентус», Іта. (1992-94, 56-19), «Шальке-04» (2000-2003, 86-6). Уладальнік КЕЧ 1997, Кубка УЕФА 1993, МК 1997, чэмпіён Германіі 1995 і 1996, уладальнік Кубка Германіі 2001 і 2002. За зб. ФРГ-Германіі (1988-99) згуляў 85 гульняў, забіў 30 галоў. Срэбны прызёр ЧЕ 1992, удзельнік ЧС 1994 (4-0) і 1998 (3-1). Наймалодшы пераможца ЧС 1990 (на турніры згуляў толькі 23 хвіліны). Зорка нямецкага футболу 1990-х, найлепшы футбаліст фінала МК 1997. У бундэслізе згуляў 429 гульняў, забіў 110 галоў.



**МЕНОЦІ Сэзар Луіс** (MENOTTI Cesar Luis). Аргентына. 05.11.1938. Трэнер. **ЧС 1978**. У якасці паўабаронцы гуляў за «Уніён Амерыкана», Расарыё, «Расарыё Сэнтрал» (1960-63, 86-47), «Рэсінг» (1964, 18-12), «Бока Хуніёрс» (1965-66, 18-6), «Джэнералс», Нью-Ёрк, ЗША (1967), «Нью-Ёрк Джайнтз», ЗША (1967), «Сантас», Бра. (1968), «Ювентус», Сан Паула (1969). Чэмпіён Аргентыны 1965. У чэмпіянаце Аргентыны згуляў 122 гульні, забіў 65 галоў. Бронзавы прызёр КА 1963. у складзе зб. Аргентыны. Узначальваў «Сэнтрал», Кардоба (1969), «Ньюэл'с Олд Бойс» (1970-71), «Уракан» (1971-74, чэмпіён Аргентыны 1973), зб. Аргентыны (1974-82, удзельнік ЧС 1982), зб. Аргентыны-м (1978-79, ЧС-м 1979), «Барселону», Ісп. (1982-84), «Бока Хуніёрс» (1984-87, 1989-90, 1993-95) «Атлетыка», Мадрыд, Ісп. (1987-88), «Рывер Плэйт» (1988-90), «Пеньяроль», Ур. (1990-91), зб. Мексікі (1991-93), «Банфілд» (1995-96, генеральны мэнэджэр), «Індэпэндзьентэ» (1996-97, 12.1997-99, 2005), «Сампдорыя», Іта. (06.1997-12.1997), «Расарыё Сэнтрал» (2002-2003). У лютым 2006 узначаліў мексіканскі «Веракрус». Выбітны трэнер, які зрабіў каманду Аргентыны адным з фаварытаў сусветнага футбола.



**МІГЕС Оскар Амар** (MIGUEZ Oscar Omar). Уругвай. 05.12.1927. Нападнік. **ЧС 1950 (4-4)**. «Сюд Амерыка» (1943-47), «Пеньяроль» (1948-55), «Спорцінг Крысталь» (1956-?), Перу. Чэмпіён Уругвая 1949, 1951, 1953, 1954. У чэмпіянаце Уругвая (1948-60) згуляў 137 гульняў, забіў 107 галоў. Найлепшы стралец краіны 1948 (8), 1949 (20). За зб. Уругвая (1950-58) згуляў 39 гульняў, забіў 27 галоў. Удзельнік ЧС 1954 (3-2). Пераможца КА 1956, удзельнік КА 1955.



**МОНЦІ Луіс Фернанда (Луіджы)** (MONTI Luis Fernando (Luigi). Італія – Аргентына. 15.05.1901–09.09.1983. Паўабаронца. **ЧС 1934 (5-0)**. «Сантас Лугарэс» (1915), «Хенераль Мітрэ» (1916-20), «Уракан» (1921), «Сан Ларэнса» (1923-31), «Спарціва Палерма», Арг. (1931), «Ювентус» (1931-39, 225-19). Чэмпіён Італіі 1932, 1933, 1934, 1935. Уладальнік Кубка Італіі 1938. За зб. Аргентыны (1924-30) згуляў 17 гульняў, забіў 6 галоў. Уладальнік КА 1927, срэбны прызёр АГ 1928, срэбны прызёр ЧС 1930 (4-2). За зб. Італіі (1932-36) згуляў 18 гульняў, забіў 1 гол. Трэнераваў «Трыесціну» (1939-40), «Ювентус» (1940-41), «Уракан», Арг. (1947-48), «Пізу» (1949-50). Зорка сусветнага футбола. Адзіны футбаліст, які ў двух фіналах ЧС гуляў за дзве розныя каманды. Пасля Другой сусветнай вайны вярнуўся ў Аргентыну. За сваю жорсткую манеру гульні лічыўся «чэмпіёнам свету сярод касталомаў».



**МОРАН Рубен** (MORAN Ruben). Уругвай. 06.08.1930 – 03.01.1978. Нападнік. **ЧС 1950 (1-0)**. «Серра», Мантэвідэа. Бронзавы прызёр КА 1953.



**МОРЛАК Максыміліян (Макс)** (MORLOCK Maximilian (Max). ФРГ. 11.05.1925 – 10.09.1994. Нападнік. **ЧС 1954 (5-5)**. «Айнтрахт», Нюрнберг (1936-40), «Нюрнберг» (1940-64). Чэмпіён ФРГ 1948 і 1961, уладальнік Кубка ФРГ 1962. За зб. ФРГ (1950-58) згуляў 26 гульняў, забіў 21 гол.

Выбітная постаць у футбольнай гісторыі краіны. Найлепшы футбаліст ФРГ 1961. За «Нюрнберг» згуляў больш за 900 гульняў, у якіх забіў больш за 700 галоў.



**МУР Роберт Фрэдэрык (Бобі)** (MOORE Robert Frederick (Bobby). Англія. 12.04.1941 – 24.02.1993. Абаронца. **ЧС 1966 (6-0)**. «Вэст Хэм Юнайтэд» (1958-74, 544-24), «Фулхэм» (1974-76, 1976-77, 124-1), «Сан Антоніё Тандэр», ЗША (1976, 24-1), «Хернінг Фрэмад», Данія, Д-2 (1978), «Сіэтл Саўндэрс», ЗША (1978, 8-0). Уладальнік КУК 1965 і Кубка Англіі 1964. За зб. Англіі (1962-73) згуляў 108 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік ЧС 1962 (4-0) і 1970 (3-0), КЕ 1964. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968. Адна з найвыбітнейшых постацей у гісторыі брытанскага футбола. Найлепшы футбаліст Англіі 1964, найлепшы спартсмен краіны 1966. Рэкардсмен па колькасці гульняў за зб. у якасці капітана – 91 гульня (у тым ліку – і гульні на пераможным для Англіі ЧС 1966). Трэнераваў «Оксфард» (1979-81), каманду Усходняга Ганконга (1982) і «Саутэнд» (1982-84).



**МЮЛЕР – Луіс Антоніё Карэйя да КОСТА** (MÜLLER – Luiz Antonio Correia da COSTA). Бразілія. 31.01.1967. Нападнік. **ЧС 1994 (1-0)**. «Сан Паула», (1984-87, 1991-94, 1996-01.1997), «Тарына», Іта. (1988-91, 65-24), «Кашыва Рэйсоль», Яп. (1995), «Палмейрас» (1995-96), «Перуджа», Іта. (1997, 6-0), «Сантас» (1997-98), «Крузэйра» (1998-2000), «Карынціянс» (2000-01), «Сан Каэтана» (2002), «Тупі», Мінас Жэраіс (2003), «Партугеза» (07.2003-01.2004), «Іпацінга» (02.2004-03.2004). Уладальнік КЛ і МК 1992 і 1993. Чэмпіён Бразіліі 1986 і 1991, уладальнік Кубка Бразіліі 2000, пераможца чэмпіянатаў штата Сан Паула 1985, 1987, 1991, 1992 і 1996. Найлепшы стралец чэмпіяната Бразіліі 1987 (10). За зб. Бразіліі (1986-98) згуляў 56 гульняў, забіў 12 галоў. Удзельнік ЧС 1986 (5-0) і 1990 (4-2), КА 1987 і 1993. Здабыў тытул чэмпіёна свету за 11 хвілін выступу на трэцім для сябе чэмпіянаце свету ў 1994. Лаўрэат Bola de Prata 1997. У 2004 узначальваў «Іпацінгу».



**МЮЛЕР Герхард (Герд)** (MÜLLER Gerhard (Gerd). ФРГ. 03.11.1945. Нападнік. **ЧС 1974 (7-4)**. «Нёрдлінгэн» (1954-64), «Баварыя» (1964-79, 427-365), «Форт Лаўдэрдэйл Страйкерс», ЗША (1979-81, 63-35), «Сміт Бразэрс», ЗША (1981-82, 17-5). Уладальнік КЕЧ 1974, 1975 і 1976, КУК 1967, МК 1976, чэмпіён ФРГ 1969, 1972, 1973 і 1974. Уладальнік Кубка ФРГ 1967, 1969 і 1971. Найлепшы стралец бундэслігі 1967 (28), 1969 (30), 1970 (38), 1972 (40), 1973 (36), 1974 (30), 1978 (24). За зб. ФРГ (1966-74) згуляў 62 гульні, забіў 68 галоў. Бронзавы прызёр ЧС 1970 (6-10), чэмпіён Еўропы 1972. Зорка сусветнага футболу, фенаменальны стралец. Найлепшы футбаліст Еўропы 1970. Найлепшы футбаліст краіны 1967 і 1969. Рэкардсмен па колькасці галоў у бундэслізе (365) і ў гульнях за зб. ФРГ-Германіі. Уладальнік «Залатой бутсы» 1970 (38) і 1972 (40), «Срэбнай бутсы» 1973 (36). Найлепшы стралец ЧС 1970 (10). Усяго ў фінальных частках ЧС забіў 14 галоў (рэкорд да 2006), у ЧЕ 16 галоў, у КЕЧ – 36 галоў, у КУК – 20, у КУЕФА – 11. У Д-1 згуляў 507 гульняў, забіў 405 галоў.



**НАСАСІ Хасэ** (NASAZZI Jose). Уругвай. 24.05.1901 – 17.06.1968. Абаронца. **ЧС 1930 (4-0)**. «Літа», Д-3 (1918-21), «Роланд Мур» (1921-22), «Белья Віста» (1922-32, 250-8), «Насьяналь» (1932-37, 106-10). Чэмпіён Уругвая 1933 і 1934. За зб. Уругвая (1923-1936) згуляў 39 гульняў (ва ўсіх быў капітанам каманды!). Уладальнік КА 1923, 1924, 1926, 1935, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1924 і 1928. Легендарная постаць у гісторыі уругвайскага футболу, капітан зборнай каманды краіны часоў яе найвялікшага росквіту. У 1945 г. узначальваў зб. Уругвая. Дасягнуў поспехаў таксама ў бізнэсе: на працягу амаль 30 гадоў узначальваў адно з найвялікшых казіно ў Мантэвідэа.



**НІЛТАН Рэйс дос САНТАС** (NILTON Reis dos SANTOS). Бразілія. 16.05.1925. Абаронца. **ЧС 1958 (6-1)**, **ЧС 1962 (6-0)**. «Флэсэйрас», «Батафога» (1948-64). Чэмпіён штата Р-д-Ж 1948, 1953, 1957, 1961, 1962. За зб. Бразіліі (1949-62) згуляў 75 гульняў, забіў 3 галы. Запасны на ЧС 1950. Уладальнік КА 1949, срэбны прызёр КА 1953 і 1959-І, удзельнік КА 1957. Адзін з найлепшых паўднёваамерыканскіх абаронцаў усіх часоў.



**НЭСТА Алясандра** (NESTA Alessandro). Італія. 19.03.1976. Абаронца. **ЧС 2006 (3-0).** «Лацыё» (1993-2002, 193-1), «Мілан» (2002-*, 114-2). Уладальнік КЕЧ 2003, КУК 1999, СК 1999. Чэмпіён Італіі 2000 і 2004, уладальнік Кубка Італіі 1998, 2000 і 2003, Суперкубка Італіі 2004. За зб. Італіі (1996-2006) згуляў 77 гульняў. Удзельнік ЧС 1998 (3-0) і 2002 (3-0), срэбны прызёр ЧЕ 2000, удзельнік ЧЕ 2004 і АГ 1996. Адзін з найлепшых абаронцаў свету. З-за траўмы прапусціў рашаючыя гульні ЧС 2006, але і Матэрацы, які яго замяніў, не сапсаваў гульні зб. Італіі.



**НЭТЦЭР Гюнтэр** (NETZER Günther). ФРГ. 15.03.1949. Паўабаронца. **ЧС 1974 (1-0)**. «Мёнхенгладбах» (1960--63), «Барусія», Мёнхенгладбах (1963-73, 230-82), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1973-76, 85-9), «Грасхоперс», Швайц. (1976-77). Чэмпіён ФРГ 1970 і 1971, Іспаніі 1975 і 1976. уладальнік Кубка ФРГ 1973 і Іспаніі 1974 і 1975. За зб. ФРГ (1965-75) згуляў 37 гульняў, забіў 6 галоў. Чэмпіён Еўропы 1972. Зорка нямецкага футболу, найлепшы футбаліст краіны 1972 і 1973. У бундэсלізе згуляў 230 гульняў, забіў 82 галы. З-за канфліктнага характару не меў сталага месца ў зборнай ФРГ. У 1978-86 працаваў мэнэджэрам «Гамбурга», які за гэты час стаў уладальнікам КЕЧ 1983, пераможцам чэмпіянатаў Германіі 1979, 1982 і 1983, уладальнікам Кубка краіны 1983. Працуе футбольным аглядальнікам на нямецкім тэлебачанні.



**ОВЕРАТ Вольфганг** (OVERATH Wolfgang). ФРГ. 29.09.1943. Паўабаронца. **ЧС 1974 (7-2)**. «Зігбур» (1953-62), «Кёльн» (1962-77). Чэмпіён ФРГ 1964, уладальнік Кубка ФРГ 1968 і 1977. За зб. ФРГ (1963-74) згуляў 81 гульню, забіў 17 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1966 (6-0), бронзавы прызёр ЧС 1970 (6-1), чэмпіён Еўропы 1972. Незаменны гулец зб. ФРГ 60-70-х. Уладальнік бронзавага, срэбнага і залатога медалёў чэмпіянатаў свету. Удзельнічаў ва ўсіх 19 гульнях зб. ФРГ на гэтых турнірах. У бундэслізе забіў 84 галы ў 409 гульнях.

Усяго згуляў 765 афіцыйных гульняў, у якіх забіў 287 галоў. Прэзідэнт «Кёльна» з 2004.



**ОДА Масіма** (ODDO Massimo). Італія. 14.06.1976. Абаронца. **ЧС 2006 (1-0).** «Мілан» (1993-95, 0-0), «Фіярэнцуола», Д-3 (1995-96, 19-0), «Монца», Д-3, Д-2 (1996-11.1996, 1998-99, 34-4), «Прата», Д-3 (11.1996-97, 16-0), «Лека», Д-3 (1997-98, 20-1), «Напалі», Д-2 (1999-2000, 36-1), «Верона» (2000-2002, 64-9), «Лацыё» (2002-2006, 120-12). Уладальнік Кубка Італіі 2004. За зб. Італіі (2002-2006) згуляў 21 гульню. Удзельнік ЧЕ 2004.



**ОРСІ Раймунда Бібіяні** (ORSI Raimundo Bibiani). Аргентына — Італія. 02.12.1901 – 06.04.1986. Нападнік. **ЧС 1934 (5-3)**. «Індэпэндзьентэ», Арг. (1917-29, 1935-37), «Ювентус», Турын, Іта. (1929-35, 177-77), «Сан Ларэнса», Арг. (1937), «Пеньяроль», Уру. (1938), «Фламенга», Бра. (1938). Чэмпіён Аргентыны 1922 і 1926, Італіі 1931, 1932, 1933, 1934, 1935. За зб. Аргентыны (1924-28) згуляў 13 гульняў, забіў 4 галы. Уладальнік КА 1927, срэбны прызёр АГ 1928. За зб. Італіі (1929-35) згуляў 35 гульняў, забіў 13 галоў. Першы ў Італіі «арыундзі» (гулец, які змяніў грамадзянства). Выбітны майстра, адзін з найлепшых нападнікаў свайго часу. У складзе «Індэпэндзьентэ» дэбютаваў у 16 гадоў. Аўтар першага гола, забітага непасрэдна з кутняга ўдара ў матчах еўрапейскіх зборных каманд (гол у браму зб. Партугаліі ў 1931). Пасля сканчэння кар'еры ўзначальваў аргентынскія клубы «Расарыё» і «Мендоса», чылійскі «Пасьёналь», мексіканскую «Атланту». Памёр у Чылі.



**ОРЦІС Оскар Альберта** (ORTIZ Oscar Alberto). Аргентына. 08.04.1953. Нападнік. **ЧС 1978 (6-0)**. «Сан Ларэнса» (1971-76), «Грэміё», Бра. (1976), «Рывер Плэйт» (1977-81), «Уракан» (1981-82), «Індэпэндзьентэ» (1982-83). За зб. Аргентыны (1975-79) згуляў 24 гульні, забіў 2 галы.



**ПАРЭЙРА Карлас Альберта Гомес** (PARREIRA Carlos Alberto Gomes). Бразілія. 25.03.1943. Трэнер. **ЧС 1994**. Асыстэнт галоўных трэнераў зб. Бразіліі на ЧС 1970 і 1974. Узначальваў зб. Кувэйта (1976-83, удзельнік АГ 1980 і ЧС 1982), зб. Бразіліі (1983-84, 2-е месца на КА 1983), зб. Амана (1983-84), «Флумінэнсэ» (1984, чэмпіён Бразіліі 1984), зб. ААЭ (1985, 1990, удзельнік ЧС 1990), зб. Бразіліі (1991-94), «Валенсію», Ісп. (1994-95), «Фенэрбахчэ», Тур. (1995-96), «Сан Паула» (1996), зб. Саудаўскай Аравіі (1998, удзельнік ЧС 1998), «Нью-Ёрк/Нью-Джэрсі Метрастарс», ЗША (1998), «Атлетыка Мінэйра» (2000), «Сантас» (2000-01), «Інтэрнасьёналь» (2001), «Карынціянс» (2002). У 2003 зноў узначаліў зб. Бразіліі, разам з якой стаў уладальнікам КА 2004 і Кубка канфедэрацый 2005. Чакалася, што такім жа трыюмфальным будзе і ЧС 2006, але на гэтым турніры ПАРЭЙРА давёў сваю каманду толькі да ¼ фінала. Найлепшы трэнер свету 1994 і 2005. Як і Мілуцінавіч, браў удзел у пяці чэмпіянатах свету, але не з пяццю, як серб, а з чатырмя рознымі зборнымі.



**ПАС Анібал Луіс** (PAZ Anibal Luis). Уругвай. 18.02.1918. Брамнік. **ЧС 1950 (1/-2)**. «Ліверпуль», Мантэвідэа, «Белья Віста», «Насьяналь» (1939-53, 471 гульня), «Рэсінг», Мантэвідэа. Чэмпіён Уругвая 1939, 1940, 1941, 1942, 1943, 1946, 1947, 1950, 1952. За зб. Уругвая (1939-50) згуляў 25 гульняў. Уладальнік КА 1942, срэбны прызёр КА 1941, удзельнік КА 1949. Дублёр МАСПАЛІ на ЧС 1950.



**ПАСАРЭЛЬЯ Даніэль Альберта** (PASSARELLA Daniel Alberto). Аргентына. 25.05.1953. Абаронца. **ЧС 1978 (7-1)**. «Аргентына Чакабуна» (1965-73), «Сарміента Хунін», Д-2 (1973-74), «Рывэр Плэйт», (1974-82, 1988-89, 266-90), «Вашынгтон Дыпламатс», ЗША (1979), «Фіярэнціна», Іта. (1982-86, 109-26), «Інтэр», Іта. (1986-88, 44-9). Чэмпіён Аргентыны 1975, 1977, 1979, 1980 і 1981. Усяго за кар'еру згуляў 451 гульню, забіў 134 галы – адзін з найлепшых паказчыкаў сярод абаронцаў за ўсю гісторыю футбола. За зб. Аргентыны (1976-86) згуляў 70 гульняў, забіў 22 галы. Удзельнік КА 1979 і ЧС 1982 (5-2), запасны на ЧС 1986. Капітан каманды на ЧС 1978 і 1982. З-за хваробы не згуляў у пераможным для Аргентыны ЧС 1986. Найлепшы футбаліст краіны 1976 па версіі спартыўных журналістаў. Пасля сканчэння кар'еры ўзначальваў «Рывер Плэйт» (1990-94, 01.2006-*, чэмпіён краіны 1990, 1991 і 1993), зб. Аргентыны (1994-98, 2-е месца на АГ 1996, удзельнік ЧС 1998), зб. Уругвая (1999-2000), «Парму», Іта. (12.2001-02.2002), «Мантэрэй», Мекс. (04.2002-2004, чэмпіён краіны 2003), «Карынціянс», Бра. (03.2005-05.2005). У час кіравання зб. Аргентыны вызначыўся тым, што прымушаў гульцоў з доўгімі валасамі стрыгчыся, з-за чаго пасварыўся з некаторымі зоркамі сваёй каманды (у прыватнасці – з Габрыэлем БАЦІСТУТАМ). Найлепшы трэнер Паўднёвай Амерыкі 1997 па версіі «Эль Паіс».



**ПАСІНАЦІ Пьетра** (PASINATI Pietro). Італія. 21.07.1910. Нападнік. **ЧС 1938 (1-0)**. «Трыесціна» (1928-46), «Крэманэзэ» (1946-47). У Серыі «А» згуляў 406 гульняў, забіў 44 галы. За зб. Італіі (1936-38) згуляў 11 гульняў, забіў 5 галоў. Працаваў трэнерам у «Трыесціне» (1955-57), «Катанзара» (1957-61).



**ПАСКУЛІ Педра Пабла** (PASCULLI Pedro Pablo). Аргентына. 17.05.1960. Нападнік. **ЧС 1986 (2-1)**. «Калон», Санта Фэ (1978-80, 24-6), «Архенцінас Хуніёрс» (1980-85, 203-87), «Леччэ», Іта. (1985-92, 119-29), «Футурэ Шысуока», Яп. (1994-95), «Казертана», Казерта, Д-V, Іта. (1995-96, 17-4). Найлепшы стралец чэмпіяната Аргентыны 1984 (Н) – 9. За зб. Аргентыны (1985-87) згуляў 16 гульняў, забіў 4 галы. Узначальваў італьянскія ам. клубы «Сан Пьетра» (2001-02), «Вербанія» (2002-03), «Парабіта» (2003-04), зб. Уганды (05.2003-09.2003), зб. Італіі па пляжным футболе (2004), «Дынама», Алб. (09.2004-10.2004).



**ПАУЛА СЕРЖЫЁ Сільвэстр Насімента** (PAULO SERGIO Silvestre Nascimento). Бразілія. 06.02.1969. Нападнік. **ЧС 1994 (2-0)**. «АКЛ Імакоу», «Эспарцїва Новарызанціна», (1989), «Карынціянс» (1988, 1990-92, 45-6), «Баер», Леверкузэн, Герм. (1993-97, 121-47), «Рома», Іта.

(1997-99, 64-24), «Баварыя», Герм. (1999-2002, 77-21), «Аль-Вахда», ААЭ (07.2002-11.2002, 2004-*), «Байя» (2003). Чэмпіён Бразіліі 1990, Германіі 2000, 2001 і 2002. За зб. Бразіліі (1993-95) згуляў 20 гульняў.



**ПЕЛЕ – Эдсан Арантэс дэ НАСІМЕНТА** (PELE – Edson Arantes do NASCIMENTO). Бразілія. 23.10.1940. Нападнік. **ЧС 1958 (4-6)**, **ЧС 1962 (2-1)**, **ЧС 1970 (6-4)**. «Атлетыка Бауру» (1953-56), «Сантас» (1956-74, 1114-1091), «Космас», Ню-Ёрк, ЗША (1975-77, 108-65), «Флумінэнсэ» (1978, 1-0). Уладальнік КЛ 1962 і 1963, МК 1962 і 1963. Чэмпіён штата Сан Паула 1956, 1958, 1960, 1961, 1962, 1963, 1964, 1965, 1967, 1968, 1969. Уладальнік Кубка Бразіліі 1961, 1962, 1963, 1964 і 1965. Чэмпіён NASL 1977. За зб. Бразіліі (1957-71) згуляў 92 гульні, забіў 77 галоў. Удзельнік ЧС 1966 (2-1). Забіваў галы ў фінальных частках чатырох ЧС (такім дасягненнем можа пахваліцца толькі немец ЗЭЕЛЕР)! Другі пасля ВАВЫ гулец, які забіваў галы ў двух фінальных матчах ЧС. Срэбны прызёр КА 1959-І. Усяго за кар'еру згуляў 1362 гульні, забіў 1282 галы. Найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1960, 1964, 1965, 1970, а таксама 1973 (апошні раз – па версіі венесуэльскай «Эль Мунда»), найлепшы футбаліст NASL 1976. Рэкардсмен чэмпіянатаў штата Сан Паула па колькасці галоў (58) за адзін сезон (1958). Усяго перамагаў у спаборы найлепшых стральцоў гэтага штату 11 разоў (1957, 1958, 1959, 1960, 1961, 1962, 1963, 1964, 1965, 1966 і 1974). У 1964 у складзе «Сантаса» забіў 8 галоў у браму «Батафога» (агульны лік 11-0). Найлепшы ў свеце па колькасці забітых у гульнях Д-1 галоў футбаліст (541 гол у 560 гульнях). Наймалошы ўладальнік Кубка свету, наймалодшы аўтар хет-трыка на ЧС. Па версіі IFFHS – найлепшы футбаліст XX ст. З 1994 да 1997 – міністр спорта Бразіліі.



**ПЕРОТА Сімонэ** (PERROTTA Simone). Італія. 17.09.1977. Паўабаронца. **ЧС 2006 (7-0).** «Рэджына», Д-2 (1995-98, 77-1), «Ювентус» (1998-99, 5-0), «Бары» (1999-2001, 56-1), «Кьева» (2001-04, 95-6), «Рома» (2004-*, 65-8). За зб. Італіі (2002-2006) згуляў 31 гульню, забіў 1 гол. Удзельнік ЧЕ 2004 (3-1).



**ПЕРЭС Хуліё Гервасіё** (PEREZ Julio Gervasio). Уругвай. 19.06.1926–21.09.2002. Нападнік. **ЧС 1950 (4-0)**. «Рэсінг», Арг. (1945-48), «Рывер Плэйт», Арг. (1949), «Насьяналь» (1950-57), «Інтэрнасьёналь», Браз. (1957), «Сюд Амерыка» (1957-60), OFI (1960-63). Чэмпіён Уругвая 1950, 1952, 1955 і 1956. За зб. Уругвая (1947-56) згуляў 22 гульні, забіў 8 галоў. Запасны на ЧС 1954. Меў мянушку «Шалёныя ногі». Трэнераваў «Сюд Амерыка» (1964-67), «Рэсінг» (1968), «Дэфенсар» (1979-80), «Алімпія», Пар. (1980), «Фенікс» (1981), «Веракрус», Мекс. (1982-83).



**ПЕТРОНЭ Педра** (PETRONE Pedro). Уругвай. 11.05.1905 – 16.12.1964. Нападнік. **ЧС 1930 (1-0)**. «Чарлі Сальферына» (1921-24), «Насьяналь» (1924-31, 1933-34, 97-103), «Фіярэнціна», Іта. (1931-33, 44-37). Чэмпіён Уругвая 1933. За зборную Уругвая (1923-1930) згуляў 28 гульняў, забіў 24 галы. Уладальнік КА 1923 і 1924 (быў найлепшым стральцом кожнага з гэтых турніраў, забіўшы па 4 галы), срэбны

прызёр КА 1927, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1924 і 1928. Адзін з найлепшых нападнікаў у гісторыі паўднёваамерыканскага футбола. У складзе «Насьяналя» забіў 146 галоў у 128 гульнях, з іх у чэмпіянаце Уругвая 103 у 97 гульнях. Найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 1932 (25). У 19 гадоў стаў найлепшым стральцом АГ 1924 (8).



**ПЕЦІ Эманюэль** (PETIT Emmanuel). Францыя. 22.09.1970. Паўабаронца. **ЧС 1998 (6-2)**. «Манако», (1988-97, 222-4), «Арсенал», Англ. (1997-2000, 85-9), «Барселона», Ісп. (2000-2001, 23-1), «Чэлсі», Англ. (2001-2004, 55-2). Чэмпіён Францыі 1997, уладальнік Кубка Францыі 1991. Чэмпіён і ўладальнік Кубка Англіі 1998, уладальнік Суперкубка Англіі 1999. За зб. Францыі (1990-2003) згуляў 63 гульні, забіў 6 галоў. Чэмпіён Еўропы 2000. Удзельнік ЧС 2002 (2-0). Адзін з асноўных гульцоў зб. Францыі часоў яе ўзлёту ў канцы 90-х. Аўтар трэцяга гола ў браму бразільцаў у фінале ЧС 1998.



**ПІАЦА Вілсан да Сільва** (PIAZZA Wilson da Silva). Бразілія. 25.02.1943. Паўабаронца. **ЧС 1970 (6-0)**. «Рэнасэнца», Мінас Жэраіс, «Крузэйра» (1963-79, 487-112). Уладальнік КЛ 1976, уладальнік Кубка Бразіліі 1966, чэмпіён штата Мінас Жэраіс 1965, 1966, 1967, 1968, 1969, 1972, 1973, 1974, 1975 і 1977. За зб. Бразіліі (1967-76) згуляў 51 гульню. Удзельнік ЧС 1974 (3-0) і КА 1975. Капітан зб. Бразіліі ва ўсіх сваіх трох гульнях на ЧС 1974. Лаўрэат Bola de Prata 1972.



**ПІЁЛА Сільвіё** (PIOLA Silvio). Італія. 29.09.1913 – 03.10.1996. Нападнік. **ЧС 1938 (4-5)**. «Про Верчэлі» (1929-34, 126-51), «Лацыё» (1934-43, 227-143), «Тарына» (1944-45, 57-26), «Ювентус» (1945-52, 185-86), «Навара» (1952-54). Чэмпіён Італіі 1950, 1952. Найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 1937 (21) і 1943 (21). За зб. Італіі (1935-52) згуляў 34 гульні, забіў 30 галоў. Найлепшы італьянскі стралец усіх часоў. Рэкардсмен чэмпіянатаў краіны па колькасці забітых галоў (290 у 566 гульнях). Доўгі час (да 1983, калі яго дасягненне пераўзыйшоў ДЗОФ), быў рэкардсменам і па колькасці гульняў у Серыі «А». Працаваў асыстэнтам тр. зб. Італіі на ЧС 1954, трэнерам «Кальяры» (1954-56, 1957-58).



**ПІРЛА Андрэа** (PIRLO Andrea). Італія. 19.07.1979. Паўабаронца. **ЧС 2006 (7-1).** «Брэшыя» (1994-98, 2001, 57-6), «Інтэр» (1998-99, 2000-2001, 22-0), «Рэджына» (1999-2000, 28-6), «Мілан» (2001-*, 141-23). Уладальнік КЕЧ 2003, чэмпіён Італіі 2004, уладальнік Кубка Італіі 2003. За зб. Італіі (2002-2006) згуляў 31 гульню, забіў 5 галоў. Удзельнік ЧЕ 2004, бронзавы прызёр АГ 2004, удзельнік АГ 2000. Галоўны канструктар гульні зб. Італіі на паспяховым для яе ЧС 2006 г. Трэці ў спаборы за тытул лепшага гульца турніра (пасля Зідана і Канавара).



**ПІРЭС Рабэр** (PIRES Robert). Францыя. 29.10.1973. Паўабаронца. **ЧС 1998 (3-0)**. «Рэймс», (1991-92), «Мец» (1992-98, 162-43), «Алімпік», Марсэль (1998-2000, 66-8)

«Арсенал», Англ. (2000-2006, 189-62). Уладальнік Кубка Французкай Лігі 1996. Чэмпіён Англіі 2002 і 2004, уладальнік Кубка Англіі 2002, 2003 і 2005. За зб. Францыі (1996-2006) згуляў 79 гульняў, забіў 14 галоў. Чэмпіён Еўропы 2000, удзельнік ЧЕ 2004, удзельнік АГ 1996. Найлепшы футбаліст Англіі 2002 па версіі брытанскіх журналістаў. З-за атрыманай у сакавіку 2002 траўмы вымушаны быў прапусціць ЧС ў Японіі і Карэі.



**ПІТЭРС Марцін** (PETERS Martin). Англія. 08.11.1943. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1966 (5-1)**. «Дагенхэм» (1953-59), «Вэст Хэм Юнайтэд» (1960-70, 302-81), «Тотэнхэм Хотспур» (1970-75, 189-46), «Норвіч Сіці» (1975-80, 207-44), «Шэфілд Юнайтэд» (1980-81, 24-4). Уладальнік КУК 1965, Кубка УЕФА 1972, Кубка Англіі 1964 і Кубка Лігі 1973. За зб. Англіі (1966-74) згуляў 67 гульняў, забіў 21 гол. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968. Удзельнік ЧС 1970 (4-1). Згуляў больш за 700 гульняў у чэмпіянаце краіны, адзін з лідэраў зб. Англіі канца 1960-х гг.



**ПІЦЫЁЛА Марыё** (PIZZIOLO Mario). Італія. 08.12.1909 – 30.04.1990. Паўабаронца. **ЧС 1934 (2-0)**. «Фіярэнціна» (1929-36, 142-2). За зб. Італіі (1933-36) згуляў 12 гульняў, забіў 1 гол. Узначальваў «Пескару».



**ПОЗІПАЛЬ Ёзаф** (POSIPAL Josef). ФРГ. 20.06.1927 – 21.02.1997. Абаронца, паўабаронца. **ЧС 1954 (5-0)**. «Ліндэн-07» (1943-46), «Армінія», Гановэр (1946-49), «Гамбург» (1949-56, 288-15). За зб. ФРГ (1951-56) згуляў 32 гульні, забіў 1 гол. Нарадзіўся ў Румыніі, сын румына і мадзьяркі. Ягоны сын, Пер Позіпаль (нар. 1962), таксама гуляў у нямецкай лізе за «Гамбург» (1976-82) і «Айнтрахт», Браўншвайг (1982-90) – у тым ліку ў бундэслізе 30 гульняў, 2 галы.



**ПОЦЦА Віторыё** (POZZO Vittorio). Італія. 12.03.1886 – 21.12.1968. Трэнер. **ЧС 1934** і **ЧС 1938**. Гуляў за «Грасхоперс», Швайц. (1905-06), «Тарына» (1906-11). Узначальваў «Тарына» (1915-22). Трэнер зб. Італіі (1912, 1924,1929-48, 95+63=17-15, 233:126). Узначальваў зб. Італіі на АГ 1912, 1924, 1936 і 1948. Чэмпіён АГ 1936. Выбітная постаць італьянскага футболу, чалавек, які прывёў зб. Італіі да тытула чэмпіёнаў свету. Пасля сканчэння трэнерскай кар'еры зрабіў сабе журналісцкую кар'еру ў газэце «La Stampa».



**ПУМПІДА Нэры Альберта** (PUMPIDO Nery Alberto). Аргентына. 30.07.1957. Брамнік. **ЧС 1986 (7/-5)**. «Уніён», Санта Фэ (1976-81, 1991-92, 172 гульні), «Велес Сарсфілд» (1982-83, 78 гульняў), «Рывер Плэйт» (1984-88, 124 гульні), «Беціс», Ісп. (1988-91), «Ланус» (1992). Уладальнік КЛ і МК 1986. У чэмпіянаце Аргентыны згуляў 376 гульняў. За зб. Аргентыны (1983-90) згуляў 38 гульняў. Срэбны прызёр ЧС 1990 (2/-1), запасны на ЧС 1982. Удзельнік КА 1983, бронзавы прызёр КА 1989. Моцны брамнік і здольны трэнер: узначальваў «Бока Хуніёрс» (1996), «Уніён» Санта-Фэ (1999-2002), «Алімпія», Парагвай (2002-2003, уладальнік КЛ 2002), «Цігрэс», Мекс. (2003-2005), «Ньюэлс Олд Бойс» (10.2005-*).



**ПФАФ Альфрэд** (PFAFF Alfred). ФРГ. 16.07.1926. Нападнік. **ЧС 1954 (1-1)**. «Родэхайм» (1935-48), «Айнтрахт», Ф-н-М (1948-62). Чэмпіён ФРГ 1959. У складзе «Айнтрахта» згуляў 324 афіцыйныя гульні, забіў 111 галоў (чацвёрты вынік у гісторыі клуба). У складзе зб. ФРГ (1953-56) згуляў 7 гульняў, забіў 2 галы. Пасля перамогі на ЧС 1954 мадрыдскі «Атлетыка» прапаноўваў за ПФАФА вялізную на тыя часы суму ў 180 тыс. нямецкіх марак, але футбаліст адмовіўся пакідаць радзіму.



**ПФЛЮГЛЕР Ханс** (PFLÜGLER Hans). ФРГ. 27.03.1960. Абаронца. **ЧС 1990 (1-0)**. «Баварыя» (1975-95, 267-36), «Фрайсінг» (1997-99), «Баварыя»-ам. (2001-02, 32-4). Чэмпіён ФРГ 1985, 1986, 1987, 1989 і 1990, уладальнік Кубка ФРГ 1982, 1984 і 1986. За зб. ФРГ (1987-90) згуляў 11 гульняў. Паўфіналіст ЧЕ 1988.



**ПЭЙН Тэрэнс Лаянэл** (PAINE Terence Lionel). Англія. 23.03.1939. Нападнік. **ЧС 1966 (1-0)**. «Саутгемптан» (1957-73, 713-160), «Харфорд» (1973-77, 111-8). За зб. Англіі (1963-66) згуляў 19 гульняў, забіў 7 галоў. Рэкардсмен «Саутгемптана» па колькасці гульняў у чэмпіянатах Англіі.



**РАБЕРТА – МІРАНДА Раберта Лопес** (ROBERTO – MIRANDA Roberto Lopes). Бразілія. 31.07.1943. Нападнік. **ЧС 1970 (2-0)**. «Батафога» (1963-72, 348-150). Уладальнік Кубка Бразіліі 1968, чэмпіён штата Р-д-Ж 1962, 1967 і 1968. За зб. Бразіліі (1967-72) згуляў 13 гульняў, забіў 5 галоў. Удзельнік АГ 1964.



**РАБЕРТА КАРЛАС да Сільва** (ROBERTO CARLOS da Silva). Бразілія. 19.04.1973. Абаронца. **ЧС 2002 (6-1)**. «Уніён Сан-Жааа» (1990-93), «Палмейрас» (1993-95, 68-5), «Інтэр», Іта. (1995-96, 30-5), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1996-*, 347-45). Уладальнік КЕЧ 1998, 2000 і 2002. Уладальнік МК 1998 і 2002, уладальнік СК 2002. Чэмпіён Іспаніі 1997, 2001 і 2003, чэмпіён Бразіліі 1994. За зб. Бразіліі (1992-2006) згуляў 125 гульняў, забіў 11 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1998 (7-0), удзельнік ЧС 2006 (4-0). Бронзавы прызёр АГ 1996, пераможца КА 1997 і 1999. Адзін з найлепшых гульцоў свету канца XX – пач. XXI ст. Уладальнік Bola de Prata 1994. Скончыў выступы за зб. Бразіліі пасля няўдалага для яе ЧС 2006.



**РАВА П'етра** (RAVA Pietro). Італія. 20.01.1916. Абаронца. **ЧС 1938 (4-0)**. «Ювентус» (1935-46, 1947-50, 289-13), «Алесандрыя» (1946-47, 38-6). Чэмпіён Італіі 1950, уладальнік Кубка Італіі 1938 і 1942. За зб. Італіі (1936-46) згуляў 30 гульняў. Чэмпіён АГ 1936. Працаваў трэнерам у клубах «Падова» (1952-54), «Палерма» (1957-58), «Алесандрыя» (1961-63).



**РАІ Соуза Віейра дэ АЛІВЕЙРА** (RAI Souza Vieira de OLIVEIRA). Бразілія. 15.05.1965. Паўабаронца. **ЧС 1994 (5-1)**. «Батафога» (1984-86), «Понтэ Прэтэ» (1986-87), «Сан Паула» (1988-92, 1998-2000), «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра. (1992-98, 147-51). Уладальнік КЛ і МК 1992, КУК 1996.

Чэмпіён Бразіліі 1991, Францыі 1994, уладальнік Кубка Францыі 1995 і 1998, Кубка французкай Лігі 1994. У чэмпіянаце Бразіліі згуляў 101 гульню, забіў 30 галоў. За зб. Бразіліі (1987-98) згуляў 49 гульняў, забіў 15 галоў. Удзельнік КА 1987, срэбны прызёр КА 1991. Найлепшы футбаліст Бразіліі і Паўднёвай Амерыкі 1992, найлепшы футбаліст фінала МК 1992. Уладальнік прыза Bola de Prata 1989. Малодшы брат славутага САКРАТЭСА – зоркі бразільскага футбола 1980-х гадоў. Па сканчэнні кар'еры заснаваў дабрачынны фонд, які займаецца дапамогай дзецям з бедных сем'яў.



**РАМАРЫЁ да Соза ФАРЫЯ Фільо** (ROMARIO da Souza FARIA Filho). Бразілія. 29.01.1966. Нападнік. **ЧС 1994 (7-5)**. «Арларыё», (1979-80), «Васка да Гама» (1980-88, 2000, 01.2005-04.2006, 292-201), ФСФ «Эйндховен», Гал. (1988-93, 109-98), «Барселона», Ісп. (1993-01.95, 46-34), «Фламенга» (01.1995-96, 1997, 1999, 145-132), «Валенсія», Ісп. (1996, 1997-98, 9-5), «Аль-Саад», Катар (02.2003-05.2003, 3-0), «Флумінэнсэ» (05.2003-10.2004, 34-18), «Маямі», ЗША (04.2006). Чэмпіён Галандыі 1991, 1992, 1993, Іспаніі 1994, Бразіліі 2000. Уладальнік Кубка Галандыі 1989 і 1990. Чэмпіён штата Р-д-Ж 1987, 1988, 1996, 1999 і 2000. Найлепшы стралец чэмпіянатаў Галандыі 1989 (19), 1990 (23), 1991 (25), Іспаніі 1994 (30), Бразіліі 2000 (20), 2001 (21), 2005 (22). Сем разоў станавіўся найлепшым стральцом чэмпіянатаў штата Р-д-Ж (1986, 1987, 1996, 1997, 1998, 1999, 2000). У складзе «Васка да Гамы» у 2000 за сезон забіў у афіцыйных гульнях 67 галоў! За зб. Бразіліі (1987-2001, 2005) згуляў 70 гульняў, забіў 55 галоў. Удзельнік КА 1987. Срэбны прызёр АГ 1988. Пераможца КА 1989 і КА 1997, удзельнік ЧС 1990 (1-0). Найлепшы футбаліст свету 1994, найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі (па версіі «Эль Паіс») і Бразіліі 2000. Уладальнік Bola de Prata 2000. Найлепшы футбаліст ЧС 1994. Трэці пасля ПЕЛЕ і РАНАЛЬДА па колькасці галоў за зборную Бразіліі. Меў усе шанцы патрапіць на ЧС 2002 пасля шэрагу выбітна праведзеных сезонаў, аднак трэнер бразільцаў Феліпэ СКАЛАРЫ паасцярогся цяжкага характару РАМАРЫЁ і не ўзяў таго ў каманду. 25.04.2004 у складзе «Флумінэнсэ» забіў свой 900-ты гол у афіцыйных гульнях! У красавіку 2005 г. згуляў развітальны матч за зб. Бразіліі ў таварыскай сустрэчы з камандай Гватэмалы. Па стане на 31.12.2005 меў першы вынік па колькасці забітых галоў у Д-1 сярод дзеючых футбалістаў – 485 галоў у 603 гульнях (чацвёрты вынік за ўсю гісторыю футбола).



**РАМСЭЙ Альфрэд Эрнст** (RAMSEY Alfred Ernst). Англія. 22.01.1920 – 30.04.1999. Трэнер. **ЧС 1966**. У якасці абаронцы гуляў за «Эссэкс Скул», «Файф Элмс», «Армі Футбол», «Саутгемптан» (1942-49, 90-8), «Тотэнхэм Хотспур» (1949-55, 250-24). Чэмпіён Англіі 1951. У складзе зб. Англіі (1948-53) згуляў 32 гульні, забіў 3 галы. Узначальваў «Іпсвіч Таун» (1955-63, вывеў з III-га дывізіёна ў першы і зрабіў клуб чэмпіёнам краіны 1962) і зб. Англіі (1963-74, 113+69=27-17). Бронзавы прызёр ЧЕ 1968, удзельнік ЧС 1970. Трэнер, які прывёў зб. Англіі да тытулу чэмпіёнаў свету. За гэтае дасягненне атрымаў у 1966 шляхецкі чын. Трэнерскую кар'еру (апошнім клубам, які ачольваў РАМСЭЙ, быў «Бірмінгем Сіці» (1976-78) скончыў з-за пагаршэння стану здароўя.

**РАН Хельмут** (RAHN Helmut). ФРГ. 16.08.1929 – 13.08.2003. Нападнік. **ЧС 1954 (4-4)**. «Альтэнэссэн 1912» (1938-46), «Аэлдэ-1909» (1946-50), «Катэнберг» (1950-51), «Рот-Вайс», Эсэн (1951-59), «Кёльн» (1959-61), «Твэнтэ», Гал. (1961-63), «Мэйдэрыхер» (1963-66). Чэмпіён ФРГ 1955, уладальнік Кубка ФРГ 1953. У чэмпіянаце ФРГ у 260 гульнях забіў 106 галоў. За зб. ФРГ (1951-60) згуляў 40 гульняў, забіў 21 гол. Удзельнік ЧС 1958 (6-6). Выбітны нападнік па мянушцы «Бульдозер». У 10 гульнях на двух ЧС забіў 10 галоў!





**РАНАЛЬДА – РАНАЛЬДА Луіс Назарыё дэ Ліма** (RONALDO – RONALDO Luis Nazario de Lima). Бразілія. 22.09.1976. Нападнік. **ЧС 2002 (7-8)**. «Сацыяль Рамас» (1990-91), «Сан-Крыставаа», Д-2 (1991-93, 54-36), «Крузэйра» (1993-94, 14-12), «ФСФ Эйндховен», Гал. (1994-96, 45-42), «Барселона», Ісп. (1996-97, 37-34), «Інтэр», Іта. (1997-2002, 69-49), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (2002-06*, 120-82). Уладальнік КУК 1997, КУЕФА 1998, МК 2002 (найлепшы футбаліст фінала). Чэмпіён Іспаніі 2003, уладальнік Кубка Галандыі 1996, Кубка Іспаніі 1997, Суперкубка Іспаніі 1996, найлепшы стралец чэмпіянатаў Галандыі 1995 (30) і Іспаніі 1997 (34) і 2004 (24), уладальнік «Залатой бутсы» (1997). За зб. Бразіліі (1994-2006) згуляў 97 гульняў, забіў 62 галы. Срэбны прызёр ЧС 1998 (7-4, найлепшы гулец турніра), удзельнік ЧС 2006 (5-3), запасны на ЧС 1994. Бронзавы прызёр АГ 1996, уладальнік КА 1997 і 1999. Уладальнік «Залатога мяча» 1997 і 2002. Найлепшы футбаліст свету па версіі ФІФА 1996, 1997 і 2002. Найлепшы малады футбаліст Еўропы 1997 і 1998. Найлепшы стралец ЧС 2002. На ЧС 2006 забіў свой 15-ты гол у фінальных частках гэтага турніра і стаў аднаасобным лідэрам па гэтым паказчыку. З-за траўмаў прапусціў амаль цалкам сезоны 2000/2001 і 2001/2002. Вяртанне на поле атрымалася трыюмфальным – перамога на ЧС і чарговае прызнанне найлепшым футбалістам года ў свеце! Адзін з найдаражэйшых футбалістаў свету. Яшчэ у 1994, у 18-ці гадовым узросце быў куплены за 10 млн. долараў (рэкордная для Галандыі сума, пералічаная за трансфер футбаліста) «Эйндховенам». Праз два гады за рэкордную для сусветнага футбола суму ў 19,5 млн. долараў пераходзіць у «Барселону». Яшчэ праз год б'е ўласны рэкорд пры пераходзе ў «Інтэр» – 27,9 млн.! У 2002 «Рэал» плаціць за РАНАЛЬДА 46 млн. долараў. Працяг будзе?



**РАНАЛЬДЗІНЬЁ – Ранальда дэ АСІС Марэйра** (RONALDINHO – Ronaldo de ASSIS Moreira). Бразілія. 21.03.1980. Нападнік. **ЧС 2002 (5-2)**. «Грэміё», (1997-2001, 34-13), «Пары Сэн-Жэрмэн», Фра. (2001-2003, 55-17), «Барселона», Ісп. (2003-*, 96-41). Уладальнік КЕЧ 2006. Чэмпіён Іспаніі 2005 і 2006, уладальнік Суперкубка Іспаніі 2005. Чэмпіён штата Рыё Грандэ 1999. За зб. Бразіліі (1999-2006) згуляў 68 гульні, забіў 27 галоў. Удзельнік ЧС 2006 (5-0). Пераможца КА 1999. Уладальнік Кубка Канфедэрацый 2005, срэбны прызёр Кубка Канфедэрацый 1999 (найлепшы футбаліст і стралец турніра). Адзін з найбольш яркіх гульцоў на ЧС 2002 і, бадай, адно з найбольшых расчараванняў на ЧС 2006, дзе так і не змог наблізіцца да сваёй найлепшай формы. Найлепшы футбаліст свету 2004 і 2005, лаўрэат Bola de Prata 2000. Уладальнік «Залатога мяча» 2005.



**РАСЭТА Віржыніё** (ROSETTA Virginio). Італія. 16.07.1902 – 29.03.1975. Абаронца. **ЧС 1934 (1-0)**. «Про Верчэлі» (1920-24), «Ювентус» (1924-34, 338-15). Чэмпіён Італіі 1921, 1922, 1931, 1932, 1933, 1934. За зб. Італіі (1920-34) згуляў 52 гульні. Удзельнік АГ 1920 і 1924, бронзавы прызёр АГ 1928. Капітан каманды ў адзінай сваёй гульні на ЧС 1934. Славуты абаронца, удзельнік трох Алімпіядаў, шматгадовы капітан зб. Італіі. Кар'еру спыніла траўма, атрыманая ў гульні ЧС 1934 з ЗША. Трэнер «Ювентуса» (1935-38, Кубак Італіі 1938), «Лукезэ» (1939-40), «Палерма» (1947-48).



**РОЙТЭР Стэфан** (REUTER Stefan). ФРГ — Германія. 16.10.1966. Абаронца, паўабаронца. **ЧС 1990 (6-0)**. «Нюрнберг», Д-ІІ (1984-85, 25-3), «Нюрнберг» (1985-88, 90-6), «Баварыя» (1988-91, 95-4), «Ювентус», Іта. (1991-92, 28-0), «Барусія», Дортмунд (1992-2004, 307-11). Уладальнік КЕЧ 1997, МК 1997. Чэмпіён ФРГ-Германіі 1989, 1990, 1995, 1996 і 2002. За зб. ФРГ-Германіі (1987-98) згуляў 69 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік ЧС 1994 (4-0) і 1998 (1-0). Срэбны прызёр ЧЕ 1992, чэмпіён Еўропы 1996. Адзін з самых стабільных гульцоў нямецкага футболу 1990-х гадоў. У красавіку 2004 згуляў сваю 500-ю гульню у бундэслізе.



**РОКЕ ЖУНІЁР Жазэ Вітор** (ROQUE JUNIOR Jose Vitor). Бразілія. 31.08.1976. Абаронца. **ЧС 2002 (6-0)**. «Уніаа» Сан Жааа (1994), «Палмейрас» (1995-99, 2000, 81-3), «Мілан», Іта. (2000, 2001-2003, 19-1), «Лідс Юнайтэд» (10.2003-01.2004, 5-0), «Сіена», Іта. (01.2004-05.2004, 4-0), «Баер», Леверкузэн, Герм. (07.2004-*, 34-0). Уладальнік КЕЧ 2003, Кубка Італіі 2003. За зб. Бразіліі (1999-2005) згуляў 48 гульняў, забіў 2 галы. Удзельнік КА 2001. Уладальнік Кубка канфедэрацый 2005. Уладальнік Bola de Prata 1999.



**РОСІ Паола** (ROSSI Paolo). Італія. 23.09.1956. Нападнік. **ЧС 1982 (7-6)**. «Каталіка Віртус», Прата (1971-73), «Ювентус» (1973-75, 1981-85, 83-24), «Кома» (1975-76, 6-0), «Ланэросі», Вічэнца (1976-78, 84-60), «Перуджа» (1978-81, 28-13), «Мілан» (1985-86, 20-2), «Верона» (1986-87, 20-4). Уладальнік КЕЧ 1985, КУК 1984, СК 1984, чэмпіён Італіі 1984, уладальнік Кубка Італіі 1983. Найлепшы стралец чэмпіяната краіны 1978 (24). За зб. Італіі (1977-86) згуляў 48 гульняў, забіў 20 галоў. Удзельнік ЧС 1978 (7-3). Запасны на ЧС 1986. Найлепшы футбаліст Еўропы і ЧС 1982, найлепшы гулец і стралец (6 галоў) гэтага турніру. Цікава, што ўсе свае галы на гэтым турніры забіў у трох апошніх рашаючых гульнях. У 1979 г. разам з шэрагам іншых футбалістаў быў дыскваліфікаваны за ўдзел у «чорным таталізатары». Пакаранне было знята толькі перад пачаткам ЧС 1982. Найлепшы футбаліст Італіі 1978.



**РУДЖЭРЫ Оскар Альфрэда** (RUGGERI Oscar Alfredo). Аргентына. 26.01.1962. Абаронца. **ЧС 1986 (7-1)**. «Бока Хуніёрс» (1980-84, 142-8), «Рывер Плэйт» (1984-88, 94-5), «Лаграньес», Ісп. (1988-89, 34-1), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1989-90, 31-2), «Велес Сарсфілд» (1990-92, 65-5), «Анкона», Іта. (1992-93, 7-1), «Амерыка», Мекс. (1993, 27-4), «Сан Ларэнса» (1994-

97, 111-10), «Ланус» (1997, 13-2). Уладальнік КЛ і МК 1986. Чэмпіён Аргентыны 1981 і Іспаніі 1990. За зб. Аргентыны (1983-94) згуляў 97 гульняў, забіў 7 галоў. Срэбны прызёр ЧС 1990 (5-0), удзельнік ЧС 1994 (4-0). Уладальнік КА 1991 і 1993, бронзавы прызёр КА 1989, удзельнік КА 1987. Доўгі час быў рэкардсменам па колькасці гульняў за зб. Аргентыны. Найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1991 (па версіі «Эль Паіс»). Найлепшы футбаліст краіны 1991. Усяго ў Д-1 згуляў 524 гульні, забіў 41 гол. Выбітны майстар гульні галавой, «падмурак» абароны зб. Аргентыны. Пасля сканчэння кар'еры гульца ўзначальваў «Сан Ларэнса» (1998-2001, 2006-*), мексіканскія «Гвадалахару» (2001-03) і «Амерыку» (2004), «Індэпэндзьентэ» (2003), «Эльчэ», Ісп. (12.2004-2005).



**РЫВАЛДА – Віктор Борба ФЕРЭЙРА** (RIVALDO – Victor Borba FERREIRA). Бразілія. 19.04.1972. Нападнік. **ЧС 2002 (7-5)**. «Паулістана», Рэсіфэ (1989-90), «Санта Круз», Рэсіфэ (1991-92), «Моджы-Мірым» (1992, 27-9), «Карынціянс» (1993-94, 19-11), «Палмейрас» (1994-96, 86-57), «Дэпарціва», Ла-Каруньья, Ісп. (1996-97, 41-21), «Барселона», Ісп. (1997-2002, 157-86), «Мілан», Іта. (2002-12.2003, 22-5), «Крузэйра» (12.2003-03.2004, 10-2), «Алімпіякас», Грэ. (07.2004-*, 46-26). Уладальнік СК 1997. Чэмпіён Бразіліі 1994, Іспаніі 1998 і 1999, Грэцыі 2005 і 2006. Уладальнік Кубка Іспаніі 1998, Кубка Італіі 2003, Кубка Грэцыі 2005 і 2006. За зб. Бразіліі (1993-2003) згуляў 74 гульні, забіў 34 галы. Срэбны прызёр ЧС 1998 (7-3), бронзавы прызёр АГ 1996, пераможца КА 1999. Уладальнік «Залатога мяча» 1999. Лаўрэат Bola de Prata 1993 і 1994. Адзін з самых яркіх футбалістаў свету канца XX-га ст.



**РЫВЕЛІНА Рабэрта** (RIVELINO Roberto). Бразілія. 01.01.1946. Паўабаронца. **ЧС 1970 (5-3)**. «Карынціянс» (1965-74, 471-141), «Флумінэнсэ» (1975-78, 158-53), «Аль-Хілаль», Сауд. Аравія (1979-81). Чэмпіён штата Р-д-Ж 1975, 1976 і 1977, чэмпіён Саудаўскай Аравіі 1980 і 1981, уладальнік Кубка гэтай краіны 1979. За зб. Бразіліі (1965-78) згуляў 92 гульні, забіў 26 галоў. Удзельнік ЧС 1974 (7-3), бронзавы прызёр ЧС 1978 (3-0). Адзін з найвыбітнейшых гульцоў у гісторыі бразільскага футбола. Лаўрэат Bola de Prata 1971. Майстар стандартных становішчаў. У 1974 забіў гол у браму «Амерыкі» на 4-й секундзе матча, што да 1995 было непераўзыйдзеным дасягненнем. Скончыў кар'еру пасля атрымання трохмесячнай дыскваліфікацыі за ўдар саперніка рукой у час адной з сустрэч чэмпіяната Саудаўскай Аравіі. У 90-я гады працаваў трэнерам ў Японіі («Сімідзу Палс»), заснаваў у Сан Паула 2 футбольныя школы, каментуе футбол для аднаго з найбуйнейшых бразільскіх тэлеканалаў «Бандэйрантэс».



**РЫДЛЕ Карл-Хайнц** (RIEDLE Karl-Heinz). ФРГ – Германія. 16.09.1965. Нападнік. **ЧС 1990 (4-0)**. «Аўгсбург» (1982-86), «Блау-Вайс», Берлін (1986-87, 34-10), «Вердэр» (1987-90, 86-38), «Лацыё», Іта. (1990-93, 84-30), «Барусія», Дортмунд (1993-97, 87-24), «Ліверпуль», Англ. (1997-99, 26-5), «Фулхэм», Англ., Д-2 (1999-2001, 35-6), «Вадуц», Ліхтэнштайн (2002). Уладальнік КЕЧ 1997. Чэмпіён ФРГ-Германіі 1988, 1995 і 1996. За зб. ФРГ-Германіі (1988-94) згуляў 42 гульні, забіў 16 га-

лоў. Бронзавы прызёр АГ 1988. Срэбны прызёр ЧЕ 1992, удзельнік ЧС 1994 (2-1). Герой фінала КЕЧ 1997, у якім забіў два з трох галоў свайго клуба ў браму «Ювентуса» (3-1). Вымушаны быў дачасна скончыць кар'еру з-за траўмы, атрыманай у час выступаў за «Ліверпуль».



**РЫКАРДА Раберта Барэта да РОЧА** (RICARDO Roberto Baretto da ROCHA). Бразілія. 11.09.1962. Абаронца. **ЧС 1994 (1-0)**. «Санта Амара», (1982), «Санта Крус» (1983-84), «Гуарані» (1985-88), «Сан Паула» (1988-91), «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1991-93), «Сантас» (1993), «Васка да Гама» (1994-95), «Флумінэнсэ» (1996), «Ньюэл'с Олд Бойс», Арг. (1996-97), «Фламенга» (1998-99). Чэмпіён Бразіліі 1991, чэмпіён штатаў Сан Паула (1989 і 1991) і Р-д-Ж (1994). За зб. Бразіліі (1987-94) згуляў 38 гульняў. Удзельнік ЧС 1990 (2-0). Удзельнік КА 1987, срэбны прызёр КА 1991. У 1989 быў уладальнікам Bola de Ouro. Лаўрэат Bola de Prata 1986, 1989, 1991 і 1993.



**РЫКАРДЗІНЬЁ – Рыкарда Луіс Поцці Радрыгес** (RICARDINHO – Ricardo Luis Pozzi Rodrigues). Бразілія. 23.05.1976. Паўабаронца. **ЧС 2002 (3-0)**. «Парана», Паранаэнсэ (1995-97, 29-1), «Бардо», Фра. (1997-98, 18-1), «Карынціянс» (1998-2001, 86-18), «Сан Паула» (2002-01.2004, 17-3), «Мідлсбро» (02.2004-04.2004), «Сантас» (05.2004-*, 72-20). Чэмпіён Бразіліі 1999 і 2004, уладальнік Кубка краіны 2002, чэмпіён штатаў Парана (1996 і 1997) і Сан Паула (2000 і 2001). За зб. Бразіліі (2000-2006) згуляў 21 гульню, забіў 1 гол. У апошні момант быў дазаяўлены на ЧС 2002 пасля траўмы ЭМЕРСАНА. Удзельнік ЧС 2006 (2-0). Уладальнік «Bola de Prata» 1996, 2000 і 2004.



**СЕА Хасэ Педра** (СЕА Jose Pedro). Уругвай. 01.09.1900 – 18.09.1970. Нападнік. **ЧС 1930 (4-5)**. «Атлетыка», Літа, «Насьяналь» (1925-30, 1934-35, 103-31). Чэмпіён Уругвая 1934. За зб. Уругвая (1923-1932) згуляў 26 гульняў, забіў 13 галоў. Уладальнік КА 1923 і 1924, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1924 і 1928. Адзін з найлепшых нападнікаў у гісторыі ўругвайскага футбола. Баск па паходжанні.



**СЕРАНТОНІ Пьетра** (SERANTONI Pietro). Італія. 11.12.1906 – 06.10.1964. Паўабаронца. **ЧС 1938 (4-0)**. «Амбразіяна-Інтэр» (1928-34, 150-55), «Ювентус» (1934-36, 35-7), «Рома» (1936-40, 73-7). Чэмпіён Італіі 1930, 1935. За зб. Італіі (1933-39) згуляў 17 гульняў. Акрамя перамогі на ЧС 1938, меў у актыве выступ у адборавым турніры да ЧС 1934, які таксама прынёс італьянцам перамогу. Працаваў трэнерам у «Падове» (1948-49, 1950-51), «Роме» (1950).



**СКАЛАРЫ Луіс Феліпэ** (SCOLARI Luis Felipe). Бразілія. 09.11.1948. Трэнер. **ЧС 2002**. Гуляў на пазіцыі цэнтральнага абаронцы за малавядомыя бразільскія клубы «Аймора», «Кайшас», «Нова Амбурга», «Жувентудэ», «Масэйё». Узначальваў «Масэйё» (1982), «Жувентудэ» (1983), «Бразіл» (1983), «Аль Шабаб», Саўд. Аравія (1984-85), «Пелотас» (1986), «Грэміё» (1987, 1993-96, чэмпіён краіны 1996, уладальнік Кубка краіны 1994 і КЛ 1995), «Гояс» (1988), «Аль-Кадзісія», Ку-

вейт (1988-90, 1992), зб. Кувейта (1990), «Крыцісіма» (1991, уладальнік Кубка Бразіліі 1991), «Аль-Ахлі», Катар (1992), «Джубіла Івата», Яп. (1997), «Палмейрас» (1998-2000, уладальнік Кубка Бразіліі 1998 і КЛ 1999), «Крузэйра» (2001), зб. Бразіліі (2001-2002, 25 гульняў), зб. Партугаліі (12.2002-*). Узначаліў зб. Бразіліі пасля шэрагу няўдалых выступаў каманды ў адборавым турніры да ЧС 2002. Пайшоў у адстаўку, нягледзячы на бліскучы выступ каманды на стадыёнах Паўднёвай Карэі і Японіі. Зрабіў зб. Партугаліі срэбным прызёрам ЧЕ 2004 і 4-й камандай свету на ЧС 2006. Найлепшы трэнер Паўднёвай Амерыкі 1999 і 2002 па версіі «Эль Паіс».



**СКАРОНЭ Эктар Педра** (SCARONE Hector Pedro). Уругвай. 26.11.1898 – 04.04.1967. Нападнік. **ЧС 1930 (3-1)**. «Спарцмен», Д-2 (1912-14), «Насьяналь» (1914-26, 1927-30, 1934-35, 1953, 369-301), «Барселона», Ісп. (1926-27, 9 гульняў), «Амбразіяна-Інтэр», Іта. (1931-32, 14-7), «Палерма», Іта. (1932-34, 54-13), «Уондэрэрс», Мантэвідэа (1935-37). Чэмпіён Уругвая 1915, 1916, 1917, 1919, 1920, 1922, 1923, 1924, 1934. У чэмпіянаце Уругвая згуляў 191 гульню, забіў 163 галы (трэці вынік у гісторыі). За зб. Уругвая (1917-1930) згуляў 51 гульню, забіў 31 гол. Уладальнік КА 1917, 1923 і 1924, срэбны прызёр КА 1919, і 1927, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1924 і 1928. Рэкардсмен па колькасці галоў за зб. Уругвая. Узначальваў «Рэал», Мадрыд, Ісп. (1951-52), «Насьяналь» (1953), зб. Уругвая. Зорка футбола 1920-х. У 1953 выходзіў на поле ў некалькіх матчах за «Насьяналь» як гуляючы трэнер — ва ўзросце 55 гадоў! Уваходзіў у трэнерскі штаб зб. Уругвая на ЧС 1962. Ягоны старэйшы брат Карлас СКАРОНЭ таксама гуляў за зб. Уругвая (1909-22, 25 гульняў, 18 галоў).



**СКЬЯВІЁ Анжэла** (SCHIAVIO Angelo). Італія. 15.10.1905 – 17.10.1990. Нападнік. **ЧС 1934 (4-4)**. «Фарцітуда», Балонья (1921-22), «Балонья» (1922-37, 312-242). Чэмпіён Італіі 1925, 1929, 1936, 1937. Найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 1932 (25). За зб. Італіі (1925-34) згуляў 21 гульню, забіў 15 галоў. Бронзавы прызёр АГ 1928. Адзін з найлепшых нападнікаў у гісторыі італьянскага футболу. Аўтар хет-трыка ў браму зб. Егіпта ў гульні за 3-е месца на АГ 1928 і хет-трыка ў браму зб. ЗША на ЧС 1934. У Серыі «А» забіў 242 галы ў 312 гульнях – трэці вынік пасля ПІЁЛЫ (290) і МЕАЦЦЫ (263). Быў адным з тр. зб. Італіі на ЧС 1954.



**СКЬЯФІНА Хуан Альберта** (SCHIAFFINO Juan Alberto). Уругвай. 28.07.1925 – 13.11.2002. Нападнік. **ЧС 1950 (4-3)**. «Пеньяроль» (1943-54, 227-88), «Мілан», Іта. (1954-60, 149-47), «Рома», Іта. (1960-62, 39-3). Чэмпіён Уругвая 1944, 1945, 1949, 1951, 1953 і 1954, уладальнік Кубка Уругвая 1943, 1946, 1947, 1949, 1951 і 1951. Найлепшы стралец чэмпіяната Уругвая 1945 (21). Чэмпіён Італіі 1955, 1957, 1959. Усяго ў Д-1 згуляў 415 гульняў, забіў 138 галоў. Уладальнік КК 1961. За зб. Уругвая (1945-1954) згуляў 22 гульні, забіў 12 галоў. Удзельнік ЧС 1954 (5-2). За зб. Італіі (1954-58) згуляў 4 гульні. Адзін з наймацнейшых уругвайскіх футбалістаў усіх часоў. У 1954 перайшоў у склад «Мілана» за 72 тыс. долараў – тагачасны рэкорд свету. Пасля сканчэння кар'еры вярнуўся ў Уругвай. У 1976 узначальваў «Пеньяроль». У двух гульнях кіраваў зб. Уругвая.



**СТАЙЛЗ Норберт (Нобі)** (STILES Norbert). Англія. 15.05.1942. Паўабаронца. **ЧС 1966 (6-0)**. «Манчэстэр Юнайтэд» (1960-70, 311-17), «Мідлсбро» (1970-72, 57-2), «Прэстан Норд Энд» (1972-74, 46-1). Уладальнік КЕЧ 1968, чэмпіён краіны 1965 і 1967, уладальнік Кубка краіны 1963. За зб. Англіі (1965-70) згуляў 28 гульняў, забіў 1 гол. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968. Запасны на ЧС 1970. Адзін з найлепшых гульцоў «залатой» каманды ўзору 1966, «працоўны конік» зборнай Англіі. Узначальваў «Ванкувер Уайткэпс», Канада (1981-84), быў мэнэджэрам «Вэст Бромвіч Альбіён» (1984-89), працаваў з юнацкімі камандамі «Манчэстэр Юнайтэд» (1989-93). Сярод яго выхаванцаў былі будучыя зоркі «МЮ» Раян Гігз, Нікі Бат і Гары Нэвіл.



**СУПІЧЫ Альберта** (SUPPICI Alberto). Уругвай. 20.11.1898 – 21.06.1981. Трэнер. **ЧС 1930**. Узначальваў зб. Уругвая на ЧС 1930 і АГ 1948. Першы трэнер – чэмпіён свету. Трэнер – чэмпіён свету ў 32 (!) гады. Чэмпіён Уругвая 1944 і 1945 у якасці трэнера «Пеньяроля». Імя Альберта СУПІЧЫ носіць адзін са стадыёнаў Мантэвідэа, а таксама стадыён у Кіта (Эквадор).



**ТАПІЯ Карлас Даніэль** (TAPIA Carlos Daniel). Аргентына. 20.08.1962. Паўабаронца. **ЧС 1986 (2-0)**. «Рывер Плэйт» (1980-84), «Бока Хуніёрс» (1985-89, 1991-93), «Дэпарціва Мандзію» (1990), «Універсідад Каталіка», Чылі. Чэмпіён Аргентыны 1980 (М), 1981 (Н) і 1992 (Н). За зб. Аргентыны (1986-88) згуляў 9 гульняў, забіў 1 гол. Удзельнік КА 1987.



**ТАРАНЦІНІ Альберта Сэзар** (TARANTINI Alberto Cesar). Аргентына. 03.12.1955. Абаронца. **ЧС 1978 (7-1)**. «Бока Хуніёрс» (1973-77, 164 гульні), «Бірмінгем Сіці», Англ. (1978-79, 23-1), «Тальерэс», Кардоба (1979-80), «Рывэр Плэйт» (1980-83), «Басція», Фра. (1983-84, 29-1), «Тулуза», Фра. (1984-88, 160-8), «Сэнт-Гален», Швайц. (1988-89). Уладальнік КЛ 1977. Чэмпіён Аргентыны 1976 і 1981. За зб. Аргентыны (1974-82) згуляў 61 гульню, забіў 1 гол. Удзельнік ЧС 1982 (4-0). Наймалодшы з пераможцаў ЧС 1978.



**ТАРДЭЛІ Марка** (TARDELLI Marco). Італія. 24.09.1954. Паўабаронца, абаронца. **ЧС 1982 (7-2)**. «Піза» (1972-74, 41-4), «Кома» (1974-75, 36-2), «Ювентус» (1975-85, 259-34), «Інтэр» (1985-87, 43-2), «Сэнт-Гален», Швайц. (1987-88). Уладальнік КЕЧ 1985, КУК 1984, Кубка УЕФА 1977, СК 1984, чэмпіён Італіі 1977, 1978, 1981, 1982, 1984, уладальнік Кубка Італіі 1979 і 1983. За зб. Італіі (1976-85) згуляў 81 гульню, забіў 6 галоў. Удзельнік ЧС 1978 (6-0) і ЧЕ 1980, запасны на ЧС 1986. Зорка італьянскага футболу, уладальнік шматлікіх футбольных трафеяў у складзе «Ювентуса». Пасля сканчэння кар'еры футбаліста праявіў сябе здольным трэнерам. Узначальваў юнацкія і моладзевую зб. Італіі, кіраваў зб. Італіі на АГ 2000. Працаваў з «Кома» (1993-95), «Чэзенай» (1997-97), «Інтэрам» (2000-2001), «Бары» (2002). З сакавіка да кастрычніка 2004 – гал. тр. зб. Егіпта.



**ТАСТАА – Эдуарда Ганкальвэс дэ АНДРАДЭ** (TOSTÃO – Eduardo Goncalves de ANDRADE). Бразілія. 25.01.1947. Нападнік. **ЧС 1970 (6-2)**. «Амерыка», Белу-Арызонці (1960-63), «Крузэйра» (1963-71, 375-248), «Васка да Гама» (1972-73). Уладальнік Кубка Бразіліі 1966, чэмпіён штата Мінас Жэраіс 1965, 1966, 1967, 1968, 1969, найлепшы стралец чэмпіянатаў штата 1966 (18), 1967 (20) і 1968 (20). За зб. Бразіліі (1966-72) згуляў 54 гульні, забіў 32 галы. Удзельнік ЧС 1966 (1-1). Зорка бразільскага футболу. Меў мянушку «Белая пярліна». Найлепшы футбаліст Паўднёвай Амерыкі 1971 па версіі венесуэльскай газеты «Эль Мунда», лаўрэат Bola de Prata 1970. Наймалодшы гулец і аўтар гола на ЧС 1966. Найлепшы стралец «Крузэйра» за ўсю гісторыю клуба. З-за траўмы вока дачасна скончыў кар'еру. Працаваў доктарам-акулістам.



**ТАФАРЭЛ Клаўдзіё Андрэ Моргэн** (TAFFAREL Claudio Andre Morgen). Бразілія. 08.05.1968. Брамнік. **ЧС 1994 (7/-3)**. «Інтэрнасьёналь» (1984-90, 50 гульняў), «Парма», Іта. (1990-93, 2001-2003, 79 гульняў), «Рэджана», Іта. (1993-94, 31 гульня), «Атлетыка Мінэйра» (1994-98, 73 гульні), «Галатасарай», Тур. (1998-2001, 82 гульні). Уладальнік КУК 1993, Кубка УЕФА 2000. Уладальнік Кубка Італіі 1992, чэмпіён і ўладальнік Кубка Турцыі 1999 і 2000. За зб. Бразіліі (1987-98) згуляў 101 гульню. Срэбны прызёр АГ 1988, пераможца КА 1989 і 1997, срэбны прызёр КА 1991, удзельнік КА 1993. Удзельнік ЧС 1990 (4/-2), срэбны прызёр ЧС 1998 (7/-10). Адзін з найлепшых брамнікаў у гісторыі бразільскага футбола. Уладальнік Bola de Ouro 1988 і Bola de Prata 1987 і 1988.



**ТОН Олаф** (THON Olaf). ФРГ — Германія. 01.05.1966. Абаронца, паўабаронца. **ЧС 1990 (2-0)**. «Бэкхаўзэн-05» (1974-76), «Хорст-Эмшэр» (1976-80), «Шальке-04» (1980-88, 1994-2002, 333-66), «Баварыя» (1988-94, 148-30). Уладальнік Кубка УЕФА 1997. Чэмпіён Германіі 1989, 1990, 1994, уладальнік Кубка Германіі 2001 і 2002. За зб. ФРГ-Германіі (1984-98) згуляў 52 гульні, забіў 3 галы. Удзельнік ЧС 1998 (3-0), запасны на ЧС 1986, паўфіналіст ЧЕ 1988. У бундэслізе згуляў 443 гульні.



**ТОНІ Лука** (TONI Luca). Італія. 26.05.1977. Нападнік. **ЧС 2006 (6-2).** «Мадэна», Д-3 (1994-96, 32-7), «Эмпалі», Д-2 (1996-97, 3-1), «Фіярэнцуола», Д-3 (1997-98, 26-2), «Ладзіджані», Д-3 (1998-99, 31-5), «Трэвіза», Д-2 (1999-2000, 35-15), «Вічэнца» (2000-2001, 31-9), «Брэшыя» (2001-03, 44-15), «Палерма» (2004-05, 35-20), «Фіярэнціна» (2005-*, 38-31). Лепшы стралец чэмпіяната Італіі 2006 (31). Першы пасля 1959 г. гулец, які змог забіць больш 30 галоў за адзін сезон у Серыі «А». За зб. Італіі (2004-2006) згуляў 24 гульні, забіў 9 галоў.



**ТОЦІ Франчэска** (TOTTI Francesco). Італія. 27.09.1976. Паўабаронца. **ЧС 2006 (7-1).** «Рома» (1992-*, 334-125). Чэмпіён Італіі 2001, уладальнік Суперкубка Італіі 2001. За зб. Італіі (1998-2006) згуляў 58 гульняў, забіў 9 галоў. Удзельнік ЧС 2002 (4-0), срэбны прызёр ЧЕ 2002, удзельнік ЧЕ

2004. Адзін з самых яркіх італьянскіх гульцоў на мяжы стагоддзяў, лідэр «Ромы». Лепшы футбаліст краіны 1998 і 2000. Пасля першай гульні на ЧЕ 2004 быў дысквалiфікаваны за тое, што плюнуў у футбаліста зб. Даніі. Аўтар пераможнага гола (з пенальці), забітага на апошняй секундзе 1/8 фінала ЧС 2006 у браму зб. Аўстраліі.



**ТРАБІЯНІ Марсэла Антоніё** (TROBBIANI Marcelo Antonio). Аргентына. 17.02.1955. Паўабаронца. **ЧС 1986 (1-0)**. «Бока Хуніёрс» (1973-76, 1981-82), «Эльчэ», Ісп. (1976-80, 1986-87), «Рэал», Сарагоса, Ісп. (1980-81), «Эстудзіянтэс», Ла Плата (1982-84, 1987), «Мільёнарыс», Калумб. (1985-86), «Кабрэлоа», Чылі (1988-89), «Барселона», Экв. (1990-91), «Тальерэс», Кардоба (1993). Уладальнік КЛ 1977. Чэмпіён Аргентыны 1976, 1981, 1982, 1983, чэмпіён Чылі 1988 і Эквадора 1990. За зб. Аргентыны (1973-86) згуляў 26 гульняў, забіў 1 гол. Атрымаў залаты медаль ЧС 1986 за 93 секунды гульні ў фінальным матчы супраць немцаў. Скончыў кар'еру гульца ў 38 гадоў. Узначальваў «Барселону», Экв., «Універсітарыё», Перу (2004).



**ТРЭЗЭГЕ Давід** (TREZEGUET David). Францыя. 15.10.1977. Нападнік. **ЧС 1998 (6-1)**. «Платэнсэ», Арг. (1993-94, 5-0), «Манако» (1995-2000, 93-52), «Ювентус», Іта. (2000-*, 151-95). Чэмпіён Францыі 1997 і 2000, Італіі 2002, 2003, 2005 і 2006, уладальнік Суперкубка Францыі 1997, найлепшы стралец чэмпіяната Італіі 2002 (24). За Зб. Францыі (1998-2006) згуляў 66 гульняў, забіў 32 галы. Чэмпіён Еўропы 2000. Срэбны прызёр ЧС 2006 (3-0), удзельнік ЧС 2002 (3-0). Француз аргентынскага паходжання. Аўтар «залатога» гола ў фінале ЧЕ 2000. Удзельнік ЧЕ 2004. Наймалодшы чэмпіён свету 1998. Не меў трэнерскага даверу на ЧС 2006, згуляў там усяго 112 хв. Незабіты пенальці ў фінале з італьянцамі каштаваў французам золата турніра.



**ТУРЭК Антон (Тоні)** (TUREK Anton (Toni). ФРГ. 18.01.1919 – 11.05.1984. Брамнік. **ЧС 1954 (5/-6)**. «Дуйсбург 1900» (1929-36), «Дуйсбург» (1936-41, 1943-46), «Ульм» (1941-43, 1947-50), «Айнтрахт» Ф-н-М. (1946-47), «Фартуна», Дзюсельдорф (1950-56, 113 гульняў), «Барусія», Мёнхенгладбах (1956-57, 4 гульні). За зб. ФРГ (1950-54) згуляў 20 гульняў. Легендарная постаць нямецкага футболу, герой ЧС 1954, найстарэйшы брамнік турніру. Узначальваў «Бютген» і «Рацінген 04». У час Другой сусветнай вайны быў сувязныммататацыклістам, быў паранены.



**ТЭХЕРА Дамінга** (TEJERA Domingo). Уругвай. 22.07.1899 – 30.06.1969. Абаронца. **ЧС 1930 (1-0)**. «Уондэрэрс». Чэмпіён Уругвая 1931. За зб. Уругвая (1922-30) згуляў 17 гульняў. Запасны на АГ 1924. Срэбны прызёр КА 1927.



**ТЭХЕРА Эусэбіё Рамон** (TEJERA Eusebio Ramon). Уругвай. 06.01.1922 – 09.11.2002. Абаронца. **ЧС 1950 (4-0)**. «Белья Віста», «Рывер Плэйт», «Насьяналь» (1945-50, 155-1). Чэмпіён краіны 1946, 1947, 1950. За зб. Уругвая (1945-1954) згуляў 35 гульняў. Бронзавы прызёр КА 1947, удзельнік КА 1945 і 1946. Запасны на ЧС 1954.



**УІЛСАН Рэйман** (WILSON Ramon). Англія. 17.12.1934. Абаронца. **ЧС 1966 (6-0)**. «Хадэрсфілд» (1955-63, 266-6), «Эвертан» (1963-68, 116-0), «Олдхэм Атлетык» (1968-69, 25-0), «Брэдфард Сіці» (1969-70, 2-0). Уладальнік Кубка Англіі 1966. За зб. Англіі (1959-68) згуляў 63 гульні. Удзельнік ЧС 1962 (4-0), КЕ 1964. Бронзавы прызёр ЧЕ 1968. «Жалезны» гулец асноўнага складу зб. Англіі 1960-х гадоў.



**УРДЗІНАРАН Сантас** (URDINARAN Santos). Уругвай. 30.03.1900 – 14.07.1979. Нападнік. **ЧС 1930 (1-0)**. «Насьяналь» (1919-33, 318-124). Чэмпіён Уругвая 1919, 1920, 1922, 1923 і 1924. За зб. Уругвая (1923-30) згуляў 20 гульняў, забіў 2 галы. Уладальнік КА 1924 і 1926. Чэмпіён АГ 1924 і 1928. Ягоны брат Антоніё Урдзінаран таксама гуляў за зб. Уругвая.



**ФАНТАНА – Жазэ дэ Анчэта ФАНТАНА** (FONTANA – Jose de Ancheta FONTANA). Бразілія. 31.12.1940 – 09.09.1980. Абаронца. **ЧС 1970 (2-0)**. «Віторыя», «Рыё Бранка», «Васка да Гама» (1962-69), «Крузэйра» (1969-72). Чэмпіён штатаў Р-д-Ж (1968) і Мінас Жэраіс (1969 і 1972). За зб. Бразіліі (1966-70) згуляў 8 гульняў.



**ФЁЛЕР Рудольф (Рудзі)** (VÖLLER Rudolf (Rudi). ФРГ – Германія. 13.04.1960. Нападнік, трэнер. **ЧС 1990 (6-3)**. «Кікерс», Офэнбах, Д-ІІ (1976-80, 74-19), «Мюнхен 1860», (1980-82, 70-46) «Вердэр» (1982-87, 137-97), «Рома», Іта. (1987-92, 132-45), «Алімпік», Марсэль, Фра. (1992-94, 61-24), «Баер», Леверкузэн (1994-96, 62-26). Уладальнік КЕЧ 1993. Чэмпіён Францыі 1993, уладальнік Кубка Італіі 1991, найлепшы стралец бундэслігі 1983 (23). За зб. ФРГ (1982-1994) згуляў 90 гульняў, забіў 47 галы. Удзельнік ЧЕ 1984 і 1988, срэбны прызёр ЧС 1986 (6-2) і ЧЕ 1992. Удзельнік ЧС 1994 (3-2). Адзін з найлепшых нямецкіх нападнікаў усіх часоў. У наймацнейшых лігах ФРГ-Германіі, Італіі і Францыі забіў адпаведна 132, 45 і 24 галы. Найлепшы футбаліст краіны 1983. Разам з КЛІНСМАНАМ мае другі вынік па колькасці галоў за зб. Германіі. Бліскуча распачаў трэнерскую кар'еру: прыняўшы ў 2000 г. зб. Германіі пасля правальнага для каманды ЧЕ 2000 здолеў вывесці яе ў фінальную частку ЧС 2002 і дайсці да фінала турніра. Пайшоў у адстаўку пасля няўдалага выступу немцаў на ЧЕ 2004. Пасля гэтага ўзначаліў італьянскую «Рому», але прабыў на гэтай пасадзе толькі 25 дзён і зноў падаў у адстаўку з-за няўдалай гульні сваёй новай каманды. Спартыўны дырэктар «Баера», Леверкузэн з восені 2004. У восень 2005 часова ўзначальваў каманду пасля адстаўкі АЎГЕНТАЛЕРА.



**ФЕЛІКС – ВЕНЭРАНДА Фелікс Міелі** (FELIX – VENERANDO Felix Mielli). Бразілія. 24.12.1937. Брамнік. **ЧС 1970 (6/-7)**. «Жувентус» (1951-54), «Партугеза» (1955-68), «Флумінэнсэ» (1968-77). Чэмпіён штата Р-д-Ж 1969, 1971, 1973, 1975 і 1976. За зб. Бразіліі (1965-72) згуляў 38 гульняў.



**ФЕОЛА Вісэнтэ Італа** (FEOLA Vicente Italo). Бразілія. 01.11.1909–06.11.1975. Трэнер. **ЧС 1958**. Выступаў за «Палмейрас» і «Амерыкана», Сан Паула. Трэнер «Сірыё Лібаньес» (1935-37), «Сан Паула» (1937-38, 1939, 1941-42, 1947-50, 1955-56, 1959), «Бока Хуніёрс», Арг. (чэмпіён краіны 1962). Асыстэнт трэнера зб. Бразіліі на ЧС 1950. Трэнер зб. Бразіліі (1955-58, 1960, 1961-62, 1965-66 – 64 гульні, 46 перамогаў, 12 нічыіх, 6 паразаў), удзельнік ЧС 1966. З-за хваробы прапусціў пераможны для бразільцаў ЧС 1962. Пасля няўдалага выступу на ЧС 1966 вымушаны быў пакінуць краіну (працаваў у Чылі) – такім вялікім было расчараванне бразільцаў у нядаўнім сваім куміры. Пазней, аднак, радзіма ўспомніла свайго героя – адной з вуліцаў Сан Паула было нададзена імя ФЕОЛЫ.



**ФЕРАРЫ Джавані** (FERRARI Giovani). Італія. 06.12.1907 – 02.12.1982. Нападнік, трэнер. **ЧС 1934 (4-2), ЧС 1938 (4-0)**. «Інтэрнаплес», «Алесандрыя» (1920-30), «Ювентус» (1930-35, 160-67), «Амбразіяна-Інтэр» (1935-40), «Балонья» (1940-41). Васьміразовы чэмпіён Італіі ў складзе трох розных клубаў 1931, 1932, 1933, 1934, 1935, 1938, 1940, 1941. За зб. Італіі (1930-38) згуляў 44 гульні, забіў 14 галоў. У Серыі «А» забіў 179 галоў у 439 гульнях. Адзін з трэнераў зб. Італіі на ЧС 1962.



**ФЕРАРЫС Аціліё** (FERRARIS Attilio, FERRARIS IV). Італія. 26.03.1904 – 08.05.1947. Паўабаронца. **ЧС 1934 (3-0)**. «Рома» (1927-34, 210-2), «Лацыё» (1934-39), «Катанья» (1939-40, 15-0). У Серыі «А» згуляў 339 гульняў, забіў 5 галоў. За зб. Італіі (1926-35) згуляў 28 гульняў. Запасны на АГ 1928. На працягу 10 гадоў быў адным з асноўных гульцоў зб. Італіі. Меў мянушку «Вялікі курэц італьянскага футбола» – выпальваў за дзень не менш 40 цыгарэт.



**ФЕРАРЫС Пьетра** (FERRARIS Pietro, FERRARIS II). Італія. 15.02.1912 – 1991. Нападнік. **ЧС 1938 (1-1)**. «Про Верчэлі» (1929-32, 85-20), «Напалі» (1932-35, 83-12), «Амбразіяна-Інтэр» (1935-41, 139-43), «Тарына» (1941-43, 1945-48, 142-38), «Навара» (1948-50, 57-19). Чэмпіён Італіі 1940, 1941, 1943, 1946, 1947, 1948, уладальнік Кубка Італіі 1939. За зб. Італіі (1935-47) згуляў 14 гульняў, забіў 3 галы. Адзін з найлепшых італьянскіх стральцоў 1930–40-х гадоў: у 506 гульнях Серыі «А» забіў 136 галоў.



**ФЕРНАНДЭС Ларэнса** (FERNANDEZ Lorenco). Уругвай. 20.05.1900–16.11.1973. Паўабаронца. **ЧС 1930 (4-0)**. «Капура», «Пеньяроль». Чэмпіён Уругвая 1926, 1928, 1929, 1932, 1935, 1936. За зб. Уругвая (1925-1935) згуляў 31 гульню, забіў 4 галы. Уладальнік КА 1926 і 1935, срэбны прызёр КА 1927, бронзавы прызёр КА 1929. Чэмпіён АГ 1928.



**ФІЛЬЁЛ Убальда Мацільда** (FILLOL Ubaldo Matildo). Аргентына. 21.07.1950. Брамнік. **ЧС 1978 (7/-4)**. «Кільмэс», Б-А. (1967-71, 57 гульняў), «Рэсінг» (1972-73, 1987-89, 149 гульняў), «Рывэр Плэйт» (1973-83, 405 гульняў), «Архенцінас Хуніёрс»

(1983, 17 гульняў), «Фламенга», Бра. (1984-85), «Атлетыка», Мадрыд, Ісп. (1985-86), «Велес Сарсфілд» (1989-90, 43 гульні). Усяго ў розных лігах згуляў 636 гульняў, прапусціў 638 галоў. Чэмпіён Аргентыны 1975 (М), 1975 (Н), 1977 (М), 1979 (Н), 1980 (М) і 1981 (Н). За зб. Аргентыны (1974-85) згуляў 58 гульняў, прапусціў 52 галы. Удзельнік ЧС 1974 (1/-1) і ЧС 1982 (5/-7), запасны на ЧС 1986. Удзельнік КА 1983. Найлепшы футбаліст краіны 1977 па версіі спартыўных журналістаў. Найлепшы брамнік у гісторыі аргентынскага футболу. У чэмпіянаце Аргентыны адбіў 26 пенальці. Працаваў трэнерам брамнікаў «Рэсінга», Б-А., «Банфілда» і зб. Аргентыны (1999-2003), затым – спартыўным дырэктарам клуба «Рэсінг Авельянэда» (2003).



**ФЛОЭ Хайнц** (FLOHE Heinz). ФРГ. 28.01.1948. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1974 (3-0)**. «Ойскірхэн», «Кёльн» (1966-79), «Мюнхен-1960» (1979-80). Чэмпіён ФРГ 1978, уладальнік Кубка ФРГ 1968, 1977 і 1978. За зб. ФРГ (1970-78) згуляў 39 гульняў, забіў 8 галоў. Чэмпіён Еўропы 1972, срэбны прызёр ЧЕ 1976, удзельнік ЧС 1978 (4-2). У бундэслізе згуляў 343 гульні, забіў 81 гол.



**ФОГТС Ханс-Хуберт** (VOGTS Hans-Hubert). ФРГ — Германія. 30.12.1946. Абаронца, трэнер. **ЧС 1974 (7-0)**. «Бютген» (1960-65), «Барусія», Мёнхенгладбах (1965-79, 419-32). Уладальнік Кубка УЕФА 1975 і 1979, чэмпіён ФРГ 1970, 1971, 1975, 1976 і 1977, уладальнік Кубка ФРГ 1973. За зб. ФРГ (1967-78) згуляў 96 гульняў, забіў 1 гол. Бронзавы прызёр ЧС 1970 (6-0). Срэбны прызёр ЧЕ 1976, удзельнік ЧС 1978 (6-0). Узначальваў моладзевую зб. ФРГ (1979-90), зб. Германіі (1990-98). Пад яго кіраўніцтвам немцы сталі чэмпіёнамі Еўропы 1996 і срэбнымі прызёрамі ЧЕ 1992, бралі ўдзел у ЧС 1994 і 1998. Затым дапамагаў кіраваць «Барусіяй» з Мёнхенгладбаха (1999) і ўзначальваў «Баер» з Леверкузэна (11.2000-05.2001). У 2002-2004 – галоўны трэнер зб. Шатландыі.



**ФОНІ Альфрэда** (FONI Alfredo). Італія. 20.01.1911 – 28.01.1985. Абаронца, трэнер. **ЧС 1938 (3-0)**. «Лацыё», Рым (1929-31), «Падова» (1931-34), «Ювентус» (1934-43, 1945-47, 266-5). Чэмпіён Італіі 1935. Уладальнік Кубка Італіі 1938 і 1942. За зб. Італіі (1936-42) згуляў 23 гульні. Чэмпіён АГ 1936 (капітан каманды). Зрабіў удалую трэнерскую кар'еру: «Венецыя», «Кьяса», Швайц. (1948-49, 1961), «Інтэр» (1952-55, чэмпіён краіны 1953, 1954), зб. Італіі (1955-58), «Балонья» (1958-59), «Рома» (1959-61, уладальнік КК 1961), «Удзінэзэ» (1961-62), зб. Швайцарыі (1964-67, удзельнік ЧС 1966).



**ХАНТ Роджэр** (HUNT Roger). Англія. 20.07.1938. Нападнік. **ЧС 1966 (6-3)**. «Колдборн» (1948-55), «Стоктан» (1955-58), «Ліверпуль» (1958-69, 404-245), «Болтан Уондэрэрс» (1969-72, 76-24). Чэмпіён Англіі 1964, 1966, уладальнік Кубка Англіі 1965. Найлепшы стралец чэмпіяната Англіі 1966 (30). За зб. Англіі (1961-69) згуляў 34 гульні, забіў 18 галоў. Запасны на ЧС 1962, бронзавы прызёр ЧЕ 1968. Адзін з найлепшых нападнікаў Англіі 1960-х гадоў. У чэмпіянаце краіны забіў 246 галоў. У складзе «Ліверпуля» у 489 афіцыйных гульнях забіў 285 галоў (другі вынік пасля Раша).



**ХАЎСМАН Рэнэ Арланда** (HOUSEMAN Rene Orlando). Аргентына. 19.07.1953. Нападнік. **ЧС 1978 (6-1)**. «Дэфэнсар», Бэльграна (1969-72, 1982), «Уракан», Б-А. (1973-80, 1981-82, 295-114), «Рывер Плэйт» (1981), «Кола Кола», Чылі (1982), «АмаЗулу», ПАР (1983), «Індэпэндзьентэ» (1984), «Экскурсьёністас» (1985). Чэмпіён Аргентыны 1973 (М). За зб. Аргентыны (1973-79) згуляў 55 гульняў, забіў 13 галоў. Удзельнік ЧС 1974 (6-3). Пасля сканчэння кар'еры пэўны час цярпеў ад алкагалізму.



**ХЁЛЬЦЭНБАЙН Бернд** (HÖLZENBEIN Bernd). ФРГ. 09.03.1946. Нападнік, паўабаронца. **ЧС 1974 (6-0)**. «ТуС», Дэрн (1963-66), «Айнтрахт», Ф-н-М. (1966-81, 420-160), «Форт Лаудэрдэйл Страйкерс», ЗША (1981-82, 55-14). Уладальнік Кубка УЕФА 1980, Кубка ФРГ 1974, 1975 і 1981. За зб. ФРГ (1974-78) згуляў 37 гульняў, забіў 5 галоў. Срэбны прызёр ЧЕ 1976, удзельнік ЧС 1978 (3-1). У складзе «Айнтрахта» згуляў 512 афіцыйных гульняў, забіў 201 гол (у бундэслізе – 420-160). Працаваў віцэ-прэзідэнтам (1988-93) і мэнэджэрам (1994-96) «Айнтрахта».



**ХЁНЭС Ульрых** (HOENESS Ulrich). ФРГ. 05.01.1952. Нападнік. **ЧС 1974 (7-1)**. «Ульм» (1966-70), «Баварыя» (1970-78, 239-86), «Нюрнберг» (1978-79, 11-0). Уладальнік КЕЧ 1974, 1975 і 1976, МК 1976. Чэмпіён ФРГ 1972, 1973 і 1974, уладальнік Кубка ФРГ 1971. За зб. ФРГ (1972-76) згуляў 35 гульняў, забіў 5 галоў. Удзельнік АГ 1972, чэмпіён Еўропы 1972, срэбны прызёр ЧЕ 1976. У бундэслізе згуляў 250 гульняў, забіў 86 галоў. Мэнэджэр «Баварыі» (1979-2002), віцэ-прэзыдэнт клуба (2002-2006). Брат Дзітэра Хёнэса, які таксама гуляў за зб. ФРГ (быў срэбным прызёрам ЧС 1986).



**ХЕРМАН Рыхард Франц** (HERMANN Richard Franz). ФРГ. 28.01.1923 – 27.07.1962. Нападнік. **ЧС 1954 (1-1)**. «Дэмб», Катавіцэ, Пол., ФК «Катавіцэ», Пол. (1934-45), «Франкфуртэр» (1947-60, 320-100). За зб. ФРГ (1950-54) згуляў 8 гульняў, забіў 1 гол. Нарадзіўся ў Польшчы. У 1939 г. з'ехаў у Германію, дзе пасля вайны стаў гульцом нацыянальнай зб. ФРГ. У час вайны трапіў у палон, быў вызвалены ў 1947.



